БАРЫС ПЯТРОВІЧ

Ідзі адзін,

альбо Студзень жыцця

Мінск
"Кнігазбор"
2019

УДК 821.161.1-3
ББК 84(4Беи)
П99

Пятровіч, Б.
П99 Ідзі адзін, альбо Студзень жыцця / Барыс Пятровіч. – Мінск : Кнігазбор, 2019. – 96 с.

ISBN 978-985-7207-59-6.

Гэтая незвычайная кніга складаецца з запісаў, зробленых у далёкім студзені 1993 года, калі аўтар раптам вырашыў весці дзённік, а таксама штодзень пісаць кароткую прозу ў прыдуманых ім «жанрах». У выніку атрымаўся адзін месяц жыцця, асветлены з розных бакоў, – асабістага, грамадскага, творчага... Другой «дзейнай асобай» гэтай кнігі з'яўляецца маладая дзяржава Беларусь, якой яна была ў студзені 1993 года. Такім чынам, чытачам прапануецца ўсяго адзін месяц з жыцця чалавека і краіны, якіх ужо няма. Бо час змяніў іх незваротна.

УДК 821.161.1-3
ББК 84(4Беи)

ISBN 978-985-7207-59-6

Адзін месяц жыцця 1993 года

Замест прадмовы

...Так, гэта быў 1993 год. Мне 33 гады. Узрост, калі хочаш не хочаш, а падумаеш: вось і ўсё... Жыццё пражыта. Вучэнне не створана. Вучняў няма.

Адчай несусветны.

Хтосьці да такіх гадоў увогуле не дажыў. Засіліўся. Застрэліўся. Загінуў, словам... Але яны пакінулі напамін пра сябе. Метку. Спадчыну... Здалелі. Засталіся... І мы памятаем пра іх, ведаем, а то і вывучаем. У школе. Ва ўніверсітэце. А значыць – не дарэмна...

А тут – беспрасветнасць. Поўная. І ўсе мары ідуць у пясок. У тупую, абрыдлую, бясплённую працу, дзеля таго самага кавалка хлеба штодзённага... І толькі.

Як жыць далей? Як?!

А жыць трэба. Калі не дзеля сябе, дык дзеля таго, каго (так бяздумна, неабачліва!) на свет гэты пусціў.

Трэба жыць. Сам загнаў сябе ў кут. Але хочацца, каб таксама не марна. Бо была ж яшчэ мара... Жыць, каб выканаць тую місію, дзеля якой (магчыма, дужа няпэўна, сумнеўна бясконца, але ўсё ж – магчыма) і ты з'явіўся на гэтым свеце і пакінуты тут... пасля ўсіх хваробаў і вяртанняў адтуль, адкуль звычайна не вяртаюцца.

Менавіта тады, у бальнічным ложку, я і зразумеў, што адзін на гэтым свеце і мне няма на каго спадзявацца, апроч самога сябе. Тады і з'явіўся той жыццёвы дэвіз: "Ідзі адзін!" Без сумненняў і надзей – так будзе лягчэй...

На жаль, на доўгі час я пра яго "забыўся".

“Ідзі адзін!” Ні на каго не азірайся. Бо ніхто за цябе прызначанае табе не зробіць... Значыць, каб не губляць час, трэба, нягледзячы ні на што, кожны дзень працаваць. Над сабой. Над сваім. Над тым, што, магчыма, застанецца. Нават калі яно не застанецца. А проста будзе.

Значыць – ні дня без радка, як запаветавалі класікі. Пісаць насуперак усяму. Найперш самому сабе. Іншага не дадзена.

І новае жыццё пачаць з Новага года. Калі ж яшчэ пачынаць, як не з новых першых дзён?..

Так нарадзілася ідэя гэтых запісаў, так з’явіліся яны. Было тое цэлую вечнасць таму – роўна 25 гадоў назад.

А былі то гады не дужа спрыяльныя для ўласна пісання. Час і мазгі з’ядала праца. У газеце. Каб набраць разгон, надумаў я кожны дзень рабіць запіс у дзённіку (роўна адну старонку). А таксама пісаць нешта для сябе з тых кароткіх “жанраў”, якія ўжо акрэсліліся: “мроі” (тут – “версіі”), “піліпікі” і “апофрыкі”.

Пісаць кожны вечар. У любым стане. Але прынцыпова – кожны-кожненькі. Рабіць мінімум па адным запісе ва ўсіх “жанрах”. Абавязкова. А калі атрымаецца, то і больш. Заўважце, пісаць тым правапісам, які праз нейкі час атрымае назоў “дзеясловіца”...

Пратрымаўся крыху больш за месяц. Далей не змог. Прымус – не лепшы стымул для “творчасці”. Але напісанае засталося. Рукапісы не гараць, як пісаў іншы класік. І не тонуць, дадаў некалі ў працяг яму я сам...

Напісанае засталося (не згарэла і не патанула) і... праляжала ў тэчцы больш за два дзясяткі гадоў. Сёе-тое выцягвалася і друкавалася. “Мроі” (даволі шмат). “Піліпікі” (таксама). І зусім не чапаліся “апофрыкі”.

Бо – да апошняга сумняваўся (сумняваюся і цяпер), ці варта іх публікаваць увогуле? У сэнсе – паказваць людзям. Кажу пра “апофрыкі” (зразумела, тут проста былі перакінутыя

літары ў вядомым слоўцы: апо*к*ры*ф*ы – апо*ф*ры*к*і). Бо шмат для каго выглядала б гэта ў тыя часы (ды, пэўна ж, выглядае і цяпер) не менш як блюзнерствам. Здзекам з гіпервядомых і суперпаважаных асобаў. Вялікіх беларусаў.

Смех лечыць. Чалавецтва са смехам развітваецца са сваім мінулым – падказваюць класікі гэтыя ды іншыя апраўданні. Але я разумею: няма мне апраўдання...

Чаму раптам тады, у далёкім 1993-м, я ўзяўся пісаць гэтыя дзіўныя “апофрыкі”? Дужа мне спадабаліся “анегдоты” Хармса пра расейскіх пісьменнікаў XIX стагоддзя – Пушкіна, Гогаля, Талстога, Тургенева... І захацелася нейкім чынам перанесці “анегдоты” на беларускую глебу. Хоць бы такім чынам.

Тады так і не адважыўся. Паказаць. Друкаваць. А цяпер вось, бачыце, рашыўся. Чаму? Бо мяне таго, трыццацітрохгадовага, даўно няма. Ад яго (у сэнсе мяне) засталіся (бачыце – засталіся) толькі тыя паасобныя аркушыкі з літаркамі.

Зрэшты, запярэчу сабе: ідэя надрукаваць некалі ўсё так, як пісалася, акрэслілася яшчэ 23 студзеня таго, 1993-га, года (пра што ёсць адпаведны запіс у дзённіку). Але – то ідэя. Наіўная, няшкодная. І, здавалася, невыканальная. Бо “страшно далеки они от народа”, – сказаў некалі Ленін пра мае “мроі” (запіс ад 28 студзеня).

Па праўдзе сказаць, я забыў пра тыя запісы. Але колькі гадоў таму, пераязджаючы на іншую кватэру, натыкнуўся на іх. З лёгкім сумам перабраў-перагледзеў, і з таго часу не даюць яны мне спакою.

Не адпускае думка: а чаму б і сапраўды не надрукаваць іх так, як пісалася некалі? Без правак, без зменаў. Атрымаецца роўна адзін месяц 1993 года з майго жыцця, асветлены з усіх бакоў: асабістага, творчага... грамадскага.

Бо, варта сказаць, у той час я працаваў у “ЛіМе” і штотыдзень вёў прыдуманую сабе, каб мазгі канчаткова не засохлі, рубрыку “Кола Дзён”, у якой згадваліся самыя значныя падзеі, што адбываліся ў нашай зусім маладой яшчэ краіне. Чаму б і іх не дадаць?

І вось той студзень жыцця перад вамі. Парадак такі: спачатку ідуць дзённікавыя запісы. Пасля іх – “Коладзёнаўскія”. Далей – “мроі” (“версіі”), “піліпікі” і “апофрыкі”. У такім парадку, як некалі пісалася.

Я не паправіў тут ні слова. Хоць, прызнаюся, дужа карцела гэта зрабіць. Пакінуў усё так, як пісалася тады. Для мяне тыя тэксты і запісы, зробленыя 25 гадоў таму, ужо дакумент, які не стане ні лепшым, ні горшым. Не зважаючы на тое, што я, цяперашні, шмат з чым не пагаджаюся, бачу, дзе і ў кім памыляўся, а дзе быў празмерна шчырым... Але няхай яны застаюцца такімі, якімі былі, і я ў іх такім, якім быў.

...А чытаць можна як дзень за днём, так і паасобку. Спачатку дзённік: увесь ад 1 да 31 студзеня. Потым толькі “Кола Дзён” дзень за днём. Затым усе “мроі” (“версіі”) адну за адной. Далей “піліпікі”. І, нарэшце, “апофрыкі”...

Ці наадварот: спачатку “апофрыкі”, потым “піліпікі”...

Ці ўвогуле адвольна, уроскід, пачынаючы з любой старонкі.

А можна і не чытаць зусім: вольным – воля.

31 студзеня 2018 года.

„1” студзеня 1993 г.

Трэба не было мне захварэць якраз у навагоднюю ноч. Адрубіўся недзе ў 22 гадзіны, а прачнуўся у сябе толькі пад раніцу. Што гэта было – мо нейкі знак мне – не ведаю. Адно цікава: сапсаваў свята сваёй хваробай Ануйкіным і Белецкім, з якімі меліся сустракаць Новы год разам. Яны, і жонка з імі, сядзелі за сталом, а мяне трэсла ў ложку. Так для мяне скончыўся ~~[illegible]~~ той год і пачаўся новы.

Ад сёння збіраюся штодзень занатоўваць у гэты дзённічак хаць пару словаў. Не ведаю ці хопіць мяне хоць, але паспрабую.

Першы дзень году заканчваецца, а я толькі пад канец яго стаў адчуваць сябе чалавекам. Вярнуліся пачуцці, праясвятлела галава. Ноч, ранак і дзень хваробы трымалі мяне ў сваіх брудных абдымках і ~~[illegible]~~ зараз усё здаецца, што было, як праз закураное шкло разглядваю: твары расплываюцца, час размываецца, словам, першы дзень году практычна страчаны для мяне з-за нечаканай хваробы. Кажуць, як праводзіш першы дзень – так правядзеш увесь год. Не дай Бог!

1 студзеня

Трэба ж было мне захварэць якраз у навагоднюю ноч. Адкінула недзе ў 22 гадзіны, а прыйшоў у сябе толькі пад раніцу. Што гэта было – мо нейкі знак мне – ня ведаю. Адно кепска: сапсаваў сьвята сваёй хваробай Акулiным і Бяляцкім, зь якімі меліся сустрэць Новы год разам. Яны, і жонка зь імі, сядзелі за сталом, а мяне трэсла хвароба ў ложку. Так для мяне скончыўся год і пачаўся новы.

Ад сёньня зьбіраюся штодзень занатоўваць у гэты дзёньнік хоць пару словаў. Ня ведаю, ці надоўга мяне хопіць, але паспрабую.

Першы дзень года заканчваецца, а я толькі пад канец яго стаў адчуваць сябе чалавекам. Вярнуліся пачуцьці, прасьвятлела галава. Ноч, ранак і дзень хвароба трымала мяне ў сваіх брыдкіх абдоймах і зараз прыгадваю, што было, як праз замутнёнае шкло разглядваю: твары расплываюцца, час размываецца – словам, першы дзень года практычна страчаны для мяне з-за неспадзяванай хваробы.

Кажуць, як правядзеш першы дзень – так пройдзе ўвесь год. Ня дай Бог!

Версіі

Кніга разгарнулася на 134 старонцы. І я прачытаў загаловак: “Восень”. Хто будзе сёньня чытаць апавяданьне з такою назваю? Хіба што вока зачэпіцца за першы сказ... Не, і ён быў зусім простым: “За вёскаю стаяла груша-дзічка”. Адзінае, што магло зачапіць, гэта “груша-дзічка”. І тое пры пэўным настроі.

Кола Дзён. Адметнасць тыдня

– з 1 студзеня мы сталі яшчэ больш суверэннымі. На дарогах краіны з’явіліся аўтамашыны з беларускімі нумарамі: чатыры лічбы, потым «Пагоня», потым дзве літары. А ў пашпартах тых, хто ад’язджае за мяжу, ставіцца штамп на беларускай і ангельскай мовах: «Грамадзянін Рэспублікі Беларусь».

“Так пісаць нельга”, – падумаў я. І ня стаў чытаць далей. Я чытаў, дакладней, пакуль што гартаў кнігу не як чытач, а як чалавек, каторы і сам спрабуе нешта пісаць. Але адначасна, дзякуй Богу, у мяне захавалася здольнасьць глядзець на напісанае, сваё зразумела, як на чужое. І адпаведна ацэньваць. Тым больш, чытаючы чужое – гэтая якасьць выпірала і адсейвала кнігі па некалькіх сказах. Я загарнуў і адклаў кнігу.

І толькі цяпер зірнуў на вокладку. Там стаяла прозьвішча прызнанага ўсімі класіка.

***

У зьвера было чатыры нагі. Кожная з норавам, са сваімі капрызамі, якія называліся характарам. А яшчэ быў хвост. Нічога сабе хвост, але надта ж любіў ён матляцца між ног і псаваць ім настрой. Асабліва правай. Зьвер увесь час адчуваў за сабою хвост, які целяпаўся па нагах і падганяў яго, быццам быў не сваім нагам, а чужым. Ногі гэтак і празвалі хвост: чужы сярод сваіх, альбо скарочана ЧСС. Была ў зьвера яшчэ галава бязрогая, бо рогі ня вытрымалі зьдзеку зь іх вушэй і адваліліся неяк у лесе, і было яшчэ тое, на чым трымаўся хвост і з чаго расьлі заднія ногі. Словам, зьвер як зьвер. І ўбачыўшы яго на волі, у лесе, вы, напэўна б, спалохаліся б ня менш за яго. Асабліва ўбачыўшы, як кінуліся б уцякаць ад вас ягоныя ногі – кожная ў свой бок.

***

Хаты стаялі справа і зьлева насупраць адна адной, вокны ў вокны. І была ў гэтым нейкая цацачнасьць і непраўдападобнасьць. Да таго ж вуліца

Піліпікі

На аўтобусным прыпынку купіў Піліп банан і зьеў. Спадабалася. Аўтобуса не было відаць. Піліп купіў яшчэ банан. Зьеў, нічога. Падышоў аўтобус, але не Піліпаў. Чарга ад бананаў адхлынула, і Піліп купіў яшчэ банан. Абчысьціў, зьеў, падумаў: смачна ці нясмачна, карысна ці не карысна? Дай яшчэ зьем. Цап-цап па кішэнях, а ўжо і грошай няма. Усю палучку ўчарашнюю, падзеленую з жонкаю, праеў. А цыгарэту выпаліць захацелася якраз... невыносна. Ды купіць няма за што: грошы на бананах праеў. Вось тады і пакляўся Піліп нічога незнаёмага ня есьці. Хай яно хоць тройчы прыгожае і вабнае.

была пустою, бязьлюднаю. Я ішоў па вуліцы між гэтых кардонных домікаў у натуральную велічыню і чакаў сустрэць на ёй хіба што кіношнікаў, якія зараз пачнуць паліць гэтыя хаты.

Ды раптам на парог адной з хатаў выйшла мажная жанчына (як пад ёю ганак не праламіўся!) і закрычала праз вуліцу да суседкі: “Ганна! У цябе маянэз ёсьць?” І тут жа ў акне другой хаты паказалася Ганна. “Ёсьць... ёсьць...” – захітала яна галавой. “То прынясі мне зараз. Госьці ў мяне”.

І ажыла вуліца, паспраўнелі хаты... Ды ўсё ж была ў ёй нейкая ненатуральнасьць – дамы роўненька насупраць адзін аднаго: вокны ў вокны. І калі ажыло ўсё навокал, выдавала гэта ўжо не цацачнасьцю, і не штучнасьцю, і не акуратнасьцю, а – вычварнасьцю.

***

Ноч. Сярод дубовага лісьця мільгаюць зоркі. Хаваюцца за тарчы лістоў і хітра-хітра выглядваюць з-за іх, каб падміргнуць і зноў схавацца.

Ня сьпіцца мне. Гляджу ўверх, на шаты дуба, на зоркі-гарэзы. Ад зьяўленьня да зьяўленьня зоркі некалькі імгненьняў. І ў кожнае зь іх умяшчаецца нечае жыцьцё, што адлятае зараз з апошнімі ўсплёскамі сьвядомасьці.

Чаму я думаю пра тое?

Ня сьпіцца.

Апофрыкі

Займеў Міндоўг, бедалага, ката. Не ката – коціка. Маленькі такі, пушысьценькі. Ходзіць па пакоях, мурлыча. Добра гэтак. І на душы становіцца спакойна. Асабліва калі ляжыць ён на каленях у Міндоўга і сьпіць падчас соймаў і соймікаў. Жыў коцік у Міндоўга, бедалагі, доўга – дзён дваццаць, аж покуль зайздросьнікі не атруцілі яго. Вядома, Міндоўга.

2 студзеня

Толькі што вярнуліся з “гасьцей”. Былі ў Залеўскіх. Вельмі прыемныя і сімпатычныя людзі – Ірына і Сяргей...

Праляцеў яшчэ адзін дзень новага года... Беспадзейна-безнадзейна страчаны.

Падумаў: добрая справа – пісаць дзёньнік пад канец пражытага дня. Можа, хоць ён будзе падштурхоўваць мяне да нейкае пэўнае працы. А то апошнім часам крэмзаю толькі драбязу нейкую, да сур’ёзнае работы не падступаюся. Хоць даўно ўжо накідаў у чарнавую некалькі апаведаў з цыкла “Непатрэбныя рэчы”, а аформіць іх, ператварыць у нешта прымальнае – часу не хапае. Гэта проста апраўданьне бязьдзейнасьці – “часу не хапае” – і звычайная лянота. Усё разумею, здавалася б, але пераламіць сябе не магу і ў выніку шукаю апраўданьні.

Чытаю “Пророки и поэты” І. Гарына. І шчыра зайздрошчу яму: кніга кніг, нічога падобнага я яшчэ не чытаў. Ніколі ня бачыў гэтага аўтара, і ў кнізе няма ягонага партрэта і практычна ніякіх зьвестак пра яго, але ўяўляецца ён мне нейкім калекам (у фізічным сэнсе): здаровы чалавек ня мог бы за жыцьцё пералапаціць сусьветную класіку і так напісаць пра яе.

Версіі

Дым лёг на парог, скурчыўся, як сабачаня, падцяў хвост і заціх. Цяпер здаваўся ён здалёк проста мутнай плямкай каля дзьвярэй (паэт сказаў

Кола Дзён.

Сюрпрыз тыдня

– канадзец беларускага паходжання граф Аляксандр Прушынскі пацвердзіў рашучасць выставіць сваю кандыдатуру на пост Прэзідэнта Беларусі. Але, каб зрабіць гэта, грамадзяніну Польшчы і Канады трэба стаць грамадзянінам Беларусі.

бы – хмаркай). Бязьветранае надвор’е ня зьдзекавалася зь яго, і ён шчасьліва заснуў, стомлены і затлумлены нядаўняю беганінаю людзей вакол полымя, якое і нарадзіла яго. Сьнілася яму нешта добрае, бо ён шчасьліва ўсьміхаўся ў сьне, а адзін раз нават ціхенька і засьмяяўся-затросься над парогам.

У сьне і засьпеў яго чалавек, які зайшоў у двор і накіраваўся да весьнічак. Дым не пасьпеў нават ускрыкнуць – сьмерць ягоная была лёгкай і шчасьлівай. А чалавек толькі чыхнуў на парозе і мацюкнуўся.

***

І толькі месяц, месяц на небе ня сьпіць у гэтую месячную ноч. Узіраецца ён мне ў твар і, здаецца, глядзіць разам са мною мае сны. Я сплю ў садзе, у гамаку, прывязаным да дзьвюх яблыняў. Відаць, месяцу падабаюцца мае сны, бо ён нешта не сьпяшаецца зь неба. Ужо ўсход расквеціла

Піліпікі

У цягнік Піліп купіў “Вожыка”. Пагартаў-пагартаў яго, сумна пазяхнуў і лёг спаць. Прачнуўся. “Вожыка” няма. Уцёк, зараза.

Піліпікі

У цягнік Піліп купіў „Вожыка". Пагартаў-пагартаў яго, сумна пазяхнуў і лёг спаць. Прачнуўся „Вожыка" няма. Уцёк, зараза.

2. 01. 93

заранка, неба сьвятлее з кожнай хвілінай, а ён, бледны, усё стаіць нада мною і стаіць. Я хутка прачнуся ад крыку пастуха ля дзьвярэй: “Маня! Выганяй карову!”, прачнуся, і адразу адляцяць і забудуцца мае сны. Колькі іх ужо было і колькі забылася! І каб ведаў я, што бачыў іх разам са мною месяц, – толькі б парадаваўся: хоць нейкая карысьць ёсьць ад тых фільмаў, што я здымаю і паказваю – трансьлюю – кожную ноч.

Апофрыкі

Скарына, як сапраўдны беларус, вельмі любіў дранікі. У Празе, у каралеўскім садзе, добрую граду адвёў ён пад бульбу, якую мала хто яшчэ ведаў, а тым болей каштаваў на смак. Але сапраўдным адкрыцьцём ягоным стала тое, што з бульбы, аказваецца, можна яшчэ і добрую самагонку рабіць. Чэскія паны, аматары піва, убачыўшы садоўніка і выдаўца вясёлым з самага ранку, ужо не зьдзіўляліся таму, што менавіта ён стаў першым усходнеславянскім друкаром, а толькі пыталіся: “А піва з бульбы можна варыць?” – “Няма нічога немагчымага…” – загадкава адказваў Скарына.

***

Ваяру і будаўніку Даўмонту не сядзелася дома. Хацелася яму дзе-небудзь паваяваць, што-небудзь пабудаваць. Пайшоў ён да крывічоў у Плескаў. Адбудаваў кром. Адбіўся ад крыжакоў. Баяцца яго ўсе. Ня лезуць. Няма чаго больш будаваць, няма з кім біцца. Сумна стала Даўмонту – ваяру і будаўніку. А тут варагі ў грэкі ідуць. Шлях гандлёвы пракладаюць. Пайшлі, кажуць, з намі, кожны дзень будзе табе і будоўля, і бітва. Сьлед у гісторыі пакінеш. Паверыў, пайшоў… І згубіўся ягоны сьлед недзе ў гісторыі. Гадаюць цяперака: ці быў ён увогуле, той Даўмонт, ці то Міндоўг, бедалага, кром у Плескаве пабудаваў?

3 студзеня

Усё больш схіляюся да таго, што некалі запісаў у адным з ранейшых сваіх дзёньнікаў – распачатым ды закінутым: трэба пісаць ня дзёньнік падзеяў, а дзёньнік думак, якія пакінуў мінулы дзень, якія ён падказаў. Наогул, лічу, сапраўдны пісьменьнік павінен заўсёды насіць з сабою асадку і нататнічак, у які запісваць свае нечаканыя думкі, ідэі, вобразы, параўнаньні. Інакш яны губляюцца, забываюцца назаўсёды. Колькі разоў лавіў сябе на гэтым: думкі, якія аднойчы наведалі цябе, назад ня вернуцца. Але яны і ня гінуць. Яны блукаюць па сьвеце, покуль нехта, спаткаўшы іх, не занатуе, не прыкуе іх да паперы. Тым самым ён выпіша сам сабе аўтарскае пасьведчаньне на валоданьне імі. Думкі таму і нечаканыя, што прыходзяць не ў сувязі зь нечым, таму і непаўтаральныя, таму і лёгка забываюцца, і не ўзнаўляюцца, што не зьвязаныя зь нейкай канкрэтнай падзеяй... Колькі зараз блукае па сьвеце думак, якія маглі б стаць маімі... Сьвет поўніцца думкамі, як лес грыбамі. Людзі, праходзячы праз жыцьцё, як праз лес, зьбіраюць іх, як грыбнікі грыбы. І ўсім хапае. Кожны знаходзіць толькі свае, пакідаючы шмат наступнікам. І няма, выходзіць, пра што шкадаваць.

Кола Дзён. Падзея тыдня

— Джордж Буш і Барыс Ельцын 3 студзеня падпісалі ў Маскве Дагавор аб скарачэнні стратэгічных наступальных узбраенняў (СНУ-2). Ядзерная зброя, якая знаходзіцца на тэрыторыях суверэнных дзяржаў Беларусі ды Украіны, пры гэтым улічвалася як расейская. Станіслаў Шушкевіч інтэлігентна адрэагаваў на гэта: прывітаўшы падпісанне дагавора, ён нагадаў, што колькасць удзельнікаў перамоў і раззбраення павінна быць значна большай. Вестак з Украіны пакуль няма, як і сумненняў, што яе ўрад будзе весці сваю, незалежную ад Масквы палітыку.

Версіі

У мяне быў выбар між плахай і шыбеніцай. Я доўга вагаўся, а потым спытаў у палача, ці можа ён прапанаваць нешта трэцяе. “Гільяціна”, – сказаў кат. Плаху я адкінуў адразу: нельга спадзявацца на дакладнасьць, вопыт,

спрыт і сілу ўдару чалавека. Аднак выбраць між шыбеніцай і гільяцінай было яшчэ цяжэй: канкурэнты былі амаль роўнымі. І я спытаў у ката, ці можа ён прапанаваць яшчэ нешта. “Электрычнае крэсла” – сказаў кат. Яго я адмёў адразу. Мне не хацелася працяглай у часе сьмерці. Мне ў гэтым сэнсе больш падабалася гільяціна: ж-бах! – і ўсё. Але я па-ранейшаму вагаўся. Кат заўважыў гэта і сам прапанаваў: “Куля”. І дадаў: “Бац-бац – і кропка”. Мне не спадабалася гэтае “Бац-бац”. Дзе “бац-бац”, там можа быць яшчэ і “Бац-бац-бац-бац”. Я выбраў гільяціну і сказаў пра гэта палачу. Ён засьмяяўся і праз сьмех прахрыпеў: “Не забывайся, што на двары 13-е стагодзьдзе і нішто, акрамя плахі ды шыбеніцы, яшчэ ня выдумана...” “Кат і тут кат”, – падумаў я і, горда ўзьняўшы галаву, узышоў на эшафот. На ім была толькі плаха.

***

Будова сусьвету тлумачыцца проста: яе нельга вытлумачыць. Памятаеце показку: да камунізму застаўся адзін кіламетр, і кожная пяцігодка – крок наперад...

Можа, калі-небудзь нехта вытлумачыць будову сусьвету, можа, недзе некалі будзе пабудаваны камунізм. Але нам жыць сёньня. Пры нявытлумачаным сьвеце і недабудаваным камунізме.

Дык ці варта нам старацца нешта вытлумачыць і хацець нешта пабудаваць? Пакуль мы не зразумеем гэта – варта. Калі мы зразумеем гэта – тым больш варта. Такім чынам: спыненьне ёсьць дэградацыя, рух наперад таксама дэградацыя. Жыцьцё нашае – суцэльная дэградацыя. Ад першароднае чысьціні, ад разуменьня і вытлумачанасьці ўсяго ў дзяцінстве, да бруду навокал, да разуменьня: я ведаю, што я нічога ня ведаю.

Піліпікі

Піліп ніколі ня крыўдзіўся, калі яго недзе за межамі Беларусі, а то і ў межах, называлі бульбашом. А што тут такога, што крыўднага: бульбаш, ён і ў Афрыцы бульбаш, і, пэўна, думаў Піліп, гэтак сама, як ёсьць габрэі-грузіны, габрэі-мурыны, ёсьць недзе бульбашы-японцы, ёсць бульбашы-кітайцы, а ёсць эскімосы... не, эскімосаў, мусіць, няма: бульба ў іх прывазная, а бульбаш– той, хто сваю есьць...

І пазайздросьцім павуку. Бо ён, меў рацыю Пісьменьнік, ведае ўсё. Бо ён, у адрозьненьне ад нас, дастворany Богам да канца.

Версія

У мяне быў выбар між плахай і шыбеніцай. Я доўга вагаўся, а потым спытаў у палача ці можа ён прапанаваць нешта трэцяе. „Гільяціна", — сказаў кат. Плаху я адкінуў адразу: нельга спадзявацца на дакладнасць, вочы ў спрыт і сілу зброі чалавека. Аднак выбраць між шыбеніцай і гільяцінай было лягчэй: канкурэнты былі амаль роўныя. І я спытаў у ката ці можа ён прапанаваць яшчэ нешта. „Электрычнае крэсла" — сказаў кат. Яго я адкінуў адразу. Мне не хацелася працягваць у часе смерці. Мне ў гэтым сэнсе больш падабалася гільяціна: „ж-бах!" — і ўсё. Але я па-ранейшаму вагаўся. Кат заўважыў гэта і сам прапанаваў: „Куля". І дадаў: „бац-бац — і кропка". Мне не спадабала-ся гэтае „бац-бац". Дзе „бац-бац", там можа быць яшчэ і „бац-бац-бац-бац". Я выбраў гільяціну і сказаў пра гэта палачу. Ён засмяяўся і праз смех прахрыпеў: „Не забывайся, што на дварэ 13-е стагоддзе і нішто, акрамя плахі ды шыбеніцы, яшчэ не выдумана..." „Кат і тут кат", — падумаў я і горда ўзняўшы галаву ўзышоў на эшафот. На ім была толькі плаха.

3.01.93.

Апофрыкі

Калі трэба было жаніцца,
а жаніцца трэба было,
Ягайла, стары а мудры,
выбіраючы будучую
жонку, ні з кім ня раіўся.
Хіба толькі з Радзівілам
(каторы ня Чорны) мог
паразмаўляць нібыта ні
пра што, але выпытаць пра
дзяўчыну, бо той ведаў усё
пра ўсіх. А пра якую
зь нявестаў Радзівіл нічога
ня ведаў, тую і браў у жонкі
стары а мудры Ягайла.

4 студзеня

Пасьля трох дзён адпачынку – дзень працы, які прынёс новыя расчараваньні: “ЛіМ” развальваецца на вачах. Сёньня падаў заяву на звальненьне Віталь Тарас, і адразу стала відаць, як мала людзей робіць газету. Здавалася б, дробязь: звальняецца карэспандэнт, а адразу на ягоным месцы ўтвараецца пустэча, дзірка, якую запоўніць сёньня ох як няпроста. Пра астатняе і пісаць ня хочацца. Адно ясна: “ЛіМ” на апошняй мяжы і безь вялікіх перамен газету не захаваць. Толькі хто ж на іх рашыцца?

Ды хер зь імі, з працоўнымі клопатамі. Шкада толькі, што паўгалавы штодзень ідзе на іх, а прыйшоўшы дамоў з паўгалавой хіба што добрае напішаш для сябе, для душы? Не, таму, хто нешта піша і хто хоча не дарма пражыць жыцьцё і штосьці вартае пакінуць пасьля сябе, супрацьпаказана праца ў любых перыядычных выданьнях. Нават у часопісах, а тым больш у газетах. Усё сьвядомае жыцьцё мару стаць вольным мастаком і працаваць толькі на сябе, а даводзіцца душу класьці на зарабляньне кватэры. Разумею, што такою працаю можна зарабіць адно: труну, але, патрапіўшы ў зачараванае кола жыцьця, аніяк не знайду ў сабе сілаў вырвацца зь яго.

Версіі

Усё пачалося, як часта бывае, зь першага позірку: яна сьмела зірнула яму ў вочы, і ён пакахаў яе. Не за сьмеласьць – за прыгажосьць, за сьве-

Кола Дзён. Сенсацыя тыдня

— закрытая сустрэча кіраўнікоў Казахстана, Туркменістана, Кіргызстана, Узбекістана і Таджыкістана, якая адбылася 4 студзеня ў Ташкенце. Паведамляецца, што на ёй было абмеркавана эканамічнае і палітычнае становішча ў рэгіёне і выказана неабходнасць ажыццяўлення ўзгодненай палітыкі. Нурсултан Назарбаеў прапанаваў называць рэспублікі былой Сярэдняй Азіі – Новай Незалежнай Дзяржавай Цэнтральнай Азіі (ННДЦА). Кіраўнікам іншых дзяржаў пакуль існуючага, але юрыдычна не зацверджанага СНД ёсць над чым падумаць: да нядаўняга часу паслухмяныя Маскве «азіяты» паказалі свой характар. Н. Назарбаеў з таварышамі зрабілі ход канём. Якім будзе адказ?

жую, не пакамечаную пекнату, за тонкі стан і за блакітныя-блакітныя шчырыя вочы.

Прайшло сто гадоў. А яны засталіся тымі ж самымі. Не на пажаўцелых фотаздымках, а ў душах. Пазіраючы адно аднаму ў вочы, яны зноў становяцца такімі ж маладымі гарэзамі, і адлятае прэч стагодзьдзе, і забываюцца войны і расстаньні, ёсьць на белым сьвеце толькі яны двое і каханьне.

Ім зайздросьцяць. Але не за тое, за што варта. Бо ці зразумеюць простыя сьмяротныя, якія ўжо ў дваццаць старэй за іх стадваццацігадовых, што ніколі для іх працягласьць жыцьця не была галоўнай, што кожную хвілю жылі яны, як апошнюю...

***

Дзяўчына ляжала на беразе возера, загарала і назірала, як купаюцца двое хлопцаў, яе сяброў. Хлопцы наладзілі спаборніцтвы, хто больш пасядзіць пад вадою. Абодва разам нырнулі. Прайшла хвіліна... Над вадой паказалася адна галава, потым другая, а потым – трэцяя: вялізная і страшная, з вачыма велічынёю з талерку, што займалі больш за паўгалавы, астатняе – рот, не – пашча, зь якое ўніз тырчэлі два клыкі, што не ўмясьціліся ў ёй... Хлопцы стаялі, праціралі вочы, быццам былі яны яшчэ залітыя вадою, і ня верылі ўбачанаму. Галава паднялася над вадою, на доўгай шыі загайдалася ўправа-ўлева. Хлопцы заверашчалі і, захлёбваючыся, кінуліся да берага. Галава абыякава назірала за іх блёханьнем. Адным рыўком яна магла дастаць іх, але толькі пагойдвалася, раскрыўшы страшную пашчу. Хлопцы выскачылі на бераг і, не азіраючыся, шуганулі міма дзяўчыны ў кусты і

Піліпікі

Прыйшоў да Піліпа сусед – Вася. Ага, Вася. І з парогу: “Валя дома?” – “Няма, а нашто яна табе?” – “Ды мне яна якраз і ня трэба. Давай закусь”, – і дастае з кішэні пачатую пляшку. Піліп падумаў: “Што рабіць?” Піць ня хочацца – язва абвастрылася, а выгнаць яго – ня выганіш: сябар жа з чыстым сэрцам прыйшоў. Паставіў ён закусь, Вася наліў. І тут прыйшла Валя. Як выратаваньне. Ніколі Піліп так ня радаваўся жонцы, як тады, калі Вася моўчкі выйшаў з кватэры, бутэльку пакінуўшы на стале, побач з налітай да краёў шклянкай.

далей да бліжэйшых хат. Дзяўчына засталася ляжаць на беразе. Позірк галавы спавіў яе, жах пранізаў сэрца, усё ўнутры яе пагойдвалася разам з галавою пачвары, якая яшчэ трохі палюбавалася сваёй ахвярай і зьнікла пад вадой, быццам і не было яе.

P.S. Хлопцаў пасадзілі за спробу згвалтаваньня дзяўчыны. У іх расказ пра пачвару, вядома, ніхто не паверыў. А можа, і я яго таксама прыдумаў?

Версія

[illegible]

4. 01. 93:

Апофрыкі

*Радзівіл (каторы
ня Чорны) любіў Гедыміна
за добрую душу і ня толькі.
Цаніў ён яшчэ празорлівасьць
і прадбачлівасьць
(абачлівасьць) князя,
безь якіх ён князем ня стаў
бы, а Радзівіл ня стаў бы
Радзівілам.*

***

*Гулялі неяк Вітаўт зь
Ягайлам у карты. Спачатку
на грошы, потым на мястэчкі,
потым на замкі… і так
прайграліся адзін аднаму,
што і жыць няма дзе стала.
Тады вырашылі яны вярнуць
“статус кво” і застацца пры
сваіх. Сорамна потым было
ім сустракацца,
бо кожны ведаў, што жыве
ў прайграным замку
на прайграныя грошы.*

5 студзеня

Здаецца, цэлы дзень нешта рабіў, зь некім сустракаўся, пра штосьці гаварыў, а вось зараз пару хвілінаў пасядзеў, падумаў пра дзень, што пражыты, беззваротна страчаны, і выяўляецца: ад учарашняга сядзеньня над дзёньнікам да сёньняшняга – нічога не адбылося. Ня тое каб вартага ўвагі, а проста нічога – толькі тлум, бегатня, турботы, якія пакідаюць адно: стому.

Злавіў, праўда, няведама адкуль прыляцелую, няведама чыю (але яўна не сваю) думку: чалавек – замкнутая сістэма, адзінае поле вакол адзінага кавалка матэрыялу. Прычыну хваробы трэба шукаць у сабе і сродак, спосаб лячэньня ў сабе...

Думка абарвалася (банальная, дарэчы), і я падумаў: вось бы яшчэ “злавіць” мысьленны дапаможнік, як лячыць самога сябе самім сабой... Ой і херню ж я пішу...

Версіі

...і вось зь ягоных крылаў пачало выпадаць пер’е. Прайшоў дзень, і ён ня змог ужо лётаць, як учора таму... А яшчэ праз ноч і хадзіць стала цяжка: цягнуцца крылы па зямлі, чапляюцца за кустоўе, аруць зямлю, нібыта трымаюць яго і хочуць, каб проста тут лёг.

Ніколі ня думаў ён, што крылы такія цяжкія. Якімі паслухмянымі былі яны яшчэ... А цяпер – галава кругам ідзе ад блізкасьці зямлі, трава раніць

Кола Дзён

Публікацыя тыдня

— інтэрв’ю народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава карэспандэнту «Звязды». «Баюся, што Беларусі пагражае вялае перараджэнне ў звыклы «суб’ект канфедэрацыі» або федэрацыі – на радасць наменклатуры пры поўнай абыякавасці зняверанных мас», – сказаў Васіль Уладзіміравіч. На жаль, у сваіх прагнозах ён рэдка памыляўся, яшчэ радзей мы нешта рабілі, каб яны не спраўдзіліся...

вочы. Ён прывык бачыць яе звысоку, зьверху. І ня ведаў, наколькі пахкая яна... Чыхнуў – алергія? – упаў. Каб больш не падняцца. Нават на ногі.

Сонца з травы не відаць. Неба блакітам цьвіце над зяленівам. Дождж падае на шырока расшпіленае вока...

***

Ляжаў на ложку і думаў: як гэта людзі ў космас лятаюць, нарадзіўшыся ў вёсцы? Абсурд нейкі. Ім бы жыта сеяць, сена касіць, а яны – у космас. Жах! Дзеля чаго, навошта здароўем сваім рызыкуюць, маці сваю прымушаюць хваляваццa, калі ад пачатку вядома: ад таго, што ён зьлятаў, надвор'е лепшым ня стане? Кажуць, амерыканцы ўчора ці пазаўчора яшчэ адзін карабель запусьцілі ў космас. Ну і няхай, яны людзі чужыя. Ну а нам навошта гэтым займацца, калі ў вёсках адныя старыя засталіся і кароў даіць няма каму? Дык не – зманьваюць хлапцоў і дзявок зь сяла і ў космас запускаюць. Гвалт! Не каб гарадскіх. Бэйбусаў. Прыязджалі на канікулы летам да Манькі двое – во такія морды. Ведама, і нашым у горад захочацца, а іх – у космас. Вясковых! Ім бы поле араць трактарам, поле, матчыным і бацькавым потам палітае! Ці ня так думаю, га? Ляжу ў ложку і думаю. Я б і сам у горад паехаў, але ў космас не хачу. І араць не хачу. Ня проста не хачу, а не люблю. Чуеш розьніцу? Мне што, я ля зямлі застаўся, я родную вёску не пакінуў, і хай сукі, што разьехаліся, дзякуюць мне за гэта. А то – па космасах лятаюць, а я сей ім, касі ім. А ху-ху не ха-ха?! Навучыліся лятаць, як птушкі, – навучыцеся і ежу здабываць самі. Вось так думаю я. І ня трэба мне вашых космасаў ніякіх. Нізашто!

Піліпікі

Калі трэба было выбіраць, што піць: віно ці гарэлку, Піліп заўсёды выбіраў віно. Гарэлка, што гарэлка, гарэлка – ня дзіва, гарэлка – яна аднолькавая, а віно – рознае, і ніхто ня ведае, якое яно ў пляшцы: добрае ці ўжо кепскае, у меру салодкае ці ўжо кіслае... Але як добра, калі пашчасьціць і віно патрапіцца смачнае – проста смачнае, гэта значыць такое, якое ты любіш... А гарэлка – што гарэлка, яна аднолькавая...

***

За недалёкай горкай вырас лес дзідаў. Яны вылазілі зь зямлі і падаўжаліся, а потым выцягнулі за сабою вояў. І вось ужо стаіць на гары колькі сотняў княскіх дружыньнікаў зь дзідамі і лукамі, скіраванымі на мяне. Я адзін. Я не ўцякаю. Я спакойна ўкладваю стужку ў кулямёт. Падыйдзіце, падыдзіце яшчэ бліжэй, бярыце мяне – я адзін. Але воі стаяць на гары, узіраюцца наперад і ня бачаць мяне. Тым лепш... Тым горш...

Дзіды і лукі, мячы і некалькі дарагіх кальчуг зьбяром мы потым з жонкаю на полі і адвязём Мойшу з карчмы, што стаіць пры левым павароце на Полацак. На выручанае золата набудзем яшчэ патронаў у галандскіх купцоў і зноў выйдзем на межы Літоўскія...

...Радзіму бараніць ніколі ня рана...

Апофрыкі

Звычайна ўвосень, штогод, дрэвы скідалі сваю лістоту, і трэба было быць дурнем, каб не прыкмеціць гэтага. Кейстут, сама сьціпласьць, дурнем ня быў і гэтую асаблівасьць беларускай прыроды ня раз скарыстаў у бойках з ворагамі. Загоніць іх у лес улетку і трымае аблогу, пакуль лісьце не ападзе. Рэдкі вораг, апынуўшыся ў голым лесе бачным як на стале і зразумеўшы хітрасьць Кейстута, не здаючыся даседжваў аж да знаёмства зь яшчэ адною асаблівасьцю ліцьвінскае прыроды – сьнегам.

6 студзеня

Забраў у “Мастацкай літаратуры” рукапіс. Трэба апошні раз сёе-тое выправіць. Прадмову, мажліва, напіша У. Рубанаў, якому зборнік, у цэлым спадабаўся. Трошкі нечакана для мяне, бо лічыў, што мы працуем зусім у розных стылях. Сустрэў на калідоры “М. Л.” Барыса Іванавіча. Сёньня адпрацаваў ён у выдавецтве апошні дзень. З панядзелка будзе дырэктарам БелСЭ. Дзіўная была ў нас зь ім размова. Быццам і шчырая, але... Зьдзівіў ён мяне веданьнем лімаўскіх праблемаў, падалося нават, што ведае ён лепш за мяне. Сказаў, што пакуль “ЛіМам” будуць кіраваць Замскі і Берасьцень – толку ня будзе. А А. сёньня зноў на працу не прыйшоў. Цярпеньне маё скончваецца. Баюся, што на чарговай лятучцы сарвуся. Але – мне няма чаго губляць апроч сваіх ланцугоў. Б. І. намаляваў вялікія зьмены ў бліжэйшай будучыні ў “ЛіМе”. Пабачым. Але – далі б мне волю... Я ўжо столькі наглядзеўся тут... Шкада, што раней нічога не запісваў, бо пік падзей прыйшоўся якраз на канец года.

Дзёньнік усё ж добрая справа. Але адной староначкі – мала. Алесь Марціновіч сказаў сёньня, што І. М. Пташнікаў, які падышоў павіншаваць нас з Калядамі, вядзе вельмі падрабязныя дзёньнікі (хоць і пісаў у “ЛіМе”: дзёньнікаў я не вяду), і пажартаваў: лічы, сёньня мы ў яго дзёньнік патрапілі... Вось і яны да мяне патрапілі.

Версіі

Кот мяккай лапай з доўгімі вострымі кіпцюрамі дакрануўся да бетоннае сьцяны шматпавярховіка, астылае за ноч. Сьцяна сустрэла лапу абыякава, як

Кола Дзён.

Цытата тыдня

— «...Нягледзячы на суровасць нашых будняў, на іх мітусню і складанасць, я заклікаю вас, дарагія суайчыннікі, не падаць духам, але, па слове апостала Паўла, любоўю служыць адзін аднаму, бо ўвесь закон у адзіным слове заключаны: «возлюбиши ближняго твоего, якоже себе».

(З Паслання мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха Усяе Беларусі, члена Свяшчэннага Сінода да Нараджэння Хрыстовага кліру і пастве зямлі беларускай).

Горыч тыдня

– чарговае павышэнне цэнаў на салодкі цукар.

і ўчора пругкі струмень, пляма ад якога яшчэ ня высахла. Кот упёрся лапаю ў бетонныя каменьчыкі і мякка паставіў побач другую. Потым моцна прагнуў сьпіну, ледзь не намачыўшы жывот у лужыне, і мяўкнуў на ўсю моц свайго горла.

На блізкім прыпынку адзінокая мыш сьцялася ад жаху, прыціснулася да слупа і замёрла, зыркаючы па баках, ня ведаючы, адкуль чакаць небясьпекі. У начной цішыні рэха некалькі разоў паўтарыла крык ката, і кожны раз мыш уздрыгвала ўсьлед яму.

***

Сумна мне... Сумна...

Сьвішча вецер. Падвывае тралейбусу. І хоць не адзін я ў пакоі, хоць ведаю: я дома, а ня дзе-небудзь у глухім, цёмным лесе, і вецер сьвішча ня ў дрэвах, а сярод шматпавярховікаў, і вые ня воўк, – усё роўна, часам робіцца вусьцішна ад гэтага сьвісту-выцьця... І сумна.

Сумна? Чаму сумна? – перапытае нехта. Можа, проста няўтульна, альбо холадна і сыра, альбо – не па сабе, альбо гнятліва, змрочна, нудна, пагана, паршыва, паскудна, а можа, тужліва, маркотна, самотна...

Не, мне сумна. У пакоі ўтульна і цёпла, побач жонка і сын. Аднак жа мне – сумна.

Чаму сумна? – спытаю я сам сябе.

І не знайду адказу.

Можа, таму і сумна...

Пiлiпiкi

Пiлiп нiколi не палiў цыгарэт, бо, як толькi ён адчыняў новы пачак, чамусьці адразу ўсе цыгарэты зь яго вывальваліся, выпадалі і раскочваліся па падлозе. Першы раз Піліп сабраў іх, але паліць ня стаў – пагідаваў... “І як гэта іншыя недапалкі-бычкі зьбіраюць? Сьлінявыя... фу-у...” – падумаў Піліп. Другі раз і зьбіраць з падлогі ня стаў. На трэці раз раззлаваўся і патаптаў рассыпаныя цыгарэты... А на чацьвёрты раз увогуле ня стаў адкрываць пачак, палюбаваўся ім і паставіў на лядоўню... І так добра яму стала, нібыта цыгарэту выпаліў... Цяпер у яго так: захочацца паліць – паглядзіць на пачак на лядоўні, і... накурыўся. А калі пачак пажаўцее ад часу, ён набывае новы.

„6" снежня 1993 г.

Забраў у „[illegible]" рукапіс. Трэба яшчэ раз сёе-тое выправіць. [illegible], [illegible] Ч. Рубанаў, якому дзякуй, [illegible], спадабалася. Трошкі нечакана для мяне, бо [illegible], што [illegible] [illegible] у [illegible] [illegible]. Сустрэў на [illegible] „М.Л." Барыса Іванавіча. Сёння [illegible] ён у выдавецтве апошні дзень. З панядзелка будзе дырэктарам БелСЭ. Дзіўная была ў нас з ім размова, [illegible] і шчырая, але... Здзівіў ён мяне веданнем літаратурных праблем, ~~[illegible]~~ [illegible] [illegible], што верыць ён больш за мяне. Сказаў, што [illegible] „[illegible]" будуць кіраваць [illegible] і [illegible] – толку не будзе... А Андрэй сёння [illegible] на працу не прыйшоў. Цярпенне маё [illegible]. [illegible], што [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]. Але – мне няма чаго губляць [illegible] сваіх [illegible]. Б.І. [illegible] [illegible] [illegible] ў [illegible] будучыні ў „Ліме". Паглядзім. Але – [illegible] мне волю. Я ўжо столькі нагледзеўся тут... Шкада, што раней нічога не [illegible], бо [illegible] [illegible] якраз на нашу [illegible].

Дзённік усё ж добрая справа. Але [illegible] [illegible]. Алесь Марціновіч сказаў сёння, што Э.М. Пташнікаў, ~~[illegible]~~ які [illegible] [illegible] [illegible] у [illegible], [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] ([illegible] і [illegible] у „Ліме" [illegible] [illegible]), і [illegible]: [illegible] сёння [illegible] ў [illegible] [illegible]...

Вось і да мяне [illegible] [illegible].

Апофрыкі

Міндоўг з Даўмонтам сябравалі зь дзяцінства, хоць і жылі ў розным часе. Потым, у юнацтве, разам хадзілі да дзевак. Пасварыліся ж яны, калі Міндоўгу, бедалагу, які вельмі не любіў коней, бацька купіў матацыкл і ён перастаў браць з сабою ў суседняе княства, у Плескаў, Даўмонта, будучага ваяра і будаўніка, а езьдзіў адзін. Толькі праз гады Даўмонт даведаўся, што, аказваецца, езьдзіў ён, а не Міндоўг, бо той, каб захаваць сваю цнатлівасьць і годнасьць у вачах будучых выбаршчыкаў, называў сябе ў тым княстве не Міндоўгам, а Даўмонтам. Але абралі потым у князі там якраз Даўмонта...

Што ж, у гісторыі і не такое бывае.

***

Прыйшоў Альгерд, сама шчырасьць, пад Сінія Воды украінцаў ад татараў вызваляць. Вызваліў і дамоў сабраўся. А ўкраінцы ведаюць: пойдзе ён – татары вернуцца. Жанчын яму абяцаюць, коней даць і грыўняў сярэбраных нарубіць колькі захоча – толькі застанься. Падумаў Альгерд – жанчын ды коней у яго хапае, грыўна даўно не валюта ў Еўропе, дзе талеры ходзяць, а вось зямлі далучанай новай шкада. І пагнаў татараў аж да Чорнага мора.

7 студзеня

Увесь пачатак гэтага года – суцэльныя сьвяты. Сёньня, на Каляды, дзень нараджэньня Эдзіка Акуліна. Натуральна, мы былі ў яго. Шмат незнаёмых людзей. Аднаго Міхася Скоблу я трохі ведаў, ды і тое больш па ягоных вершах, чым асабіста. Да таго ж Эдзік сам зьехаў недзе батлейку паказваць. Толькі калі вярнуўся, стала весялей. Пазнаёміўся з Андрэем Скарынкіным, сынам вядомага паэта. Цікавы хлопец, шкада, што мала паразмаўлялі. Але, падалося, моцна зарыентаваны на расейшчыну. І ня дзіва. Сам быў такім некалі. Аднак гэта не перашкодзіла мне вярнуцца да беларушчыны і не забыцца пра выдатнейшую расейскую літаратуру, якой захапляюся і якой аддаю належнае дагэтуль. Андрэй, аказалася, аматар паэзіі Ю. Кузьняцова і амаль ягоны сябар. Я заўсёды паважаў Кузьняцова як паэта, але мне вельмі не падабаецца яго палітычная пазіцыя: атаясамліваньне ўсяго ўсходнеславянскага з расейскім. Паэт і палітыка ўсё ж рэчы несумяшчальныя. Будзь ты тройчы расейцам, ганарыся сваім народам, сьпявай яму гімны, але ня плюй на іншыя, не прыніжай іх і не тапчы. Трэба быць найперш чалавекам, а потым ужо прадстаўніком пэўнай нацыі, найперш чалавекам, а потым паэтам...

Кола Дзён.
Навіна тыдня

– кіраўнікі Беларусі прапанавалі прызначыць сустрэчу кіраўнікоў дзяржаў СНД у Мінску на 22 студзеня. Малдова і Туркменістан ужо заявілі, што на сустрэчу іх прадстаўнікі не прыедуць, Украіна пакуль вагаецца, Расія маўчыць (мажліва, зноў хтонебудзь хварэе), Сярэдняя Азія сваё слова сказала ў Ташкенце. З усяго гэтага напрошваецца выснова, што тэрмін сустрэчы можа быць зноў перанесены, а падпісанне Статута, дасць Бог, і зусім не адбудзецца.

Версія

Стрымгалоў кінуўся зэдлік усьлед за сталом, але нагнаць страчанае на старце было справай няпростай. Стол плаўнымі, грацыёзнымі скачкамі

набліжаўся да фінішу. Зэдлік задрыгаў ножкамі часьцей і амаль параўняўся са сталом. Вось і фінішная стужка. Яшчэ рывок і – абодва фіналісты разам нацягваюць яе і перарываюць. Якраз пасярод.

Стадыён, які дагэтуль грымеў аглушальна – узвыў. Ні сталы, ні крэслы etc. не сумняваліся кожныя ў сваёй перамозе. Аднак толькі фотафініш мог вызначыць сапраўднага пераможцу. Пра гэта і аб'явілі суддзі. Але яго (фота на фінішы) не было. А значыць, супернікам давядзецца прабегчы яшчэ раз, цяпер ужо толькі ўдвох.

Стол і зэдлік выйшлі на старт. Зубр і заяц, мыш і муха. Пасьля такога ўдалага фінішу стаўкі на зэдліка ўзрасьлі. Але сьпецыялісты былі ўпэўненыя, што аддаўшы гэтак многа сіл у папярэднім забегу, новы зэдлік адназначна прайграе.

Выстрал. На гэты раз абышлося без фальшстарту. І зь першых метраў зэдлік вырваўся наперад. Стол адставаў. Паўтаралася сітуацыя мінулага забегу, толькі ў адваротным парадку. Фінішная прамая. Стол павялічыў даўжыню скачкоў, не разьлічыў і наскочыў на зэдліка. І пакаціўся да фінішу клубок з ножак, тырчэўшых ва ўсе бакі. За метр да фінішу ён спыніўся. Зэдлік вылез з-пад стала. У яго засталося толькі тры нагі. Адна адляцела да гледачоў. Стол ляжаў на сьпіне, і ў яго было ўсяго дзе нагі. Прытым левая ніжняя і правая верхняя. Ні бегчы, ніісьці ён ужо ня змог бы. Зэдлік моўчкі пазіраў на яго. А стадыён крычаў яму: ”Ідзі!” Гэта крычалі крэслы etc., сталы маўчалі, яны бачылі, што прайгралі. Зэдлік павярнуўся, як сабака зь перабітаю нагою, і хацеў ужо перарываць фінішную стужку, як стол уцалелаю нагою зьбіў яго і адкінуў далёка назад, а сам перакатам-перакатам пераадолеў лінію, а потым перарваў стужку.

Пілiпiкi

Пуза ў Пiлiпа пачало расьці рана. І пасьля 30 гадоў яно ўжо выразна акрэсьлілася. Ды так выразна, што часам і жыць перашкаджала. Затое ў вёсцы яго любілі. Асабліва калі распранаўся, каб траву ў двары скасіць. Тады адразу людзей у вёсцы большала, і кожны хацеў прайсьці паўз двор Пiлiпа і павітацца. Пiлiп спыняўся і здымаў у адказ свой капялюш, бо крычаць нешта на вітаньне не хацеў. А каб зьняць капялюш, трэба было вызваліць руку, а каб вызваліць руку, трэба было кінуць касіць... А ня ў руху жывот Пiлiпа быў яшчэ большым. Зайздросьнікі вясковыя толькі гэтага і хацелі: жывот Пiлiпаў павялічыць, каб адысьці ўбок і пасьмяяцца.


Стадыён узарваўся апладысьментамі: вось ён – пераможца. Засталося, праўда, адно пытаньне: навошта было бегаць? Стол мог бы зьбіць зэдліка яшчэ на старце, а потым спакойна падысьці і парваць стужку. Але – усе пытаньні потым, на прэс-канферэнцыі.

Апофрыкі

Прачытаў неяк Леў Сапега – кніжнік і мысьляр – Скарынаву кнігу і падзівіўся, як усё ж мудра Скарына ў прадмове закруціў пра пчол і рыбаў, што вульлі ды ямы свае бароняць і любоў да іх імаюць. Вось бы і людзі так. Асабліва шляхта местачковая… Гэта ж колькі праблемаў адразу зьнялося б… "Ня можаш – навучым, ня хочаш – прымусім…" – згадаў ён народнае выслоўе і напісаў Статут.

***

Сьцяпан Батура, які вельмі любіў купацца, паставіў свой замак на беразе Нёмана, але да рэчкі спускаўся рэдка. Чалавек паўднёвы, ён любіў, каб вада была цёплая, парная, а таму купаўся не на прыродзе, а ў сьпецыяльна зробленай балеі, якую ласкава называў "Мой басейн".



8 студзеня

Толькі пад раніцу, ужо 9 студзеня дарваўся да дзёньніка, каб чыста сімвалічна адзначыцца ў ім. Паставіў кляксу, запісаў гэты сказ – і ўсё. Яшчэ дзень, выкрасьлены з жыцьця.

Версія

Ад мяне да яго было метраў трыццаць. Ён рос пры вёсцы, пры першых яе хатах. Па ім жыхары суседніх сёлаў арыентаваліся, калі пры размове паказвалі ў бок станцыі. Ля яго вечарамі зьбіралася моладзь. Але то вечарамі. А зараз тут было пуста, утаптаная дзясяткамі ног зямля – травы пад ім не было – адпачывала. Адпачываў і ён. Я ня стаў падыходзіць бліжэй. Паглядзеў яшчэ трохі на яго самотную, стамлёную постаць і пайшоў дахаты. Я думаю, ён зразумеў усё і не пакрыўдзіўся на мяне.

Піліпікі

Дзень за днём Піліп сядзеў перад вакном сваёй гарадской кватэры і назіраў за вуліцай. Да прыпынка падыходзіў аўтобус і, набіты людзьмі, ад'язджаў. Дзеці пераходзілі вуліцу ў прызначаным месцы і ішлі да школы. Дарослыя перабягалі дарогу блізка перад машынамі і кіравалі да чаргі ля крамы. "Каторы дзень гляджу – і хоць бы адна аварыя", – падумаў

Кола Дзён.

«Падарунак» тыдня

– з 7-га студзеня ўдвая павялічыўся кошт чыгуначных білетаў. Па Беларусі пакуль можна ездзіць вольна, а вось за межы краіны білеты прадаюцца па пашпарце, з указаннем прозвішча пасажыра на білеце.

Піліп. І тут жа затармазіла імклівая “Волга”, завіхляла, закідалася на дарозе і ўрэзалася ў “Жыгулі”.

“Ну, нарэшце...” – падумаў Піліп і адышоў ад вакна.

***

Бывае такое: заселі ў галаве Піліпавай два радкі зь песьні і ні ўзад ні ўперад: паўтараюцца і ўсё тут. А мелодыя – яшчэ больш навязьлівая, чым словы: пяецца і пяецца ў галаве – увесь дзень да вечара. І каб жа песьня свая, а то чужая, руская. Ды яшчэ і піянерская, у школе вывучаная.

Фу, і прызнацца сорамна, што там за словы.

„8” студзеня 1992 г.
Толькі пад раніцу, учора 9 студзеня дарваўся да дзённіка, каб чаго сімвалічна адзначыцца ў ім. Паставіў кляксу, запісаў гэты сказ – і ўсё. Яшчэ дзень выкрэсьлены з жыцьця.

Апофрыкі

Выгульваючы сабаку, Кастусь Астрожскі, мілы чалавек, між іншым, не ўтрымаў яго, калі той ірвануў за сустрэчным катом. Кот заскочыў на дрэва і адтуль зьдзекаваўся сваім мяўканьнем з сабакі, які бегаў вакол, кашляў і якатаў ад злосьці. “Бачыць ока, ды зуб ня ймёт”, – згадаў спадар Кастусь маскоўскую прымаўку, пагладзіў зьнясіленага сабаку па загрыўку, паблажліва сказаў: “Вось за гэта я й люблю артылерыю ў сваім войску”, – і загадкава ўсьміхнуўся.

***

У чарговы раз разьбіўшы войска чарговага маскоўскага цара,Радзівіл, каторы Чорны, палонных браць адмовіўся, як яны ні прасіліся. “Ідзіце дамоў з Богам, – сказаў ён маскалям, – і шукайце вакно ў Еўропу ў іншым мейсцы…” – але ім давялося яшчэ некалькі сотняў гадоў чакаць нараджэньня Пятра.

9 студзеня

Другі дзень у гасьцях у нас Данільчыкі. Адпачываем гэтак, як я даўно не адпачываў. Прынамсі, з халасьцяцкіх часоў. Начыста забыўся пра работу, пра нейкія свае турботы. Гуляем у гульні, у якія я не гуляў, зноў жа, з халасьцяцкіх гадоў. У "тысячу"... Памятаю, калі ў 1984-85 гг. зімою, Сяргей Дубавец, я і Воўка Камісар (Пінчук) зьбіраліся ў мяне на кватэры, бралі з сабою 10 пляшак кефіру і ноч навылёт гулялі ў "тысячу", патрошку смокчучы кефір.

Зараз нават ня верыцца, што такое некалі было.

Вось і сёньня закончылі гуляць недзе каля чатырох гадзін. Раніцы. Як і ўчора. І што дзіўна: як і ў маладосьці, няма стомы. Галава здаецца сьветлай (здаецца!). І раніцай, спаўшы гадзіны 3-4, устаеш бадзёры і выспаны... Як у маладыя гады. Парадокс проста. Трэба, відаць, часьцей практыкаваць падобны адпачынак, калі па душы, а можа, па натуры ён мне.

Версіі

З кожнай яміны высоўвалася галава і пазірала на мяне беспавекавымі круглымі зьмяінымі вачыма. Я нават не ўяўляў сабе, якое цела магло хавацца ў гэтыхямінах. Але я адчуваў, што ўсе гэтыя стварэньні толькі і чакаюць моманту, калі я адвярнуся ад іх, каб накінуцца на мяне і дастаць адным імклівым кідком, як жаба языком хапае муху.

Кола Дзён.
Свята тыдня

– 475 гадоў назад, 9 студзеня 1518 года, у Празе Францішак Скарына надрукаваў кнігу «Песня песняў цара Саламона». У Мінскім Палацы прафсаюзаў адбылося «Свята беларускай Бібліі», наладжанае Беларускай каталіцкай грамадой пры падтрымцы акцыянернага таварыства «Кросны», на якім быў выстаўлены адзіны на Беларусі і, на жаль, няпоўны асобнік Скарынавай кнігі з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі.

Я мог бы стаяць гэтак вельмі доўга, чакаючы дапамогі, калі б не няўмольнае набліжэньне ночы. Што будзе пасьля надыходу цемры – я ня ведаў. Адно зразумела:я ня буду бачыць тады нічога, нават гэтых агідных зьмяіных галоў з талеркамі-вачыма. А яны, прывыклыя да цемры, мяне будуць бачыць. Мажліва, яны і палююць толькі ноччу і таму зараз не рашаюцца на мяне напасьці.

Але дапамогі не было. Цемра насоўвалася. І трэба было дзейнічаць. І тады я падняў уверх правую руку. Позіркі ўсіх галоў скіраваліся на яе. Яны, мне падалося, наогул заўсёды ўглядаліся толькі ў верхнюю кропку цела. І я вырашыў гэта скарыстаць. Я зьняў капялюш і па высокай траекторыі кінуў у бок галоваў. Да яго з нораў-ямінаў ірвануліся галовы на высокіх шыях – зьмеі-галовы. А я тым часам кінуўся ўцякаць. Завароржаныя палётам капелюша, галовы не заўважылі майго рыўка, а калі апамяталіся, я ўжо быў далёка.

***

За кальцавой дарогай (якая не была кальцавой, а толькі гэтак называлася) пачынаецца змрочны яловы лес (які на самай справе быў ляском, астраўком дрэваў сярод бясконцых палёў), дзе на вузкіх (раней сказалі б конных) дарогах (на якіх два легкавікі разьмінуцца не змаглі б) часьцей можна сустрэць (проста неспадзявана сутыкнуцца нос у нос) свайго сябра (блізкага, роднага, калегу, проста знаёмага, мужа сяст-

Піліпікі

Вяртаючыся зь лецішча ў горад на электрычцы, Піліп пазнаёміўся з адной жанчынаю. Была яна крыху маладзейшая за яго, што якраз найбольш і спадабалася Піліпу. Спачатку ён доўга, з паўдарогі, сядзеў побач зь ёю моўчкі, а потым, калі пераязджалі рачулку, спытаў:

– Як вам удалося вырасьціць такія цудоўныя памідоры?

Жанчына, сьціпла апусьціўшы вочы, зірнула на вядро, поўнае чырвоных і жоўтых вялізных памідораў, і сказала:

– Гэты гатунак я сама вывела на сваім участку. Каму ні скажу – ніхто ня верыць.

Піліп паверыў ёй адразу, і таму больш зь ёю не загаворваў.

***

Піліп нешта зьеў. Што, ён не памятаў. Перахапіў між іншым. І забыўся. А страўнік яшчэ просіць. Піліп хацеў яму сказаць: я ж ужо еў! А што – забыўся. Пачухаў ён патыліцу і пайшоў да лядоўні.

ры, аднавяскоўца і г. д.) чым у горадзе (у перапоўненым аўтобусе наогул нікога ня ўбачыш і не заўважыш) бо сюды выходзіць адпачываць (а часам і па нейкую карысьць – шашлык зьесьці, красак назьбіраць, ягадаў пашукаць, кол высекчы, сьвісток сынку выразаць...) ці ня ўвесь наш мікрараён (а куды яшчэ пайсьці, калі нават да бліжэйшай крамы – паўгадзіны чаканьня аўтобуса ды сем прыпынкаў), асабліва людна тут па выхадных (яблыку недзе ўпасьці, плюнуць няма куды) літаральна пад кожным кустом – кампанія (па-нашаму – калектыў, шобла, таварыства з абмежаванай адказнасьцю) і дымок ад сьвежага вогнішча.

Файна!

***

Муха паўзла па шкле. Па маім адбітку ў вакне. Па маёй шчацэ. Я шкроб тое мейсца, якое яна казытала зараз, а сьверб не праходзіў. І тады я сагнаў муху з вакна. Яна села мне на шчаку. Нічога не зьмянілася ў адбітку на шкле. Толькі муха стала не такой яркай і жывой. Стала нібы намаляванай. Яна паўзла па маёй шчацэ. Але хіба можа казытаць намаляваная муха?

Апофрыкі

Міндоўг, бедалага, вельмі не любіў коней. Асабліва кабыл з жарэбчыкамі. І езьдзіў таму толькі ў карэце і ніколі верхам. А каб ніхто ня ведаў пра гэта, прыдумаў сабе герб – вершніка з тарчай і мечам. Маўляў, тады ніхто пра яго нелюбоў да язды верхам не здагадаецца. Бо сорамна ў XIII стагодзьдзі коней баяцца.

***

А яшчэ Міндоўг, бедалага, які не любіў коней, не любіў і сабак. Асабліва тых, што вольна бегаюць, а не на ланцугу сядзяць. Бо кідаліся яны заўсёды ўсьлед за ягонай карэтай і такі гвалт ды брэх падымалі, што ніколі дамоў, у замак, цішком ня вернешся, каб засьпець жонку за здрадай.

***

Захацеў патрапіць Гедымін у Кнігу рэкордаў Гінэса. Думаў-думаў, што б гэта зрабіць, і вырашыў пабудаваць у Вільні вежу Гедыміна. Пабудаваў – і не патрапіў. Ідэя ня сьвежая…

10 студзеня

Толькі правялі сваіх гасьцей, як нечакана-негадана завітала да нас Ларыса Раманава з дачкою. Думаў, сёньня адпачну трохі і вазьмуся за кнігу, аж не. Прагаварылі ўвесь вечар. Узгадалі Гомлю. Агульных знаёмых. Гомельскія лайдакі, аказваецца, надумалі выпусьціць свой альманах. Скінулі ў яго вершы Агафонаў, Краснабарод, Багданаў, Сяргей Сыс, ну і ў Раманавай узялі. Першыя трое расейскамоўныя авангардысты, якія пішуць "пад Хармса" і "абэриутов". Сыс, Раманава і часткова Багданаў пішуць па-беларуску, крыху ў гэтым жа рэчышчы, але Раманава сур'ёзьней за ўсіх іх, быццам яна не жанчына сярод мужчынаў, а наадварот. Нешта, праўда, ня верыцца, што ў іх штосьці атрымаецца. Гніюць хлопцы ў Гомлі (ня варацца ў сваім соку, а менавіта гніюць) – колькі там, у прынцыпе, таленавітых паэтаў, але ніводзін ніяк ня ўзаб'ецца на нешта сур'ёзнае. Ці то горад сам такі гнілы, ці што? Закляты... Затое вырваўшыся зь яго, як акрыялі і як працаваць пачалі: напорыста, сьвежа, натхнёна – і Анатоль Сыс, і Акулін, і Бяляцкі, і Казлоў, і Дубавец... Ды і я сам за першы год у Менску напісаў больш, чым за сем – у Гомлі. Колькі я там жыў – ніколі не падабаўся мне ён, і зараз няма настальгічна-шчымлімых успамінаў пра яго. І прыязджаю цяпер у Гомлю, як у чужы мне горад.

Кола Дзён.

Падзея тыдня

– візіт дэлегацыі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь на чале са Старшынёй парламента Станіславам Шушкевічам у Кітайскую Народную Рэспубліку. У час пяцідзённага знаходжання адбыліся сустрэчы і перамовы з кіраўнікамі КНР, падпісаны шэраг беларуска-кітайскіх дакументаў, важнейшы з якіх – заява аб прынцыпах развіцця двухбаковых адносінаў.

Версіі

На 121-м паверсе 350-ці павярховіка я спыніўся. Выцер пот з ілба і вызірнуў у калідор. Ён быў шырокім і доўгім. У некалькіх месцах на ім

стаялі сталы, за якімі сядзелі жанчыны. Яны займаліся сваімі справамі: адна чытала, другая нешта вязала, трэцяя, мусіць, драмала. Але ўсё роўна прайсьці незаўважаным было нельга. І я павярнуў назад, на першы паверх.

***

Той, хто прыйшоў за мною, пайшоў ужо. Таго, хто быў перада мною, я і ня бачыў. Хто ж будзе наступным? Няўжо я?

Але ж я не хачу. І прыйшоў я сюды не таму, што хацеў, а таму, што ў мяне ніхто не спытаў, ці хачу я.

Я стаю. Аднак дарога пад маімі нагамі пракручваецца, а значыць і стоячы я набліжаюся да той самай кропкі, зь якой няма шляху назад, а значыць і стоячы я крочу туды, адкуль не вяртаю-

Піліпікі

У краме ў чарзе Піліпу наступіла на нагу прыгожая дзяўчына. Наступіла і не сыходзіць. Ёй так, пэўна, яшчэ лепш было: далей відаць. Піліп цярпеў-цярпеў і ня вытрываў: ціха-ціхенечка выцягнуў сваю нагу з-пад абцасіка дзяўчыны. А тая вельмі незадаволена гэтак глянула на яго, проста спаліла злосьцю, потым паднялася на дыбачкі: вызірнула наперад. Піліп тады асьцярожна падсунуў нагу пад абцасік дзяўчыны. Дома, паціраючы стаптаныя да сінякоў пальцы, ён думаў: “Добра, што кілбасы хапіла ўсім, а то б дарэмна адстаяў такую чаргу...”

***

Усю ноч Піліпу сьніўся эратычны сон. Прачнуўшыся, ён доўга прыгадваў салодкія хвіліны, як успамін пра маладосьць. Сьнілася яму ягонае неразьдзеленае каханьне, сяброўка гадоў юначых, зь якою так неспадзявана ён разьвітаўся некалі. І да сёньня так ні разу і ня бачыўся. Яна сьнілася той самай, маладой; маладым быў і Піліп. І цяпер прыгадваў ён кожны пяшчотны, пякучы дотык яе рук, кожны пацалунак, кожны... Побач зь Піліпам ляжала ягоная жонка. Спала лёгка дыхаючы і нічога ня ведаючы пра Піліпаў сон. У жыцьці жонка была сварліваю без прычыны і злоснаю на ўсё. Аднак Піліп лічыў, што з жонкаю яму пашанцавала, нават думаў да сёньня, што кахае яе. І тут раптам зразумеў, што, мажліва, ён і кахае яе, аднак вачыма, целам, а душа ягоная, сэрца і цяпер аддадзена той дзяўчыне са сну, дзяўчыне з маладосьці, зь якою яму было гэтак добра... у сьне.

цца. Зрэшты, у мяне зусім няма шляху назад, альбо ўбок. Толькі наперад да загадзя вядомага выніку.

Няўжо толькі дзеля гэтага я прыйшоў сюды? Дык ня буду ж стаяць!

Версія

На 121 паверсе 350-і павярхоўкі я спыніўся. Выцер пот з ілба і ~~[illegible]~~ выйшаў у калідор. Ён быў шырокім і доўгім. У некалькіх месцах на ім стаялі столы, за якімі сядзелі чалавекі. Яны займаліся сваімі справамі: адны пілі, другія нешта вязалі, трэція, шылі, драмалі. Але яе роўнай прысутнасці незаўважаць было нельга. І я павярнуў назад, каб пайсці наверх.

10. 01. 93.

Апофрыкі

Калі ў Мірскім замку здымалі фільм пра запарожскіх казакоў, Радзівіл (каторы Чорны) раззлаваўся, што яго ролю абдзялілі, далі іграць хлопа – няголенага і ў портках залапленых, – і загадаў галоўнага сцэнарыста разам з галоўным рэжысёрам прадаць Сапегам. За сімвалічную плату: раз пераспаць зь любімай служанкаю Ільва. Той (Сапега, вядома) не згадзіўся. І тады давялося згаджацца на сваю ролю Радзівілу (каторы Чорны).

***

На полі Куліковым біліся Мамай... ня важна з кім. А Ягайла, стары а мудры, падаўся дапамагчы... ня важна каму. Прыйшоў ён са сваім войскам, а тыя, яго не дачакаўшыся, ужо біцца пачалі. І такі грукат стаіць, такі гвалт на ўсю ваколіцу. Пакуль ішоў Ягайла, ведаў, каму дапамагаць будзе. А тут глянуў – з аднаго боку ў цюбецейках і з другога, з аднаго боку касавокія і з другога. І тыя, і другія “алах акбар” крычаць. Каму дапамагаць? Разьвярнуў ён войска, маўляў, хай самі разьбіраюцца, і пайшоў дамоў.

11 студзеня

Сёньня зайшоў да мяне Андрэй Федарэнка і прапанаваў выступіць у Доме літаратара на вечарыне кароткага апавяданьня. Я адмовіўся. Не хачу я пакуль залішне вытыркацца, каб прыцягнуць на сябе ўвагу, якая мне не патрэбная. Дый ня ўмею я трымацца на сцэне і вучыцца не хачу (а некалі ж умеў – быў нязьменным вядучым усіх школьных вечарынаў, канцэртаў). Не маё ўсё гэта... Як там у паэта: "Цель творчества – самоотдача, а не шумиха, не успех..." Прыблізна гэта я і сказаў Андрэю. Ён зьдзівіўся: мяне заторгалі прапановамі, і Клімовіч, і Варановіч самі набіваюцца, пішчом лезуць, а ты адмаўляешся... А я адмаўляюся і буду адмаўляцца да апошняга. Не хачу. І ня буду сябе пераломваць. Хоць разумею: гэтым я сабе толькі нашкоджу. Таму што ва ўсе часы папулярнымі былі якраз тыя, хто лез на сцэну, хто пастаянна ствараў вакол сябе аўру – найчасьцей скандальную, пускаў пра сябе чуткі і паказкі.

Але, падумалася, мне й папулярнасьці ня трэба. Яна будзе толькі абцяжарваць. Пры жыцьці. А пасьля? Пасьля хіба хацелася б, каб не дарэмна пражыць на гэтай зямлі...

Кола Дзён.
Адметнасць тыдня

– з панядзелка (11 студзеня) Беларускае тэлебачанне пачало трансляцыю навін тэлекампаніі Бі-бі-сі. Перадачы выходзяць пяць разоў на тыдзень з перакладам на беларускую мову.

Версіі

Неба. Глыбокае неба. Глыбокае сіняе неба. Глыбокае сіняе неба нада мною. Глыбокае сіняе неба вісіць нада мною. Глыбокае сіняе неба купалам вісіць нада мною. Глыбокае сіняе неба бяздонным купалам вісіць

нада мною. Глыбокае сіняе неба жоўтым бяздонным купалам вісіць нада мною.

Я балдзею. Жоўтым? Я балдзею...

***

Я выйшаў з дому, калі яшчэ не разьвіднела. Насустрач мне жанчына выгульвала сабаку. І я раптам зразумеў, што сачу не за жанчынай, якая, дарэчы, была прыгожай, а за сабакам. Прыкідваю, што за парода, колькі каштуе, ці ёсьць радавод і медалі... А жанчына ўстала зь цёплага ложка раней за мяне, а жанчына прыхарашылася і апранула не спартыўны касьцюм, а кароценькую спаднічку, і ў яе такія прыгожыя ногі... А я гляджу на сабаку...

І за гэта я ненавіджу горад.

Я сеў у аўтобус. З дурным разьмяшчэньнем крэслаў: пасажыры парамі павернутыя адзін да аднаго. Насупраць мяне жанчына. Пазірае падвойным позіркам. Быццам глядзіць не адна яна, а яшчэ нехта зь яе паглядвае на мяне. Ня ведаю куды падзецца і як пазбавіцца гэтага адчуваньня. Позірк стомлены, хоць і ранак, а з-за яго – жывы і цікаўны... Жанчына ўстала, і я ўбачыў, што яна цяжарная... Жанчына выйшла, аўтобус напоўніўся гаманою, я прапанаваў сваё месца нейкай бабульцы, мяне сьціснулі з усіх бакоў, два разы аблаялі, тры разы цішком раздражнёна ўдарылі ў бок, адтапталі ў сьпешцы нагу, зноў аблаялі...

Я ненавіджу горад. Але я ў ім жыву. Бо яшчэ больш ненавіджу вёску.

Я хачу быць адзін. Сам сабе. Сам па сабе. І горад мне дае гэта. А вёска – не.

Піліпікі

На цыферблаце гадзіньніка ў гомельскім аэрапорце былі напісаны лічбы ад аднаго да трыццаці. Піліп прыкінуў: значыць, у тутэйшых сутках павінна быць 60 гадзін. Аказалася, не: то былі вагі.

***

На дрэве віселі тры грушы. Па ўсім – сьпелыя, сакавітыя. Піліп сарваў адну і зьеў. Смачная. Сарваў другую. Зьеў. Захацелася яшчэ. Дастаў і трэцюю. Толькі першы раз адкусіў, як прыляцела аса і стала кружляць вакол дрэва. Піліп падумаў: “Занясу я гэтую грушу жонцы і пачастую яе”.

Я ненавіджу і горад, і вёску. Але я жыву ў горадзе. Мажліва, з-за абмежаванасьці выбару: альбо-альбо. Я выбраў горад. У мяне была мажлівасьць выбару, і я выбраў горад. Бо ў горадзе я магу быць адзін, а ў вёсцы я заўсёды навідавоку, у вёсцы я ўсім знаёмы і ўсім, у нейкім сэнсе, свой. У горадзе я ўсім чужы. І ўсім да задніцы, хто я, што я і як. У горадзе кожны Сам, і я – Сам. Горад робіць нас САМастойнымі, горад любіць САМастойных, бо ён – Сам САМастойны, бо ён усім чужы.

І таму я ненавіджу горад.

Але яшчэ больш я ненавіджу вёску. Бо яна лезе ў душу, бо яна хоча заняць сабою памяць, бо яна любіць настальгічна ўспамінацца... І ня толькі мне.

Я ненавіджу вёску. І таму я жыву ў горадзе. Устаю ранкам, іду на прыпынак. Сядаю ў аўтобус і ня ведаю, куды схавацца ад падвойных позіркаў ня толькі цяжарных жанчын. Бо ў кожным чалавеку побач дабро і зло. І ранкам, найчасьцей, дабро выглядвае з-за зла і зло топча мне ногі, штурхае ў бок і аблайвае...

Я ненавіджу горад, але я жыву ў ім, бо не хачу жыць у вёсцы. Я не хачу быць сваім усім, я не хачу жыць навідавоку, жыць так, як трэба, як усе. Я хачу жыць так, як хачу толькі я. Горад дае такую магчымасьць, а вёска – не. І таму я ненавіджу вёску і зьехаў зь яе, адразу, як зразумеў, што ненавіджу яе.

Я ненавіджу горад. Але я жыву ў ім. Бо ў мяне няма выбару. Бо яшчэ больш я ненавіджу вёску...

Піліпікі

Пад асінаю сядзеў
падасінавік, а пад бярозаю
– абабак. Вакол кораня
абабка абкруціўся вуж
і сыкаў на Піліпа, нібы
бараніў ад яго сваё жытло
ці самога сябе, а не сваю
здабычу. Піліп і без таго
ня ўзяў бы гэтага старога
і, пэўна ж, чарвівага
абабка. А ў вужа тым
больш забіраць ня стаў:
ён жа яго першы знайшоў.

Па дарозе з грыбоў
Піліп падышоў
да запомненай бярозкі.
Жабка пад ёю сядзела,
а абабка таго не было.

І забраў яго, пэўна ж,
ня вуж.

***


Кітайка.

Гэтак у нас называюць кароценькі матузок, завязку для мяшэчка.

Кіянка – драўляны малаток, іншая ягоная назва – баба...

Малайкі і малайцы, непалкі і непальцы, пранцы...

Язык мой – вораг мой?



Апофрыкі

Давыд Гарадзенскі, тактык
і стратэг, сустракаючы
ў Навагрудку ці Вільні Кастуся
Астрожскага, мілейшага,
між іншым, чалавека, казаў:
"Прывітаньне герою Воршы!
Згуляем у шахматы?" – ведаў,
зараза, слабае мейсца спадара
Кастуся: не любіў той шахматы.
Пан Астрожскі згадваў пачутае
ў палоне маскоўскім выслоўе
і адказваў коратка:
"А ху-ху не хо-хо?"

***

Скарына, як сапраўдны беларус,
умеў друкаваць кнігі, а прадаваць іх
ня ўмеў. Таму, сустрэўшы Сымона
Буднага, казаў яму: "Ты, Сёма,
не паўтарай маіх памылак: у Маскву
ня едзь – дзікі народ маскалі,
фіна-ўгорскі, яны кніжкі і дарам браць
ня хочуць". На што Будны ківаў
галавой і цокаў языком.

12 студзеня

Учора, едучы ў тралейбусе, паспрабаваў падзарадзіцца энергіяй ад тых, хто стаяў побач. Здаецца, атрымалася. Сёньня паўтарыў – і зноў быццам лепш стаў сябе адчуваць. Ня верыцца – паэксперыментую яшчэ. Але. Думка пра гэта прыйшла мне не выпадкова. Часта авалодвала мною пачуцьцё, што нехта зь мяне высмоктвае жыцьцёвыя сілы – асабліва ў натоўпах. Цэлымі днямі бываў я самотным і слабым – невядома ад чаго. Потым прыйшоў да высновы (раней недзе прачытаўшы пра гэта, але не надаўшы ўвагі), што я і сапраўды служу камусьці падпітчыкам, што мяне скарыстоўваюць, а я і не заўважаю таго, а ўсё думаю пра нейкія хваробы. Спрабаваў пабудаваць (у думках) вакол сябе экран-заслону, каб не даваць іншым смактаць мяне. Не атрымалася. І вось новае выйсьце – самому падпітвацца ад іншых... Ня ведаю, ці атрымаецца што ў мяне, ня ведаю наколькі верагодна ўсё гэта. Мажліва, проста ўнушэньне. Хай і так. Абы лепей было, а то апошнім часам я зусім засох і расхварэўся. Дарэчы, напрыканцы года мяне, відаць, смактанулі гэтак, што адразу адкінула...

Кола Дзён. Цытата тыдня

– “Ніякая раўнапраўная садружнасць разам з Расіяй не можа існаваць у прынцыпе. Усё роўна будзе праяўляцца тэндэнцыя да цэнтралізацыі, да насаджэння расійскіх інтарэсаў, мовы і г. д. Прычына ў тым, што на ўсходзе Еўропы – Расіі няма ніякай раўнавагі ні ў палітычным, ні ў эканамічным, ні ў тэрытарыяльным плане. Трэба стварыць сістэму раўнавагі, як гэта існуе ў Заходняй Еўропе. Магчымым прыкладам такой сістэмы можа быць Балтыйска-Чарнаморская садружнасць”.

(З выступлення Зянона Пазняка на Сойме БНФ. Газета «Звязда», 12 студзеня).

Навіна тыдня

– пасля 20-га студзеня на Беларусь прыедзе намеснік генеральнага сакратара ААН Дж. В. Рыд для абмеркавання пытанняў аказання дапамогі з боку сусветнага супольніцтва пацярпелым ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Тым часам 12 студзеня на ЧАЭС паміж першым і другім дзеючымі блокамі адбыўся пажар. Па паведамленнях інфармацыйных агенцтваў, радыяцыйная абстаноўка на станцыі падчас першага сёлета здарэння істотна не змянілася.

Версіі

Дробязі, дробязь, драбяза...

Жыцьцё нашае, што складаецца з дробязяў, ператварае нас саміх у драбязу, падзеі, якія нічога ня значаць ні для нас саміх, ні для іншых, ператвараюць нас у людзей нікчэмных і нікому не патрэбных, нашая мітусьня, якая не нясе зьменаў ні нам самім, ні іншым, робіць з нас людзей дробных, людзей дробязных, але самае горкае, што мы не заўважаем гэтага, бо нас настолькі аблытала сабою гэтае жыцьцё, што нам здаецца, быццам жывем мы звычайна, жывем, як усе, а значыць – нармальна, а значыць, ня трэба ні ў чым сумлявацца: сумліў можа толькі пасеяць няўпэўненасьць у тым, ці так мы жывем, ці так усё робім, але сумліў нічога ня зьменіць, сумліў загоніць нас яшчэ далей у дробязі, у дробязнае калупаньне ў дробязях, потым у яшчэ драбязьнейшых дробезіках і г. д., аж покуль ня стане калупаньне ў дробязях жыцьця самім жыцьцём, бо, па сутнасьці, мы і займаемся гэтым усё жыцьцё, нат не заўважаючы таго, і няма калі нам задумацца, узьняцца над дробязямі нашага жыцьця, бо яны цяжкімі кандаламі вісяць на нашых нагах, на нашых душах, аблытваюць сабою нашыя думкі, і няма канца гэтаму, покуль няма канца вам, і адное вызваленьне ад путаў жыцьцёвых дробязяў, якія не даюць жыць чалавеку па-чалавечы, ёсьць сьмерць.

***

– Кругом! Стой! Раз-два!.. Разыдзіся...

У кожнага адразу знайшлася свая справа. Была яна і ў майго героя. Ён

Пілiпiкі

Піліп набыў канапу. Па аб’яве. Не зусім старую, але добра ўжо б/у (альбо па-беларуску – б/к ці п/к). Перавёзшы з сябрам канапу дахаты, Піліп прысеў на яе. І яму спадабалася: зручна, мякка – умелі ж раней рабіць. Піліп лёг – яшчэ лепш: канапа ласкава падалася пад сьпінаю і ўзяла яе ў свае абдымкі, і ні спружына табе не выбіваецца, ні стружка ня коле.

Піліп даў паляжаць сябру. І таму спадабалася. А калі жонка фыркнула: такую старызну прыпёр, асадзіў яе:

– Не вазьнікай!

цішком, збоку ад усіх, займаўся ананізмам. Кожны дзень у гэты час ягоны арганізм патрабаваў разрадкі. І кожны дзень у гэты час быў перапынак у занятках.

Кожны займаўся сваёй справай. І афіцэр адышоўся, каб заняцца сваёй справай. Яму было прасьцей. Да яго ў бытоўку ў гэты час прыходзіла прадавец Іра зь недалёкага магазінчыка, у якой таксама выпрацавалася ўстойлівая патрэба ў афіцэры менавіта ў гэты час.

Афіцэр затрымліваўся даўжэй за ўсіх. Салдаты, справіўшы патрэбу, ужо чакалі яго, раз-пораз паглядваючы ў бок бытоўкі. Да самое бытоўкі ніхто падысьці не асьмельваўся. А тым больш – зазірнуць у вакно. Хоць зрабіць гэта карцела многім. Аднак сёньня мой герой ня вытрымаў. Узяўшы ўсяго сябе ў рукі, ён, як толькі афіцэр зачыніў за Ірынкаю дзьверы, рушыў да вакенца. Усе забыліся пра сваю справу і трывожна назіралі за ім. У афіцэра быў пісталет, афіцэр мог і проста выскачыць ды пабіць – і тады б ніхто не заступіўся за майго героя, і сам ён не абараняўся б. Мой герой падышоў да вакенца і зазірнуў у яго. Афіцэр з Ірынаю сядзелі за маленькім столікам і пілі гарбату. Ім было добра. Яны пра нешта нягучна размаўлялі. Мой герой скрыгануў зубамі і сеў пад вакенцам. Дзясяткі вачэй упіліся ў яго пытаньнем: што там?

Мой герой падняўся і зноў зазірнуў у вакно. Афіцэр з Ірынаю па-ранейшаму пілі гарбату. Ірына закінула нагу за нагу, і без таго кароценькі халацік зусім агаліў яе – стройную, доўгую, прыгожую жаночую нагу – агаліў аж да... мой герой зноў прысеў, упёрся сьпінаю ў сьцяну. “Што там?” – пыталіся дзясяткі позіркаў. Мой герой маўчаў. Расчараваньне напоўніла ягоную душу. Глыбокае расчараваньне, ад якога ні ўцячы, ні

***

Піліп любіў чытаць газеты. Любой сьвежасьці. Бывала, купіць у краме што-небудзь і просіць, каб загарнулі ў газету. Апошнім часам там газет ня стала, трэба ісьці са сваёй ці з цэлафанавым мяшэчкам. А вось што яшчэ любіў Піліп, дык гэта купляць семкі. Бабулькі заўсёды загортвалі семкі ў найцікавейшыя ўрыўкі артыкулаў. Піліп чытаў іх без пачатку, альбо без канца, альбо без аднаго і другога разам. Чытаў і астатняе дадумваў. І так прывык, што цяпер, нават купляючы газету ён спачатку разьдзірае яе на кавалкі, складвае абы-як і толькі потым – чытае. Асалода надзвычайная. Паспрабуйце. Раю.

зьехаць, ад якога не пазбавіцца. У апошняй надзеі ён зноў зазірнуў у ваккенца. За ім нічога не зьмянілася. Мой герой пайшоў да сваіх. Яны абрадавана пыталіся: “Ну, што там?” Каб не расчароўваць і іх, мой герой узмахнуў указальным пальцам правай рукі і ўдарыў ім па кулаку левай. Хлопцы задаволена запрацавалі яшчэ засяроджаней.

Апофрыкі

Давыд Гарадзенскі,
тактык ды стратэг,
неўзьлюбіў Ягайлу.
Здраднікам называў.
А Ягайла, стары а мудры,
на гэта не зважаў. Казаў:
“Я ня талер, каб усім
падабацца…”

13 студзеня

Вось ужо трынаццаты дзень запар ня толькі раблю запісы ў гэтым дзёньніку, але і пішу хоць бы па адной “версіі” з “мрояў”, а таксама – “піліпікі”... Аднак зь першых дзён неяк атрымліваецца так, што сядаю пісаць я не раней за 2-3 гадзіны ночы. Раней не выпадае. Як, дарэчы, і сёньня. Да гэтага часу галава выветраная цалкам – вецер гуляе ў ёй, дакладней, туман. І атрымліваецца такая мура, што і перачытваць ня хочацца. Паглядзеў неяк пару “Версіяў” і падумаў: якое ўбоства... Тое ж – мой дзёньнік, які грэх гэтак называць. Але пісаць яго буду, дарываючыся ў любы час, як рабіў дагэтуль.

Сёньня ў “ЛіМ” нарэшце прывезьлі кампутары з “Дайновы”. Распачынаюцца новыя клопаты, і вольнага часу будзе яшчэ менш... Тры апошнія вечары разам з жонкаю сядзелі і “рэпарыравалі” рукапіс кнігі “Сон між пачвар”, які забраў я ў “МЛ.” Кожную дробязь, кожную праўку, якіх зусім мала, кожную абдрукоўку, якіх вельмі шмат, трэба заклеіць і паправіць. Ніколі ня думаў, што гэта так цяжка – кнігі выдаваць...

Кола Дзён.
Публікацыя тыдня

– артыкул старшыні Камісіі ВС Беларусі па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны Ніла Гілевіча «Прабачце, гэта не апіскі?» у «Звяздзе» за 13 студзеня. Усім, хто выступае за двухмоўе, крычыць пра ўціск «русскоязычного населения» на Беларусі, дадзены стрыманы, грунтоўны адказ. Дзіўна толькі, што апанент Н.Гілевіча – старшыня Камісіі ВС Беларусі па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах Міхаіл Слямнёў.

Версіі

Што можа быць агідней за вясну пасярод зімы? Брыдка, склізка, брудна... А тут яшчэ дождж. Халодны, калючы і – мокры... Еўрапейская зіма – сказаў узьнёсла пра такую пару мой сябар колькі гадоў назад. І чамусьці

так паэтычна гэта прагучала, што захацелася ўбачыць, знайсьці нейкія перавагі, прыгажосьці ў гэтакай зіме.

І не знайшлося.

Затое калі трохі прыцісну марозчык і зацерушыў лёгкі сьняжок – быццам лягчэй дыхаць стала. А калі ранкам я выйшаў на нечапаную бель сьнегу, і зарыпеў ён пад ботамі, і вочы кінуліся адпачываць на гэтай замілаванасьці, спакоі, чысьціні – усялякі шарм са словаў “еўрапейская зіма” абсыпаўся, аблузаўся, змыўся, як фарба з плота.

***

– Крытык і разбуральнік жыве ў кожным. Ад пачатку, як і – стваральнік і будаўнік. Але каб стаць першым (крытыкам-разбуральнікам) – нічога ня трэба, каб стаць другім (стваральнікам-будаўніком) – неабходна вучыцца. Банальныя ўсё рэчы кажу я вам. Простыя, павярховыя. Аднак чаму ж гэтак многа людзей у сьвеце не задумваюцца над тым, не разумеюць таго. І хваляць крытыкаў, а не стваральнікаў. І не разумеюць, што крытыкамі найчасьцей становяцца няўмекі, недавучні няўдалыя стваральнікі: сам ня можа, аднак іншага вучыць пачынае. І здаецца, гэтак правільна ўсё гаворыць, прыгожа і складна. А няхай возьме ды зробіць нешта лепшае за тое, што раскрытыкаваў. Ага, ня возьмецца. Бо ён добра ведае, што ня зможа. Бо ён спрабаваў ужо – і ня змог.

Вось гэтая непаўнацэннасьць, пра якую ён не забываецца, і

Апофрыкі

Кейстут, сама сьціпласьць, ня піў гарэлку – любую, тым болей крамную, бо ні крамаў тады яшчэ не было, ні алхімікі самагон ня выдумалі. Ня еў ён і бульбы – ніколі, бо Калумб яшчэ Амерыку не адкрыў. Але гэта не перашкаджала яму быць ліцьвінам і размаўляць сваёю моваю – па-руску, як пісаў Скарына. А тонус падтрымліваў ён добраю налiўкаю ці бражкаю.

***

Альгерд, сама шчырасьць, нейк паехаў у Берасьце. Конна. А дарога была няблізкай. Ды што там казаць – і дарогі не было: такія дзікія часы стаялі. Пагналіся за ім ваўкі галодныя недзе пад Ваўкавыскам, якога таксама яшчэ не было. Залезшы на высачэзны дуб, спадар Альгерд глядзеў, як даядаюць ваўкі ягонага жарэбчыка, і думаў: а ці не заснаваць мне тут горад? І назва ўжо ёсьць. І герб таксама.

гняце яго. Ён ня можа пабудаваць, і таму ён разбурае пабудаванае іншымі...

Згаджаюся, ёсьць выключэньні. Бываюць і сярод крытыкаў добрыя стваральнікі, і сярод стваральнікаў – добрыя крытыкі. Але – гэта выключэньні, як і зь любога правіла. Аднак яшчэ часьцей бывае іншае: дрэнны стваральнік становіцца яшчэ горшым крытыкам, дрэнны крытык – яшчэ горшым стваральнікам.

Я кажу ня толькі і ня столькі пра літаратуру. Я думаю пра нашае жыцьцё.

Пiлiпiкi

Вы ўжо, здаецца, ведаеце, што Піліп быў заўзятым рыбаком. Ён мог лавіць рыбу без канца, у любое надвор’е, у любым мейсцы. Нават у акварыуме, каб ён у яго быў. Піліп, па цяперашніх мерках, быў фанатам. Разбудзі яго сярод ночы і спытай: на што і як лепш за ўсё лавіць у лютым акуня зь Бярэзіны – ён адкажа. Па энцыклапедыі зьвяралі – правільна.

Вось і купіў сабе Піліп новую вудачку. Японскую. Прыгожая... Можна ў куце паставіць і маліцца на яе перад ад’ездам на рыбалку. Каб лавілася рыбка вялікая і маленькая, і яшчэ драбнейшая...

***

Апошні раз у лесе Піліп быў летась. Ці пазалетась. Зрэшты, няма розьніцы. Галоўнае, што даўно. І вось учора выбраўся ён у грыбы. Адзін, бяз жонкі. “А на халеру яна там, – падумаў ён. – Баба на караблі ніколі шчасьця не прыносіла...” – і пайшоў.

Лес сустрэў яго лёгкаю гаманою лістоты і птушынымі перасьвістамі. “Ну як у кіно ўсё роўна, – падумаў, заўважыўшы тое, Піліп, – а я раней лічыў, што яны проста фанаграму круцяць. Аж праўда: тут табе і сьвіст, і стракатаньне, і крыкі... Трэба ў лесе бываць часьцей...”

Пад першай жа асінай Піліп знайшоў падасінавік, пад першай жа бярозай – абабка,

пад першым жа дубам “разьмініраваў” каравяк. Апошняе вельмі не спадабалася Піліпу. “Лепш бы каровы лятали, – падумаў ён, – высока-высока... Каб настрой лясны не псаваць”.

У гушчар Пілiліп не заходзіў, зь лясных закінутых дарог не зварочваў, і таму праз нейкую гадзіну ягоны цэлафанавы мяшэчак быў амаль поўны. Піліп усьміхаўся сам сабе, прыгадваючы два баравічкі, якія знайшоў ён пад маленькай ялінкай. Як ні хітрыла яна, як ні прыкрывала іх лапкамі – Піліп разаблачыў яе і грыбы забраў.

Вяртаючыся дамоў, Піліп зноў завярнуў да той ялінкі. “Добры ўспамін прыемна прыгадаць, – падумаў Піліп, – і ня раз... Хай будзе елачка вечным помнікам грыбам, якія я знайшоў тут...”

То было ўчора. А сёньня ранкам Піліп зьбегаў да той ялінкі, на сваё грыбовішча, каб першым сабраць баравічкі, што вырасьлі за ноч. І знайшоў. Не пад ялінкай, праўда, а побач. Дамоў вярнуўся ён героем. А жонка сустрэла яго – як пугай секанула.

– Ужо і пахмяліцца зьбегаў, скаціна... У-у-у, я б цябе задушыла зараз...

Ну што мог адказаць ёй Піліп?

14 студзеня

Ледзь ня кожны дзень тэлефануюць пачынаючыя і вядомыя графаманы, прапануюць "творы", прытым настойліва, на мяжы нахабства і, сваёю ўпэўненасьцю ў геніяльнасці напісанага, дабіваюцца таго, што я бяруся пачытаць (не зьмясьціць у "ЛіМе", а пачытаць) іхні твор з надзеяй, што, можа, і сапраўды запала туды іскрынка божая, і кожны раз ужо зь першых радкоў становіцца зразумелым, што зноў я памыліўся, і пацьвярджаецца даўно даказаная ісьціна: талент звычайна сатканы са сьціпласьці і сумліву, а дзе нахабства і напор – там графаманства. Таму мне ніколі не падабаліся словы: талент сам праб'е сабе дарогу. Не, не і яшчэ раз не – гэта графаманы праторацъ сабе бальшак, затаптаўшы пры гэтым не адну сьцяжыну таленту. Талент трэба ашчаджаць, песьціць. Але я не памятаю ў бел. літаратуры такога прыкладу (хіба што Янішчыц, ды яна цалкам не раскрылася), каб нехта са старэйшых, з імем, літаратараў дапамагаў таленавітым маладым. Найчасьцей зьбіралі вакол сябе землякоў-графаманаў, якія сьпявалі ім гімны.

Кола Дзён. Здарэнне тыдня

– трагічна закончылася калядным вечарам паездка дамоў у Магілёў старшыні Камісіі па заканадаўстве Вярхоўнага Савета Беларусі Дзмітрыя Булахава. Непадалёку ад Бялынічаў на службовым аўтамабіле ён збіў 60-гадовую жанчыну, якая праз некаторы час памерла ў бальніцы. Вядзецца следства.

Кола Дзён. Уступ

Адсвяткаваны Каляды, адгуляны выхадныя, і паступова жыццё ў краіне ўваходзіць у сваё звыклае рэчышча. Невядома яшчэ, як адгукнуцца ў эканоміцы распублікі гэтыя калядна-навагодне-калядныя канікулы, але падобна да таго, што сапраўдны Новы год прыйшоў да нас у ноч з 13-га на 14-е, калі адзначалі мы па звычцы Стары Новы год. Святы скончыліся. І трэба брацца за працу… Дарэчы, яшчэ пра святы: у расійскіх журналістаў на гэтым тыдні з'явілася новае – Дзень расійскага друку, які адзначаны 13 студзеня. Мы ж засталіся без свята. Не вялікая бяда, аднак і ў нашай гісторыі ёсць слаўныя даты – дзень выхаду першага нумара "Нашай Нівы" альбо "Мужыцкай праўды" – якія маглі б стаць Днём беларускага друку.

Версія

У гаршчэчку на вакне расла ружа. Гэта яна называлася так: ружа. А на самай справе была гэта вечназялёная расьліна, якая за пяць гадоў свайго жыцьця аніразу не цьвіла. Ружа зайздросьціла сваім суседкам: яны называліся ня гэтак гучна, а часам і зусім нязграбна, аднак за год цьвілі па некалькі разоў і радавалі гаспадароў дзясяткам дробненькіх кветак альбо адною вялікаю.

– Чаму, чаму мне так не шанцуе ў жыцьці? – пыталася ружа ў сваіх суседак. – я ж нарадзілася быць прыгожай і шчасьлівай.

– Гэта таму, – адказала ёй глаксінія гібрыдная, – што ты кахаеш толькі сябе.

– Так, так, – пацьвердзіла пеларгонія занальная, – ты думаеш толькі пра сябе, з пагардай пазіраеш на нас. А шчасьце – яно рэдка даецца з нараджэньнем, яго трэба яшчэ заслужыць, яго трэба выпакутаваць...

І ружа зразумела: каб быць ружай, мала называцца ружай, мала нарадзіцца ружай, трэба яшчэ стаць ружай.

Апофрыкі

Гедымін, добрая душа, вельмі любіў коней. Сваіх і чужых. Асабліва чужых, бо заўсёды чужое здаецца лепшым, пакуль ня стане тваім. І вось аднойчы ў Наваградку ўбачыў ён у татарына прыгожага скакуна. Хацеў купіць па-добраму – татарын не прадаў. Што заставалася? Ага, правільна: заўтра конь сам прыйшоў у ягоную стайню. Разумная жывёла, што і казаць.

Пілініпікі

Пиліп зьняў боты
і паварушыў пальцамі –
добра... Піліп абуў пантофлі
і прайшоўся па пакоі –
добра... Піліп выйшаў
на гаўбец і шырока ўдыхнуў
грудзямі сьвежае паветра –
кхе, кхе, кхе...

***

Піліп стаяў на прыпынку
і назіраў, як да шапіка
“Саюздруку” падыходзілі
людзі і куплялі газеты.
Усё больш мужчыны.
А жанчыны запыняліся
радзей, стаялі даўжэй, нешта
выбіралі і ўрэшце набывалі
парфуму. “Вось напішы
пра гэта ў насьценгазету
ці ў “Савецкую Беларусію”,
– падумаў Піліп, – дык
усе адразу скажуць:
жонаненавісьнік...”

15 студзеня

Купіў сёньня двухтомнічак Варлама Шаламава, перагартаў яго, прыгадаў чытаныя ў ранейшых кнігах аповеды. А аднаго, пачутага неяк даўно, яшчэ калі быў школьнікам, па радыё "Свабода", а мо "Голас Амерыкі", – так і не знайшоў. Запаў ён моцна мне ў душу – колькі гадоў прайшло, а памятаю. Можа таму, што хрыпаты прыймач, які ледзь лавіў прыбіты заглушальнікамі голас, плюс – забароненасьць, плюс – зусім не савецкі, лагерны сюжэт стварылі незабывальную інсцэніроўку таго аповеду, бо ўспамінаюцца найперш умовы, у якіх я пачуў аповед, а потым ён сам. Ужо тады мяне зьдзівіла крыху прымітыўная ягоная мова і лабавая, прамая падача. Без хітрынкі, бяз выдумкі. Чыста дакументальна. Зараз падумаў: мажліва, так і трэба. Яму, В. Ш., не было патрэбы нешта выдумляць, само жыцьцё падкідвала такія сюжэты, што ніколі не прыдумаеш. Да таго ж якраз дакументальнасьці ад яго і чакалі.

Існуюць дзьве рэзка палярныя плыні ў прозе: дакументальная і цалкам выдуманая (не фантастычная, а рэалістычная). Між імі дзясяткі зьмешаных, зь перавагай то адной, то другой. Гэта якраз і была савецкая, сацрэалістычная літаратура, якая не любіла ні дакументальнасьці, ні чыстай выдумкі. Немагчыма было ні пісаць праўду, ні тым больш выдумляць яе.

Кола Дзён. Сюрпрыз тыдня

– цытуем «перадавіцу» першага нумара «независимой левой газеты «Мы и время», у якой каменціруецца навагодняе прывітанне С. Шушкевіча беларускаму народу: «Как только язык повернулся у этого господина заявить, что «распад Союза не повлек катастрофу, которую предсказывали присяжные оракулы»... Более совестливый человек от срама сбежал бы в самый дальний монастырь грех свой вискулевский замаливать. А этот на тэлеэкране витийствует. А разве не лицемерие, что хвалебная ода второй годовщине образования СНГ была пропета за несколько минут до закрытия «прозрачных» границ с Украиной и за три дня до создання содружества республик Средней Азии и Казахстана? О первом событии профессор Шушкевич безусловно знал, о втором знать был обязан. Однако скрыл от народа правду. Не побоялся даже того, что петух за ложь в темечко клюнуть может». Вось і дажылі мы да «свабоды» слова...

Версія

Дождж пасярод зімы – гэта тое ж, што і сьнег пасярод лета. Аднолькава непрыемна, аднолькава непатрэбна. Калі, нарэшце, зразумее гэта дождж?

Апофрыкі

Гедымін, добрая душа, прыйшоў неяк да Міндоўга без запросінаў і, убачыўшы, што ён сядзіць адзін, падкраўся ціхенька ззаду ды як крыкне на вуха: "Га!" Міндоўг, бедалага, як падскочыць! З таго часу і неўзлюбілі яны адзін аднога. І ў застольлях Міндоўг, бывала, казаў: "Гедымін, добрая душа, але надта ж голас паскудны мае".

***

Міндоўг, бедалага, выехаў неяк са сваёю дружынаю ў недалёкі лясок на невялікі пікнічок. Толькі селі яны ля вогнішча, чакаючы, покуль дзік засмажыцца, як адкуль ні вазьміся Вітаўт зь дзецьмі прыязджае. Слова за слова – і пабіліся князі. Міндоўг, адбегшы, крыкнуў Вітаўту: "Дзіка ня еш, я яго атруціў!" Але Вітаўт зь дзецьмі не паслухаўся яго, зьелі яны дзіка і дружыну Міндоўга накармілі. Вось тады Міндоўг, бедалага, і вымушаны быў зьбегчы з Наваградка. Ад сораму.

Піліпікі

Піліп пісаў ліст бацькам у іншы горад. І так яму захацелася замест кропкі ў канцы апошняга сказа паставіць коску, што ён ня вытрымаў і паставіў.

А потым доўга сядзеў і думаў: што б гэта яшчэ дапісаць?

Так, не прыдумаўшы нічога, паслаў ліст з коскай у канцы.

Праз тыдзень, зь лістом у руках, да Піліпа прыехаў бацька – школьны настаўнік.

– Сынок, – абрадавана сказаў ён, убачыўшы Піліпа, – а мы з маці падумалі, што цябе забілі...

– З-за коскі, – здагадаўся Піліп.

– З-за яе, заразы, – і бацька стаў расшпільваць і вымаць са штаноў папругу.

16 студзеня

Дарэмна я абмежаваў сябе адною староначкаю дзёньніка. Амаль кожны дзень не ўціскаюся ў яе. Як учора, дарэчы. І думкі атрымліваюцца абарванымі, каструбаватымі. Толькі, здаецца, расьпісаўся, а ўжо і старонка скончылася. Калі дапішу гэты дзёньнік, то новы пачну (калі пачну) беспамерны.

Сёньня якраз дзень быў шматпадзейны, і многа чаго можна было і запісаць. Па-першае, разам з Грышам – братам жонкі, які гасьцюе ў нас ужо трэці дзень, – схадзілі ў майстэрню да П. Б. Шмат разоў зь ім сустракаўся раней, бачыў карціны, але ўсё было неяк мімаходзь, і як Мастака я яго адкрыў для сябе сёньня. Ёсьць у яго ўсё: талент, працавітасьць і галава для таго, каб стаць сапраўдным Мастаком.

Яшчэ сёньня схадзілі разам з Акулінымі ў РДДТ імя Горкага на спектакль. Была прэм'ера – "Амфітрыён". Ніжэй сярэдняга. Адна толькі выснова: трэба часьцей бываць у тэатры, а то за апошнія паўтары гады схадзілі мы першы раз.

Кола Дзён. Падзея тыдня

– у Вільні аднавіла сваю дзейнасць забароненае польскімі ўладамі ў 1937 годзе Таварыства беларускай школы. Старшынёй таварыства абрана Лілея Плыгаўка. «ЛіМ» спадзяецца, што беларускі ўрад дапаможа таварыству акрыяць і стаць на ногі, забяспечыць беларускамоўныя школы і класы, якія будуць створаны на этнічна беларускіх землях, падручнікамі і дапаможнаю літаратураю, як гэта робіць урад літоўскі ў дачыненні да сваіх суайчыннікаў.

Версія

Кропля дажду стукнула ў вакно і разьбілася. Гук растаў гэтак раптоўна, як узьнік: "Тук!" Захацелася пачуць яшчэ і яшчэ: "Тук! Тук! Тук!.." Але стаяла ціша. І тады я здагадаўся: то была не дажджынка, то быў жук, які прыляцеў на сьвятло: "Тук". Я вызірнуў у вакно і ўспомніў, убачыўшы,

што на вуліцы цяпер зіма. Так і засталося для мяне таямніцай, хто ж гэта стукаў у вакно.

Апофрыкі

Вітаўт зь дзецьмі часта езьдзіў на паляваньні. Бывала, гоняць яны лася альбо зубра, дык Вітаўт абгоніць усіх і сам падстрэліць яго хоча. І амаль кожны раз яму гэта ўдавалася, бо ўсе, нават дзеці, спецыяльна прыпыняліся і прапускалі яго наперад. А Вітаўт радуецца потым, як дзіця, і дзяцей сваіх ушчувае: “Эх вы, такія-сякія…”, маўляў, няўмекі…

***

Альгерд, сама шчырасьць, любіў падарожнічаць інкогніта, як робяць у прыпавесьцях ды легендах з показкамі ўсе кіраўнікі дзяржаваў – цары, каралі, шахі ды падзішахі, а таксама імператары ды іншае начальства. Апранецца ён у старца, возьме ліру ды йдзе ў бліжэйшую ад замка вёску нібыта міласціну прасіць. Сялянам так абрыдла расказваць яму, як добра яны пад ім жывуць,і сухары загадзя сушыць, што вырашылі яны яму на ўскрайку сяла хату паставіць. “Жыві, – кажуць, – тут і не старцуй болей”. На гэтым і скончыліся “таемныя” вандроўкі Альгерда, бо ў замку ўсё ж жыць значна лепей.

***

Кастусь Астрожскі, мілы чалавек, сабраўся быў у паход чарговы па славу. Выйшаў ён у двор і скіраваўся да стайні. І тут яму дарогу кот перабег. Чорны-чорны. Спыніўся спадар Кастусь, пастаяў, а потым вярнуўся назад. “Беражонага Бог беражэ, – падумаў ён. – Старыя людзі кажуць, што не да дабра, калі табе кот дарогу перад вялікай дарогай перабягае. Ды яшчэ чорны. Не, пабуду я лепей дома. А слава? Што слава… Слава ня кот: далёка не ўцячэ”.

Піліпікі

“Што дазволена Юпітэру, – падумаў Піліп, – тое дазволена і мне, бо калі я сярдую, то найлепшы сродак для мяне ахаладзіцца – папіць піўка”, – з гэтымі думкамі ён расчыніў жончын вацок і дастаў пяцёрку. Расчынены вацок нагадаў жончын рот у немым крыку. І Піліп паклаў грошы назад.

17 студзеня

Страшна стомлены. Галава гудзе, як высакавольтны слуп. А, здаецца, нічога і не рабіў. Зараз вось, нарэшце, закончыў правіць (дакладней – заклейваць абдрукоўкі, бо ўласна правак якраз і няшмат) рукапіс. У. Рубанаў абышоўся зь ім вельмі ашчадна і надзіва прыхільна. Сказаў, што кніга яму спадабалася,і ўзяўся пісаць прадмоўку.

Не чакаў ад яго такой рэакцыі. Бо ведаю па публікацыях у "ЛіМе" і "Маладосьці", што тыя, хто больш за мяне хлебануў застою, звычайна вельмі крытычна ставяцца да маіх "спроб пяра ў авангардзе".

А тым больш – старэйшыя. Яны альбо не разумеюць таго, што я пішу, альбо не прымаюць, альбо разумеючы і прымаючы, у лепшым выпадку робяць выгляд, што не заўважылі, а ў горшым, калі дадуць волю зайздрасьці, могуць і добра патаптаць.

Я, праўда, нічога гэтага не баюся. Я ўпэўнены ў тым, што раблю, я ведаю, што пішу не для масаў, а для падрыхтаванага, "начытанага" чытача. І вельмі рады, калі знаходжу разуменьне.

Кола Дзён. Неверагоднасць тыдня

– ужо сёлета пачне эксперыментальную здабычу золата на Беларусі навукова-даследчае геалагічнае прадпрыемства «БелГЕА». Пра гэта гаварылася на шостых штогадовых чытаннях, прысвечаных памяці прафесара Канстанціна Лукашэвіча, якія адбыліся ў Акадэміі навук Беларусі. У перспектыве – стварэнне акцыянернага таварыства па здабычы на Беларусі тытану, кобальту, цырконію...

Версія

Ліхтар мігаў адным вокам на вуліцу, на дарогу, на прыпынак, на бліжэйшыя дамы. Цяжка было яму аднаму, хоць і не стары быў ён яшчэ, але бачыў не далёка. Было позна, людзі ўжо спалі, і адчуваньне сваёй непатрэбнасьці мучыла ліхтар, падкідвала яму думкі пра самагубства.

Ліхтар агледзеў сваё небагатае, невялікае, сумнае і соннае навакольле і горка ўздыхнуў. Жыцьцё для яго было пачарговым паміраньнем і нараджэньнем, бо з заменаю лямпачкі зьмяняўся і ён, зьмяняўся і ягоны характар: быў ён то вясёлым, яркім, то, як зараз, цьмяным і сумным. Але нават у лепшыя свае часы ўсё роўна быў ён нікому непатрэбным. І гэтак устыла ліхтару ягонае жыцьцё, што гатовы ён быў кінуць гэтую працу і пайсьці ў белы сьвет. Каб заўтра ранкам, а тым больш вечарам, людзі, нарэшце, адчулі, як не хапае ім яго, ліхтара, і потым – не мітусіліся каля яго ў сваіх клопатах, а хоць зрэдку заўважалі і з удзячнасьцю думалі...

Апофрыкі

Гедымін, добрая душа, пабудаваў замак. Зь вежаю. Ня тое каб высокаю – любая страла пераляціць, – але і ня нізкаю. Прыехаў да яго Ягайла, які вельмі любіў дзічкі: грушы-гнілкі, вежу паглядзець, а можа, і для сябе што пераняць. Паглядзеў на гару высокую, на якой вежа стаяла, махнуў рукою ды дахаты вярнуўся. "Маючы такую гару, – казаў ён потым, – я б хіба лазьню драўляную там паставіў, бо які дурань на яе палезе…"

Піліпікі

Піліп напісаў верш. Дакладней – верш напісаўся сам у галаве Піліпа. Вось першыя два радкі:

Як кропля вады, што падае долу,
я гэтак імкнуся з-за кратаў на волю.

Нешта ў іх Піліпу не падабалася.
Ён прагнаў гэтыя радкі ў галаве колькі
разоў. І раптам да яго дайшло: прычым
тут краты, прычым тут турма і воля?
Я ж і цяпер на волі, я ні разу ня быў
у турме, а складаю верш пра абы што.
І зразумеў Піліп: ніколі яму ня быць
паэтам. Бо складаюцца ў яго вершы не
пра тое, што было і ёсьць,
а выдумвае ён нейкую няпраўду
пра сябе ды іншых. Бо захацелася яму
раптам напісаць пра каханьне.
Ужо і радок першы склаўся: "Пастой,
каханая, пастой..." Якая каханая?
Якое каханьне? Гэта ж як убачыць
жонка паперу з тымі вершамі,
дык заб'е!

"Не, ніколі мне ня быць паэтам..." – горка падумаў Піліп і ня стаў запісваць свае вершы.

18 студзеня

Учора зноў злавіў сябе на думцы, што дарэмна абмежаваў сябе староначкай тэксту. Сёньня ўжо цяжка паўтарыць, што думалася потым, калі я абарваў сябе на паўсказе, але памятаю, што падумаў я пра П. Б. У яго, у мастака, тое, пра што я пішу (гавару лепш, але няпраўда) нагляднеей. Ён таксама ідзе сваім шляхам, які многім не падабаецца, які большасьць не разумее і зь першага погляду ягоныя карціны прымае за мазьню нейкую. А гэта і ёсьць жывапіс, гульня фарбамі, пры гэтым – ніводнага мазка выпадковага. Усё выверана. Але для большасьці гэта – прымітывізм: "Хэ, і я ж гэтак намалюю..." – думае ці ня кожны. "Э не, хлопцы, – сказаў бы я, – каб гэтак маляваць, трэба спачатку навучыцца маляваць з гэтакай дакладнасьцю, як Шышкін – прыроду, Ге – партрэты..." і г. д. Усё геніяльнае простае. Знешне простае. Вельмі простыя карціны ў Шагала, Пікасо, Гагена ды і Ван Гога. Я ўжо не кажу пра сучасных авангардыстаў... І тым ня менш... Можа быць, я не зусім удалы прыклад узяў – зь Пецевым жывапісам, а можа, і наадварот – удалы. І ён, і я практычна толькі пачынаем. І працуем прыблізна ў адным ключы. Толькі ён фарбамі, я – словам. Мы не зусім авангардысты, але ўжо і не сацрэалісты... Зноў не ўмяшчаюся ў стар.

Версія

Два возеры – як два блакітныя вокі – блішчэлі наперадзе. Калі прыкінуць на мясцовасьці, то я стаяў зараз на носе. За мною засталося самае

Кола Дзён. Адметнасць тыдня

– з 18 студзеня прадпрыемствам гандлю забаронена праводзіць несанкцыянаваны абмен расійскіх рублёў на разліковыя білеты Нацыянальнага банка Беларусі. Для такога абмену ва ўсіх гарадах Беларусі адкрыты спецыяльныя пункты, і праводзіць гэтыя аперацыі цяпер можна толькі тут. Урад рэспублікі забараніў вываз беларускіх грошай за межы краіны. З сабою можна ўзяць суму не большую за тры мінімальныя аклады, пры ўмове, што грошы за межамі Беларусі не будуць абменены. Расійскія рублі можна вывозіць вольна, у неабмежаванай колькасці.

страшнае – рот. Ледзь ня подбегам – з пакатай гары-носа ісьці было лёгка – пакрочыў я ўніз да азёраў... Чалавек ляжаў тварам дагары і назіраў, як на небе павольна ляцелі гусі зь недалёкіх азёраў. Па ягоным носе поўз да вачэй мураш.

Апофрыкі

Вітаўт зь дзецьмі любіў наладжваць балі. Назапрашае гасьцей з усіх канцоў Літвы, і некалькі дзён запар гуляюць яны ў яго, п'юць, ядуць, таньчаць. А гаспадар ходзіць задаволены між гасьцей і ўсьміхаецца сам сабе пра нешта. Так ніхто дагэтуль і ня ведае, пра што ён усьміхаўся.

Піліпікі

“Эх, злавіць бы залатую рыбку, – марыў Піліп, – што б я тады ў яе папрасіў? А папрасіў бы я ў яе... што б я ў яе папрасіў? Шмат бы чаго папрасіў. Найперш папрасіў бы... што б я ў яе папрасіў? Ну, вядома... не, ад людзей сорамна будзе, калі даведаюцца. Ніколі не даведаюцца? Як жа – не даведаюцца. Не было – і раптам ёсьць. Адкуль узялося? Вядома, даведаюцца... Папрашу лепш я... Што я папрашу лепш, – думаў Піліп, – лепш я папрашу... Не, паўтараць памылак дзеда з казкі я ня буду. Лепш я адпушчу рыбку адразу назад у ваду, нічога не папрасіўшы. Бо дармовае – яно як украдзенае. А ад украдзенага не таўсьцеюць, а худзеюць, як у іншай казцы пішацца. Лепш адпушчу рыбку і жонцы анічога не скажу. Інакш замучыць – усе яны падобныя, бабы: і ў казках, і ў жыцьці. Не, я і лавіць тую рыбку ня буду, – вырашыў Піліп урэшце. Навошта яна мне? Ніякай зь яе карысьці. Адна шкода... І думаць пра яе ня варта. Цьфу ты, прычапілася! – замахаў рукамі Піліп. Ня буду я цябе лавіць! Не пайду! Не хачу!.. Ды і не бывае вас, залатых рыбак, у сапраўднасьці. Толькі ў казках. У чужых казках. Вось навязалася, навалач... Прашу цябе, адвяжыся! Гэта першае, другое і трэцяе мае жаданьні...” – Піліп абхапіў галаву рукамі і заціх над сталом, на якім паўпатэльні займаў смажаны карась.

19 студзеня

Выпадкова набыў кнігу Ш. Карагулы “Прорыв к творчеству: ваше сверхчувственное восприятие”, у якой ёсьць разьдзельчык пра энергетычных ”вампіраў”. Прачытаў і ўпэўніўся: тое, да чаго я сам дайшоў крыху раней, і сапраўды існуе. Ня ведаю, ці стаў я і ці змагу наогул стаць “вампірам”, аднак тое, што для многіх быў я акумулятарам, крыніцаю энергіі, зь якое чэрпалі без абмежаваньняў і пакутаў сумленьня, – факт. Мажліва, часам самі не падазраючы пра гэта. Раней, у застольлях, я адмаўляючыся ад гарэлкі, казаў: “Чым болей я п’ю, тым болей сумным і нецікавым раблюся”. Я ня піў, але ўсё роўна рабіўся сумным, аслабелым... Цяпер зразумела чаму. Аднак абароны ад гэтага пакуль не знайшоў. Але – до! До пра гэта.

Сёньня занёс рукапіс у выдавецтва. Мажліва, кніга выйдзе ў 1994 г. Але гарантый ніякіх. А яна ўжо маральна састарэла. Якая херовая ўсё ж у нас сістэма: здаў я кнігу ў канцы 1991 г., толькі ў пачатку 1993 г. яна гатова да друку, а будзе надрукавана ў 1994 г. Каму яна тады трэба? Мне ж яна такая ўжо сёньня ня трэба. Бо я сам – іншы. Я за тры гады моцна зьмяніўся. Тым больш, у кнізе сабраныя ў асноўным старыя аповеды, якія шкада выкідваць, інакш загінуць яны, так і не пабачыўшы сьвету...

Версія

У дыпламаце жыў дух гаспадара. Не ў прамым сэнсе – у пераносным. Гэткі беспарадак, як у ягонай галаве, быў і тут. Але ў дыплама-

Кола Дзён. Сустрэча тыдня

– у дзень адкрыцця сесіі С. Шушкевіч сустрэўся з групай калгаснікаў і рабочых саўгасаў Мінскай вобласці, якія прыехалі на плошчу Незалежнасці пратэставаць супраць прыняцця закона аб прыватнай уласнасці на зямлю, супраць, як патлумачылі ім кіраўнікі гаспадарак, якія і арганізавалі аўтобусны ваяж у Мінск, роспуску калгасаў. Тым часам у Мінску ў Доме літаратара сабраліся фермеры. У іх – свае праблемы.

Кола Дзён. Навіна тыдня

– міністра замежных спраў Беларусі П. Краўчанку прыняў у Парыжы Генеральны сакратар ААН Бутрас Галі. У час сустрэчы былі абмеркаваны праблемы Чарнобыля і пытанні ўмацавання адносінаў паміж Беларуссю і ААН. П. Краўчанка запрасіў Бутраса Галі наведаць Беларусь.

це ўсё было наглядна, у адрозьненьне ад навечна зачыненай галавы. Гаспадар, здаецца, разумеў гэта, бо расчыняў заўсёды дыпламат трошкі-трошкі, каб прасунуць у шчыліну руку і намацаць патрэбную рэч. Аднак даставалася заўсёды ня тое: замест асадкі – аловак, замест алоўка – невядома адкуль узяты цьвік, замест кнігі – нататнік, замест нататніка – сухар і г. д. Прыблізна тое ж рабілася і ў галаве гаспадара, варта яму было пачаць гаварыць. Словы выляталі выпадковыя, думкі выказваліся не да месца. Гаспадар ня быў ідыётам, ён разумеў усё і заўжды пачуваў сябе ніякавата. Як, дарэчы, і дыпламат. Навесьці парадак у дыпламаце было проста. Наглядна. Але ці рэальна? Бо, каб зьмяніць нешта ў дыпламаце, гаспадару трэба было зьмяніцца самому, пачаць, як кажуць, зь сябе. Інакш любы парадак, наведзены ў дыпламаце гаспадаром, у галаве якога беспарадак, быў бы тым самым беспарадкам. Але пачынаць зь сябе гаспадар не хацеў – цяжка гэта, а толькі час ад часу наводзіў беспарадак у дыпламаце, у якім і жыў ягоны дух.

Апофрыкі

Кейстут, сама сьціпласьць, які на балях напіваўся бы цюцька, выбраў сабе нявесту ў адным заможным родзе. Дзеўка была нішто сабе, і, натуральна, Кейстут, не адкладваючы справу ў доўгую скрыню, заслаў да яе сватоў. У чаканьні іх ён праходжваўся ўзад-уперад па камінным зале свайго замка. Раптам ускочыў у залу Радзівіл (каторы ня Чорны), танклявы такі хлопчык, і з парога: “Дзядзька Кейстут, Міндоўг вам бочку віна ліцьвінскага даслаў!” Кейстут, сама сьціпласьць, да бочкі – і толькі праз тры тыдні змог прамармытаць ён пару слоў: “Ці ёсьць віно яшчэ?” А пра вясельле забыўся…

Так і не ажаніўся ён тады: каму трэба муж п’яніца?

Пілiпікі

Да працы Піліп дабіраўся на аўтобусе. Кожны ранак уціснуцца ў ягоная чэрава было праблемай. І Піліп вырашыў хадзіць пешкам: а што там – усяго дзьве гадзіны хады. З часам яго сталі пазнаваць кіроўцы аўтобусаў, і нават сігналілі яму пры сустрэчы. А потым пачалі спыняцца і падбіраць яго на дарозе. Піліп як пан уваходзіў у пярэднія дзьверы, і ўсе пасажыры жахаліся: кантралёр зайшоў. Затое як потым прыемна было бачыць ім, што Піліп прабівае квіток: свой, значыць.
І расьцякалася па аўтобусе Павага, ад якой Піліп толькі чырванеў, быццам чаплялі яму зорку Героя.

20 студзеня

Вечар. Сяджу адзін у рэдакцыі “ЛіМа”. Начую сёньня тут – мая чарга вартаваць абсталяваньне. Цішыня...

Сёньня быў вельмі насычаны падзеямі дзень. Толькі што ад мяне пайшоў Вітаўт Чаропка. Сядзелі за гарбатай і размаўлялі. Дакладней, гаварыў больш ён – я слухаў. Вітаўт расказваў пра сваю кнігу, якая хутка выйдзе ў “Полымі” – “Імя ў летапісе”. Паказваў ілюстрацыі. Размова грунтавалася на гэтым, аднак гаварылі мы пра ўсё – ад гісторыі да сучаснасьці, ад ролі асобы ў гісторыі да адданасьці гэтай асобы ідэі (у нас – ідэі Адраджэньня Бацькаўшчыны). Цікавы хлопец. Адданы справе. Начытаны. Паболей бы нам такіх. Зноў жа, сьціскае мяне аб’ём дзёньніка – адна староначка. Не магу разгарнуцца, каб падрабязьней напісаць пра нашую гутарку і пра Чаропку. А сустрэў я яго ў Пеці Багданава, да якога зайшоў пасьля вячэры ў “Хвілінцы”. І там была цікавая размова. Пазнаёміўся з аднамайстэрнікам Пеці – Алесем Філіповічам. Думаю зараз: мо не загінем мы, покуль ёсьць такія хлопцы, такія беларусы, як Чаропка, Багданаў, Філіповіч...

Кола Дзён. Сюрпрыз тыдня

– Брэсцкі аэрапорт стаў... міжнародным. Дакладней, не аэрапорт, а неба над Брэстам. Літоўскі ўрад запатрабаваў ад краін СНД, найперш, вядома, ад Расіі, плаціць валютай за выкарыстанне паветранае прасторы, і авіятары СНД знайшлі сякеру пад лаўкай – стварылі новы «калідор» на Захад над Беларусcю. Беларусы зноў «выручылі», мала думаючы пра вынікі гэтай акцыі. Тым часам аэрапорт у Віцебску закрыты зусім. Няма газы і адменены два апошнія рэйсы: у сталіцу СНД і былую сталіцу СССР.

Кола Дзён. «Публікацыя» тыдня

– артыкул народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь Леаніда Прывалава і палкоўніка запасу Васілія Баранава ў «Народнай газеце» пад назвай «Беларусь, Россия, БНФ» (20 студзеня). Адказваючы на стрыманы і аргументаваны артыкул З. Пазняка «Беларусь, Расія, СНД» (14 студзеня), аўтары, абвінавачваючы лідара БНФ у аплёўванні Расіі, гэтак аплявалі Беларусь, яе гісторыю і народ, што застаецца толькі сказаць дзякуй «Народнай газеце» за плюралізм і «свабоду» слова. Разумеем «усю цяжкасць» умоў, у якія пастаўлена сваім статусам «Народная газета», але ці не час рэдакцыі вызначыцца і займець сваю лінію, а не «пляваць» пачаргова направа і налева?

Версія

У адзіноце думалася ні пра што. Думалася пра цішыню ў пакоі, якая нішто. Думалася пра тое, што вакол мяне зараз лётаюць духі-душы тых, хто бываў альбо жыў у гэтым пакоі да мяне. Я нават, здавалася, адчуваў, як лётаюць яны нада мною, і быццам бы бачыў іх цені краем вока, калі нахіляў галаву над паперай. Але і яны, гэтыя духі-душы, таксама нішто. У адзіноце думалася пра адзіноту, пра тое, што цяпер у пустых калідорах і пакоях нікога няма, адзін я сяджу тут і думаю пра маю адзіноту ў гэтым пакоі, у гэтым доме, у гэтым сьвеце. Я сам сябе падманваў, бо варта мне было падумаць пра маю адзіноту па-за гэтым домам, у сьвеце, як прыгадваліся жонка і сын, якія чакаюць мяне, бацька і маці, якім я трэба і якія гэтак часта мяне ўспамінаюць, сёстры, да якіх я гэтак даўно ня езьдзіў... Але ўсе яны недзе далёка, а тут я адзін. Тут пуста і адзінока. Тут думаецца пра ўсё – а значыць, пра нішто. Тут думаецца толькі пра нішто... ні пра што...

Апофрыкі

Калі Кейстут, сама сьціпласьць, у сьвежаскаваных латах выйшаў у двор, на яго накінуўся сабака. Хітры, падла: усё падскокваў і хацеў укусіць не абароненыя жалезам, аголеныя мясьціны. Кейстут – адбіваўся-адбіваўся ад яго, а потым узмахнуў мячом і перасек сабаку напалам: адныя ногі ляжаць тут, другія там. Кейстут, сама сьціпласьць, зірнуў на два паўсабакі ды як закрычыць у жаху: "Ма-ма!" Крыві баяўся, аказваецца.

Піліпікі

Прачытаў Піліп кнігу,
загарнуў і стаў думаць
пра яе. Ну што – цікавая,
можна жонцы параіць
пачытаць. Ёй спадабаецца,
асабліва мейсца, дзе ён
яе ў стозе заціснуў,
а яе маці падпільнавала
і ў самы непасрэдны
момант як падбяжыць...
Піліп усьміхнуўся
і падумаў: "Добрая кніга,
жызьненая. Мала зараз
такіх. Хай жонка пачытае
і парадуецца чужому
жыцьцю... Парадуецца?
А вось і не. Яна са сваім
параўнае. І костачкі ўсе
потым перагрызе...
Не, схаваю я гэтую кнігу,
каб ніколі не знайшла.
Няхай чытае лепш
сынаў падручнік па рускай
літаратуры для 3-га класа.
І хай радуецца, што жыве
зараз і са мною".

21 студзеня

Ноч была цяжкая, амаль ня спаў. Ня мог заснуць, круціўся на падлозе ля батарэі да самага прыходу Алеся Марціновіча. А дзень выдаўся яшчэ цяжэйшы. І няхай бы былі для гэтага падставы, якія вытлумачаліся цьвярозым розумам, а то проста шызею, калі зараз прыгадваю.
Тое, як паводзіць сябе ўвесь апошні год А., ня ўкладваецца ні ў якія рамкі. І не паддаецца разуменьню. Прычынай для яго звальненьня магло б стаць тое, што вычвараў ён апошнія месяцы, покуль не патрапіў лячыцца ў Навінкі ад алкагалізму. Але М. С. цягнуў: думаў, ачнецца хлопец, шкада – малады, сям'я, двое дзяцей... А ён далей – горш.
На работу зусім махнуў рукою. І ў тым, што "ЛіМ" за апошнія месяцы практычна зруйнаваны, віна найперш яго. Бо ў мяне самога часам рукі апускаліся, рабіць нічога не хацелася, гледзячы, як гуляе ён.
І вось сёньня разьвязка. Яму трэба было здаць матэрыял у нумар. Гадзіна дня – яго няма. Другая – няма. І ні слуху, ні духу. Праўда, гэтак было кожны раз, калі ён нешта пісаў у "ЛіМ". Але тут я ня вытрымаў. Кажу: "Колькі можна зьдзекавацца?" І заслаў іншы матэрыял, не чакаючы яго. Гэта, калі нарэшце прыйшоў, яго і ўзьвяло: сеў і напісаў заяву на звальненьне. Зрабіў тое, што ад яго і чакалі.
Цяпер атрымліваецца, што звальняецца ён з-за мяне. (Хоць тыя, хто ведае праўду, толькі ўсьміхнуцца.) Але ён і тут перайграў М. С. А ўдар прыйшоўся на мяне. Гэткага сьвінства я ад яго не чакаў. Але ці не зашмат увагі ўдзяляю я таму, што мінецца і забудзецца?

Кола Дзён. Здарэнне тыдня

– у Магілёве, у адной са сталовых, выяўлена фальшывая 100-рублёвая купюра Нацыянальнага банка Беларусі. Самадзейны мастак намаляваў яе фламастарамі на белай паперы. Калі беларускія грошы падрабляюць – значыць, яны сталі патрэбнымі.

Кола Дзён. Кур'ёз тыдня

– па жаданні жыхароў Докшыцкі раён жыве па сваім мясцовым часе (былым летнім), паведаміла «Чырвоная змена». Суверэнізацыя, як і прадказвалі вядомыя палітыкі і палітолагі, пашыраецца.

Версія

а) Я пазнаёміўся са сваім ценем. Аказваецца, яго завуць гэтаксама, як і мяне. Праўда, я больш зьдзівіўся б, каб яго звалі неяк іначай... Ды ўсё роўна нязвыкла: ён Алесь і я Алесь.

Прозьвішча я не пасьпеў спытаццца, бо зайшло за хмару сонца і цень растаў, зьнік, нават не разьвітаўшыся. Зусім як я.

Амаль тыдзень ішоў дождж. Потым яшчэ пару дзён было хмарна. І, нарэшце зноў заняло неба сонца. Зьявіўся і мой цень. Але колькі я зь ім ні загаворваў – ён маўчаў. І наогул, не было ў ім ні знаку той незалежнасьці, што была раней. Ён моўчкі паўтараў усе мае рухі, быццам зьдзекаваўся зь мяне.

І тады я сам зайшоў у цень вялізнага будынка і растварыў свой цень у ягоным цені.

б) Кропка адліку – хмара, што схавала сонца.

Пакупніка на мой цень не знайшлося.

Мо таму, што я не гаспадар яго. Ён ня можа зьявіцца тады, калі я хачу, і зьнікнуць тады, калі я загадаю. Хмара і сонца большыя гаспадары над ім, чым я.

Але нешта магу і я.

Ён паўтарае мае рухі, а ня я яго. Ён ідзе ўсьлед за мною, а ня я за ім. Ён зьнікае, а я не. Ён зьнікне раней, чым я. Альбо зьнікнем мы разам. Але ня я раней за яго.

Кропка адліку – хмара, што схавала сонца.

Я застаўся адзін. І якая мне розьніца, ёсьць недзе тут, паблізу, мой

Пілiпікі

Сеў Піліп на лаўку перад домам і стаў чакаць, хто першым каля яго пройдзе: жанчына альбо мужчына, дзяўчынка альбо хлопчык. Хвіліна мінула, другая, дзясятая... а ніхто з пад’езда ня выйшаў, ніхто ў пад’езд не ўвайшоў. І тады Піліп пакінуў сябе сядзець на лаўцы і зайшоў у пад’езд. А потым выйшаў зь яго і пайшоў міма сябе. “Першым прайшоў мужчына”, – канстатаваў Піліп і сеў каля сябе на лаўку.

цень, альбо няма яго зусім. Я ведаю, я ўпэўнены: пакуль буду я – будзе і ён. Пакуль будзе ён – мой цень, – буду і я. Нас двое на гэтай зямлі.

Цень хмары на глебе складаецца з тысячаў іншых ценяў. Але хмара – толькі кропка адліку.

Версія

Я пазнаёміўся са сваім ценем. Аказваецца, яго завуць гэтаксама, як і мяне. Праўда, я больш здзівіўся, каб яго звалі неяк інакш, аднак усё роўна дзіўна: ён Алесь і я Алесь. Яго прозвішча я не паспеў спытаць, бо зайшло за хмару сонца і ён зьнік нават не развітаўшыся. Зусім як я.

Амаль тыдзень ішоў дождж. Потым неяк параў дзён было хмарна. І, нарэшце, зноў зазяла неба сонца. Зьявіўся і мой цень. Але колькі я зь ім не загаварваў – ён маўчаў. І наогул, не было ў ім ні знаку той незалежнасьці, што была раней. Ён толькі паўтараў усе мае рухі, быццам зьдзекаваўся зь мяне. І тады я сам зайшоў у цень ад вялізнага будынка і растварыў свой цень у гэтым цені.

21.01.93.

Апофрыкі

Гедымін, добрая душа,
зьняў неяк на ноч пакой
у замку Міндоўга, бедалагі.
Нядорага: усяго дзясятак
талераў выкінуў, але затое
Міндоўга выручаў: той якраз
зьбіраўся ў Маскву
Ілжэдзьмітрыя везьці.
І грошы яму во як былі
патрэбныя.

22 студзеня

Усё-ткі я надумаў уступіць у Саюз пісьменьнікаў. Хоць гэта для мяне было ня простым рашэньнем. Апошнім часам гэтая арганізацыя сябе моцна скампраметавала.
Але ўступаць буду, як гэта ні горка казаць, па прычынах далёкіх ад творчых... Ну прыстасаванец я. І гэткім робіць мяне дзяржава. Уступаць буду, спадзеючыся, што ўдасца з часам праз Саюз атрымаць кватэру. І толькі.
Мне трыццаць тры, а я ня маю нармалёвага жыльля, дзе можна было б папрацаваць. Хоць надзея на Саюз невялікая. Жыльлё атрымліваюць у асноўным дзеткі пісьменьнікаў. Прыкра. Між тым Акулін з двума дзецьмі, Куртаніч, Наварыч, Казлоў, Скобла ды інш. здымаюць кватэры, плоцяць аграмадныя грошы. А студэнты, дзеткі пісьменьнікаў, у 20 гадоў атрымліваюць кватэры. За што? Але, зноў жа, херня ўсё гэта. Галоўнае – працаваць і ня думаць пра тое, што Бог ня роўна дзеле... Хоць, як ня думаць...

Рэкамендацыі папрасіў у Алеся Жука, Янкі Сіпакова і Генрыха Далідовіча. У першы раз меў, хай і нядоўгую, гутарку з Г. Д. Што мне падабаецца ў людзях, дык гэта шчырасьць. Уражаньне такога чалавека пакідае і Г. Д. Хоць разумею, у сёньняшніх умовах захаваць душу ў чысьціні, ня здрадзіць сабе вельмі цяжка.
Яму, мне здаецца, гэта ўдаецца.

Кола Дзён. Уступ

Палітычнае жыццё ў краіне на гэтым тыдні развівалася па нарастаючай. 19-га студзеня распачала работу чарговая сесія Вярхоўнага Савета Беларусі. 20-га адбылася сустрэча міністраў замежных спраў краін СНД, 21-га – сустрэліся міністры абароны. Сёння, 22-га студзеня, адбудзецца нарэшце сустрэча кіраўнікоў дзяржаў СНД, якая некалькі разоў адкладалася. Такі насычаны падзеямі тыдзень не дазволіў не толькі кіраўнікам Беларусі С. Шушкевічу і В. Кебічу, але і кіраўнікам іншых дзяржаў Садружнасці прыняць удзел у цырымоніі з выпадку ўступлення на прэзідэнцкую пасаду Біла Клінтана. У Вашынгтон на ўрачыстасці паехаў каардынатар рабочай групы СНД Іван Каратчэня. Маўр зрабіў сваю справу, маўр можа... адпачываць.

Кола Дзён. Падзея тыдня

– без сенсацыі, па агульным прызнанні, закончылася сустрэча лідараў дзяржаў СНД у Мінску. Статут СНД падпісалі сем дзяржаў з дзесяці.

Версіі

Прас прыгнуўся і лёгка-лёгка папоўз па кашулі. Спыніўся, прысеў, трошкі падумаў, што далей рабіць, і павярнуў назад. На адпрасаваную роўнядзь кашулі села муха. Прас скіраваўся да яе і спыніўся: муха не зьлятала. Сядзела і церла пярэднімі лапкамі адна аб адну, быццам хацела перакусіць прасам. Прас не зразумеў гэтых рухаў, аднак зрабіў выгляд, што не заўважае муху, і вярнуўся да працы. А муха пасядзела яшчэ трохі і зьляцела.

***

Ішла ноч. Стамлёная.

Бо доўгая, як крук у глыбокай студні.

Усё ёй устыла.

Хацелася толькі заснуць і адпачыць-адляжацца да вечара.

Але яна йшла ды йшла. І не было ейнай хадзе канца і краю.

Месячык узышоў і зайшоў. За хмару. Зоркі разгарэліся – аж уваччу сьвярбіць. А цемрыва навакол – хоць ты ідзі, рукі наперад выцягнуўшы, каб не сутыкнуцца зь некім, каб ня ўрэзацца ў нешта. Прадзірацца праз такое цемрыва – сабе шкодзіць.

І тады я сеў пад плот. Вырашыў перачакаць. Чым кідацца ў


„22" студзеня 1993 г.

цемрыве няведама куды, чым блукаць у знаёмых удзень мясьцінах, чым разыкаваць – лепш ціха адседзецца, дачакацца сьвітанку, які абавязкова прыйдзе, які непазбежна прыйдзе.

Бо ноч сама хоча яго ня менш за нас, ня менш за мяне. Я ведаю: ноч адпачне і вернецца. Аднак за дзень я падрыхтуюся да сустрэчы зь ёю: у наступную ноч я проста лягу спаць, а ня буду блукаць у цемрыве з выцягнутымі наперад рукамі. Рукі ніколі не заменяць вачэй. Як і вочы рук. Кожнаму сваё. І ночы. І дню. І мне.

Піліпікі

Прыдумаў аднойчы Піліп показку. Пра Гарбачова... Хацеў расказаць жонцы, але перадумаў: не зразумее. Хацеў расказаць сябрам, ды пабаяўся: заложаць. Хацеў расказаць простым сустрэчным, аднак не асьмеліўся падысьці да іх: сорамна. Хацеў запісаць: асадку не знайшоў. А тут яго жонка некуды паклікала. Так і прапала показка – забылася. А шкада: як-ніяк фальклор.


Апофрыкі

Вітаўт зь дзецьмі газет не чытаў. І тэлевізар не глядзеў. Не падабаліся яму розныя тэхнічныя навінкі. Ён аддаваў перавагу дзідзе і корду. І Даўмонт, будаўнік і ваяр, яго за гэта вельмі паважаў. І ставіў у прыклад іншым.

22.01.93.

P.S. Сёньня вельмі стамлёны. Галава не „варыць". Поўны п.... Поўная страта сілаў і...розуму. Гэта п....

Апофрыкі

Вітаўт зь дзецьмі газет не чытаў. І тэлевізар не глядзеў. Не падабаліся яму розныя тэхнічныя навінкі. Ён аддаваў перавагу дзідзе і корду. Даўмонт, будаўнік і ваяр, яго за гэта вельмі паважаў. І ставіў у прыклад іншым.

P. S. Сёньня вельмі стамлёны. Галава ня “варыць”. Поўны п... Поўная страта сілаў і... розуму.

Гэта п...

23 студзеня

Падумаў, што сапраўды мой дзёньнік усё ж ня гэты, а той, які я гэтаксама пісаў (пішу) штодня: "Версіі", а яшчэ "Пілiпікі" і "Апофрыкі". Цікавая можа атрымацца рэч, калі надрукаваць як-небудзь усё разам: спачатку гэты дзёньнік, а потым "Версіі" і астатняе.

Я хацеў пісаць дзёньнік думак, аднак не атрымліваецца. Часам пішу такую херню, што сорамна перачытваць. Асабліва ўчора "расьпісаўся", ідыёт... Хацеў вырваць гэтую старонку, але перадумаў: ня варта прыхарошваць – як ёсьць, так ёсьць. А на ўчарашнім запісе, пэўна, адбіўся цяжкі мінулы тыдзень (і сёньня яшчэ не адышоў, не адпачыў). Столькі ўсяго за тыдзень накруцілася – ня дай Бог... А ў дзёньніку гэтым амаль нічога з таго няма. Але тлум той, стома і душэўная разьбітасьць бачныя якраз у "Версіях", ясьней, чым тут. Мала ўсё ж адной старонachкі для дзёньніка – нічога не ўмяшчаецца. Ня ўмею я, аказваецца, сьцісла пісаць. Хоць Г. Далідовіч якраз і крытыкаваў мяне за тое, што я часам на самых выйгрышных мясьцінах свае аповеды перарываю, што занадта коратка апісваю тыя мясьціны, дзе якраз разгарнуцца можна... Аднак аповед перапісаць можна, падкараціць альбо пашырыць. А гэтыя запісы застаюцца такімі, якія ёсьць, якімі выйшлі.

Кола Дзён. Адметнасць тыдня

– мажліва, у хуткім часе ў самым цэнтры Мінска з'явяцца вуліцы Вацлава Ластоўскага, Адама Станкевіча, князя Глеба Менскага, князя Рагвалода, княгіні Рагнеды... Гэтак прапанавала назваць вуліцы Свярдлова, Берсана, Мяснікова, Валадарскага і Урыцкага Камісія па назвах і перайменаванні вуліц і плошчаў Мінскага гарвыканкама. Канчатковы лёс назваў вырашыць неўзабаве Мінскі гарвыканкам.

Версіі

Мажліва, то быў кот. А мажліва, і котка. Хоць тое і было прынцыпова, я не надаў тады гэтаму належнай увагі і вагі. Каб ведаў я, што тая шэра-

белая ці бела-шэрая істота, якая перабегла мне дарогу, адыграе нейкую ролю ў маёй будучыні, я дагнаў бы яе і падняў хвост. Але я гэтага не зрабіў. І сёньня лягчэй укусіць сябе за локаць, чым даведацца: хто ж то быў – кот ці котка? Калі кот – “так”, калі котка – “не”. Такую паставілі мне ўмову. І я, седзячы дома, на канапе, паціху вар’яцею ад думкі – што ўсё ж сказаць ім: калі “так” – значыць, кот, калі “не” – значыць, котка. Застаецца гадаць. А калі не ўгадаю? Тады пясец. Замучыла мяне гэтая думка, хто ж то ўсё ж быў: кот альбо котка. І ніхто ў цэлым сьвеце не падкажа мне, ніхто і нішто не дапаможа, – ні чалавек, ні кніга, ні я сам...

***

– Іду я, значыць, лесам, а насустрач мне ён ідзе. Я туды, я сюды – няма куды дзецца...

– А хто ён? Ты пра каго?

– Пачакай... Думаю, адно застаецца – на дрэва. Але ж ён хутчэй за мяне залезе...

– Хто ж ён?.. Мядзьведзь? У нас?

– Не перабівай, дай даказаць. І ўцякаць няма як... Дый дагоніць ён...

– Мядзьведзь...

– Які мядзьведзь? Ты што, апупеў? Васька гэты. Я ў яго тры рублі браў зь месяц назад. Дык ён як сустрэне, так і пытае. А ў мяне ж у лесе ні капейкі няма...

Піліпікі

Гуляючы па парку, Піліп падышоў да возера. Маленькага, круглага, штучнага. У ім плавалі лебедзі і качкі. А трэба сказаць, дзень быў ветраны – не для прагулак. І ва ўсім парку ці не адзін Піліп у гэты час адпачываў. Згледзеўшы яго, лебедзі і качкі надзіва хутка, нават імкліва кінуліся да таго берага, дзе ён спыніўся. Піліп спачатку разгубіўся, агледзеўся: што за навала? А потым зразумеў: яны есьці хочуць, бо дзеткі тут заўсёды іх з рук кормяць. Качкі і лебедзі падплылі да Піліпа і сталі кружляць ля берага, нешта дзюбамі папраўляючы ў сваім пер’і. Быццам і ня хлеба прасіць падплылі, а так проста, між іншым. Надта не спадабалася гэта Піліпу, які вельмі не любіў няшчырасьці. Адвярнуўся ён ад качак і лебедзяў і павольна, з гонарам, пайшоў дахаты.

„23" студзеня 1993 г.

Падумаў, што сапраўдны мой дзённік усё ж не гэты, а той, які я гэтакім пісаў (пішу) штодня: „версіі", а яшчэ „[illegible]" і „апофрыкі". Цікавая можа атрымацца рэч, калі надрукаваць як-[illegible] усё разам: спачатку гэты дзённік, а потым „версіі" і астатняе. Я хацеў пісаць дзённік дужак, аднак не атрымліваецца. Часам пішу такую херню, што сорамна перачытваць. Асабліва ўчора „рэвізія", і г.д... Нават хацеў вырваць гэтую старонку, але перадумаў: не варта сабе прыхарошваць — які ёсць, такі ёсць. А на ўчарашнім запісе, між-на, адбіўся [illegible] тэкст (і самае яшчэ не адышоў, не адпачыў). Столькі ўсяго ж тэксту накрышылася: не дай бог... А ў дзённіку гэтым амаль нічога з таго няма. Але тым той, [illegible], і [illegible] бачыць якраз у „версіях", [illegible], тым тут. Мала ўсё ж адной старонкі для дзённіка — нічога не ўмяшчаецца. Ня ўмею я, аказваецца, сціпла пісаць. Хоць Г. Далідовіч якраз і крытыкаваў мяне за тое, што я, часам, на самых [illegible] месцах сваё апавяданне перарываю, што [illegible] коратка апісваю тыя мясціны, дзе якраз разгарнуцца можна... Аднак [illegible] перапісаць можна, [illegible], [illegible]. А гэтыя запісы застануцца такімі, якія ёсць, [illegible].

Апофрыкі

Ягайла, стары а мудры, зьняў неяк карону з галавы, прыгладзіў валасы, што яшчэ засталіся, і паклікаў да сябе пакаёўку. “Распранайся”, -- загадаў коратка і ўладна. Дзяўчына сумелася, аднак аслухацца не змагла. Пераступіўшы цераз апошнюю адзежыну, яна стала побач зь ёю, голая і вабная. Ягайла доўгім уважлівым поглядам ацаніў яе і загадаў: “Апранайся!” Дзяўчына як стаяла, так і села на падлогу: у яе не было ўжо сілаў апрануцца. І тады Ягайла падышоў да яе і…

24 студзеня

Толькі пад канец выходных пачынаю адчуваць сябе чалавекам. Галава пасьвяжэла, думкі ўюцца лёгка, нязмушана, словы падбіраюцца, знаходзяцца адразу і, здаецца, толькі сядай і пішы. Але на гадзіньніку ўжо другая гадзіна ночы, а заўтра на працу, ад адной думкі пра якую галава зноў пачынае балець... Заўважыў гэта даўно, яшчэ ў Гомелі. Там, у "Г. П." я стамляўся страшэнна. Тут, у "ЛіМе", ад пачатку было лягчэй, непараўнальна лягчэй. Таму і пісалася больш. А цяпер, калі пачалі мы пераход на кампутары, калі заварыў кашу А., – стала невыносна. (Я калі-небудзь апішу тое, што ён вычвараў, і апішу гэты подлы тыпчык подлых людзей.) На гэтым тыдні, спадзяюся, павінна ўсё нейкім чынам вырашыцца. Або-або. Зараз, цяпер, мне ўсё роўна, якім чынам выйдзе з гэтай сітуацыі М.С. Мая пазіцыя дагэтуль і зараз была самай шчырай і аб'ектыўнай – не баюся гэтага казаць. І мне няма аб чым шкадаваць. Перад Богам я стараўся быць чыстым у адносінах і з А., і з М. С. Хоць сітуацыя была і ёсьць няпростай.

Кола Дзён. Чалавек тыдня

– гімнасту, лепшаму спартсмену Беларусі 1992 года Віталю Шчэрбу, які на Алімпійскіх гульнях у Барселоне заваяваў шэсць залатых медалёў, прысуджаны прэстыжны прыз Джэсі Оуэна, як лепшаму спартсмену свету па выніках мінулага года.

Версіі

Зоркалёт павольна і плаўна, як лёгкі пялёстак адцьвілай кветкі, апускаўся на зямлю. Выглядала гэта дужа натуральна, быццам сама прырода – вецер і прыцягненьне зямлі – кіравалі ім. Уражвалі толькі памеры пялёстка: быў ён велічынёю з добры вясковы дом. Пялёстак бясшумна, мякка прытуліўся шчакою да зямлі і застыў на месцы. Зь яго ніхто ня

выйшаў. І не было відно на ім ніякіх вакенцаў-ілюмінатараў, праз якія можна было назіраць. Пялёстак паляжаў трохі, а потым лёгка, быццам зьдзьмуў яго вецер, падняўся ў паветра і пачаў павольна ўзьнімацца ў неба. Бясшумна і плаўна ён плыў па небе, хутка аддаляючыся, а потым і зусім растаў, згубіўся сярод белых хмарак.

Вось і ўсё.

***

Хто змог, хто ня змог, хто сеў, хто лёг, а хто пайшоў далей – у кожнага свая праўда, у кожнага свая доля, свая воля і свая ўпэўненасьць у сабе, свой выбар шляху, у якім нехта памыляецца і кандыбае праз горы і цясьніны, балоты і лясныя гушчары, а іншы ўсё жыцьцё перад сабою мае шырокі гасьцінец і ня пешкам ідзе, а дабіраецца на "папутках", а то і на сваім уласным лімузіне, але... (звычайна пасьля "але" са шматкроп'ем ідзе галоўная думка нейкага тэксту, але... але на гэты раз яе ня будзе, бо няўдзячная штука – выводзіць мараль з таго, што само па сабе антымаральна...)


***

Прыдумалася мне неяк назва апавяданьня: "Кумпячок з марской сьвінкі". Адразу ўбачыў сюжэт – гумарыстычны, вядома. Цалкам шызовы. У якім нічога не было пра марскую сьвінку і тым больш пра кумпячок зь яе. Думаў я, думаў, і пачалі выпадаць з гатовага апавяданьня жарцік за жарцікам, дыялог за дыялогам, сьмешны выпадак за сьмешным выпадкам. Рассыпаўся сюжэт, і засталася адна назва: "Кумпячок з марской сьвінкі".

Піліпікі

Купіў Піліп гадзіньнік.
Ня першы ў жыцьці, але,
дасьць Бог, і не апошні.
Надзеў на руку – прыгожа.
А, галоўнае, зручна.
Выйшаў з хаты – зірнуў,
колькі часу, зайшоў
у аўтобус – зірнуў,
пад'ехаў да працы – зірнуў
і г. д. А самае прыемнае –
гэта калі ў Піліпа першы
раз спыталі: "Колькі часу?"
– і ён, паважна ўзьняўшы
руку, зірнуў і адказаў...
І адчуў сябе патрэбным
чалавекам.
Значыць, не дарэмна ён
нарадзіўся, не дарэмна
жыве на сьвеце, калі
ў пэўны момант
у пэўным мейсцы
ён аказаўся патрэбным
пэўнаму чалавеку. Можа,
ён нарадзіўся, і жыў,
і гадзіньнік купіў толькі
дзеля гэтага моманту.

У рэшце рэшт мне падалося, што і яна ня новая. Што недзе некалі нешта падобнае я ўжо чытаў. Але забыўся. І зараз не прыдумляў сваё, а прыгадаў чужое. І апошняя думка мне спадабалася болей, чым назва ненапісанага аповеда.



Апофрыкі

Гедымін, добрая душа,
вырваўся неяк разам
са старым а мудрым Ягайлам
на ловы. Было тое
пад Наваградкам. Гедымін
намазаў свае стрэлы добраю
заморскаю атрутаю,
а Ягайлу пашкадаваў даць.
Вось выгналі на іх загоншчыкі
дзіка. Гедымін стрэльнуў –
прамазаў, Ягайла
стрэльнуў – патрапіў,
але што дзіку тая страла
ў азадку? Бяжыць ён проста
на паляўнічых і не зварочвае.
Вось тады і прыгадаў
Гедымін сваю скватнасьць
нядаўнюю, а Ягайла
пашкадаваў, што ня ўзьлез
загадзя на дрэва. Аднак позна
было ўжо думаць.
Трэба было ўцякаць.

25 студзеня

З задавальненьнем паглядзеў футбол. Землякі ў Маскве на кубку Садружнасьці. Найлепшы адпачынак – зімовы футбол. Як і, само сабою, летні.

Некалі быў я зацятым заўзятарам менскага “Дынама”. Ніводнага матча не прапускаў. Але з гадамі трошкі астыў. А сёньня цалкам адключыўся ля тэлеэкрана, забыўся на ўсе свае клопаты і турботы... Абмыў душу забытымі пачуцьцямі.

Калі б жыў я ў горадзе, я мог бы стаць класным футбалістам. Дома, у вёсцы, мы, бывала, усё лета, кожны дзень гадзіны па 3-4 бесьперапынна гулялі. І не скажу каб проста, бяздумна мячык ганялі. Тэлевізары тады ўжо ледзь ня ў кожнай хаце былі. Вядомых футбалістаў мы ў твар ведалі і стараліся сёе-тое ў іх пераняць. А клічкі якія былі? Не вясковыя, звычайныя, а футбольныя. “Пеле”, “Тарынча”, “Берадор Абдураімаў”... а потым і “Пракоп”...

Мне б сёньня тое жаданьне гуляць, тую любоў да футболу – ды да паперы, да пісаньня... Во “шэдэўраў” навыдаваў бы!.. Хіба што, мажліва, той наш футбол тым і вабіў да сябе, што ніколі не ператвараўся і не ператварыўся ён у працу, у прымус, у штодзённыя трэніроўкі, на якія трэба хадзіць, як на ўрокі ў школу. Мажліва, аднак, не зусім так. Бо футбол усё ж такі ёсьць футбол, і няма яго з чым параўнаць, акрамя футболу, і лепшым за яго можа быць толькі футбол.

Кола Дзён.

Здарэнне тыдня

– па абвінавачванні ў хабарніцтве і незаконным захоўванні зброі (двух пісталетаў і малакалібернага карабіна) арыштаваны супрацоўнік мінскай абласной пракуратуры, старшы саветнік юстыцыі. Газеты рэспублікі залічылі гэтае паведамленне ў шэраг сенсацыйных. Праўда, без тлумачэнняў, што яны лічаць сенсацыяй: тое, што злачынца – пракурор, ці тое, што ён, пракурор, арыштаваны...

Версіі

Вуж і гадзюка.

Бяскрыўднае і бязьлітаснае.

Справа і зьлева. Зьлева і справа.

Суправаджаюць нас па жыцьці.

І ніколі ня ведаем мы, за якім паваротам чакае нас бязьлітасная гадзюка, а за якім спалохаемся бяскрыўднага вужа.

***

Лясная дарога. Вялізная лужына на ўсю яе шырыню: ад дрэваў да дрэваў. Восень, імжа: дробненькія кропелькі дажджу проста вісяць у паветры. Краем дарогі, па мокрым лісьці ідзе хлапчук. Гадоў дванаццаці. На нагах кірзавыя чобаты, і ён сьмела ступае на жоўта-карычневае лісьце, з-пад якога адразу выцiскаецца брудная вада. “Чвяк, чвяк, чвяк”, – гэтак ягоныя крокі агучвае мокрая лістота. Я ня ведаю, што робіць тут гэты хлапчук, куды і адкуль ён ідзе. Я толькі назіраю за ім. Калі я ўбачыў яго, ён ужо ішоў. І зараз ён ідзе. Мокрыя валасы зьліпліся на лбе. Твар абмылі кропелькі дажджу...

Божа, няўжо гэта я?

Піліпікі

Стрэльба ў Піліпа заўсёды вісела на сьцяне. Незараджаная. А каб яна раз у год ня выстраліла, Піліп заломваў яе напалам. А на выпадак, калі ўсё ж такое здарыцца, руля была скіраваная ў столь.

Аднойчы ўвечары прыйшоў Піліп дамоў з працы, а ў бетоннай столі шчарбіна, быццам хто ў яе добры зарад шроту ўсадзіў. Вось тады і паверыў Піліп, што мы не адны ў Сусьвеце, а мажліва, і на Зямлі.

***

Жонка выправіла Піліпа па хлеб у краму. Выйшаўшы са сваёй кватэры, ён вырашыў палічыць, колькі крокаў будзе ад парога кватэры і да парога крамы. “Раз, – сказаў Піліп, увайшоўшы ў ліфт, – два, тры”, – выходзячы з яго.

Да дзьвярэй у краму набралася роўна 523 крокі.

Вярнуўшыся дамоў Піліп весела спытаў у жонкі: “Як ты думаеш, колькі крокаў будзе ад нашай кватэры да крамы?”.

“Пяцьсот дваццаць тры”, – адказала жонка як бы між іншым.

Добры настрой у Піліпа адразу прапаў, і ён моўчкі пайшоў да тэлевізара.

Пілінікі

Стрэльба ў Піліпа заўсёды вісела на сьцяне. Незараджаная. А каб яна раз у год не выстраліла, (на выпадак) Піліп заломваў ёй капалам. А калі ўсё ж такое здарыцца, рула была скіравана ў столь.

Аднойчы ўвечары прыйшоў Піліп дамоў з працы, а ў бетоннай столі шчарбіна, быццам хто ў ёй рогам зараз шпорту ўсаджваў. Вось тады і паверыў Піліп, што ён не адзін у Сусьвеце, а, магчыма, і на Зямлі.

25.01.93

Апофрыкі

“Зьверым гадзіньнікі”, – сказаў ваяр і будаўнік Даўмонт і паглядзеў на сонца. “Што зьвяраць, я й так ведаю: заўтра будзе позна…” – сказаў свае крылатыя словы Міндоўг, бедалага, і дадаў яшчэ крылацей: – “Альбо зараз, альбо ніколі”. “– Добра”, – згадзіўся Даўмонт, – “Хай будзе зараз ноч!” – і загадаў воям заплюшчыць вочы.

У поўнай цемры падышлі войскі Даўмонта і Міндоўга да крыжакоў і засьпелі іх зьнянацку якраз за палуднем. Галодныя крыжакі доўга ўцякалі, губляючы па полі латы, тарчы і мячы.

А ваенная хітрасьць ваяра і будаўніка Даўмонта ўвайшла ўва ўсе еўрапейскія вайсковыя падручнікі.

26 студзеня

У “Чырвонцы” надрукаваны мроі Галіны Багданавай “У калядную ноч”. Прыемна, што Галя мяне зразумела. Я ад пачатку вызначаў “мроі” не як назву сваіх карацелек, а як жанр. Пра гэта і пісаў ва ўрэзцы да публікацыі ў “ЛіМе”. Аднак рэдактар урэзку зьняў.

Мроі – гэта як версэты, пункціры, вершаказы А. Разанава. Праўда, у Галі яны не зусім мроі, бо амаль начыста адсутнічае элемент фантазіі, якім я даражу. У яе філасафічнасьць ёсьць, што і трэба, аднак яе забівае рэальнасьць, прыніжае, зазямляе, і мроі ператвараюцца ў дзёньнікавыя запісы. Я гэты элемент таксама ўводзіў, але каб занадта не адарвацца ад чытача, і гэтыя, “заземленыя і рэальныя”, бяз шызу і выдумкі, без абсурду ў аснове “штучкі” ці ня горшыя з тых, што я пісаў.

Дарэчы, учора быў час і я пераглядзеў напісанае сёлета – і сумеўся: ад былых мрояў засталіся рожкі ды ножкі. Я дэградую. З больш чым 25 запісаў-мрояў можна выбраць для друку хіба што дзьве ці тры больш-менш прыстойныя “версіі”.

Кола Дзён. Юбілей тыдня

– тры гады назад, 26 студзеня 1990 года, быў прыняты Закон аб мовах, у якім беларуская мова абвешчана дзяржаўнай мовай нашай рэспублікі. Юбілей прайшоў ціха і непрыкметна.

Версія

Антон Тамсаарэ Чэхава не чытаў, Сяргей Дубавец і ў рукі ня браў кніжак Камю, а Хорхе Луіс Борхес ніколі ня быў у бібліятэцы. Акутагава Руноскэ ненавідзеў расейскую класічную літаратуру, Анатоль Казлоў ніколі ня чуў пра Булгакава, а Хорхе Луіс Борхес ні разу ня быў у бібліятэцы.

Паверце класікам – яны маняць.

Апофрыкі

Кейстут пазычыў у Гедыміна тры грошы да панядзелка і не прынёс. Гедымін, добрая душа, і слова яму не сказаў, а пазычыў тры грошы ў Міндоўга. Той, бедалага, пэўна й да сёння чакае покуль Кейстут доўг аддасьць.

26. 01. 93.

Піліпікі

У намёце Піліп начаваў аднойчы ў войску. Рамантыка! Намёт – рамантыка, а не войска. Пра войска лепш наогул не прыгадваць. А намёт той быў на дваіх. Яны з гвардыі сяржантам начавалі ў ім. Пра сяржанта гвардыі таксама лепш не ўспамінаць. Зрэшты, і пра ноч тую бяссонную... Ды і намёт быў з дзіркамі, праз якія зоркі былі відаць, покуль дождж не пайшоў... Хэ-э... А як добра думаць пачыналася. Пра намёт. Пра рамантыку. Пра войска... Цьфу!

26. 01. 93.

Піліпікі

У намёце Піліп начаваў аднойчы ў войску. Рамантыка! Намёт – рамантыка, а ня войска. Пра войска лепш наогул не прыгадваць.
А намёт той быў на дваіх.
Яны з гвардыі сяржантам начавалі ў ім. Пра сяржанта гвардыі таксама лепш не ўспамінаць. Зрэшты, і пра ноч тую бяссонную... Ды і намёт быў зь дзіркамі, празь якія зоркі былі відаць, покуль дождж не пайшоў...
Хэ-э... А як добра думаць пачыналася.
Пра намёт. Пра рамантыку.
Пра войска... Цьфу!

Апофрыкі

Кейстут, сама сьціпласьць, пазычыў у Гедыміна тры грошы да панядзелка і не прынёс. Гедымін, добрая душа, і слова яму не сказаў, а пазычыў тры грошы ў Міндоўга. Той, бедалага, пэўна й да сёньня чакае, покуль Кейстут доўг аддасьць.

27 студзеня

На працу хоць ты не ідзі. Нервы, нервы, нервы... Сур’ёзна падумваю пра звальненьне. Не хацелася б гэтага рабіць, бо мне шкада “ЛіМ”. З-за мяккасьці і празьмернай далікатнасьці, а прасьцей – бабскасьці гал. рэд. і разгільдзяйства і нахабнасьці А. ён канае. А я стаміўся зь імі, – гэтымі якасьцямі іхнімі, – змагацца. Замест таго, каб працаваць разам, А. муціць ваду. Абрыдла... Устыла губляць свой вольны час і мазгі з-за таго, што нехта гульма гуляе і ня хоча, лянуецца рабіць тое, што абавязаны, за што атрымлівае грошы. Устыла...

Сёньня ў “Полымі”, у першым нумары, пачытаў рэцэнзію Андрэя Федарэнкі на маю першую кніжку. Ледзь ня класіка ён зь мяне зрабіў, праўда, са шматлікімі агаворкамі і перастрахоўкамі. Цытуе, праўда, ён ня самыя лепшыя мясьціны і лепшымі называе далёка ня лепшыя, на мой погляд, апавяданьні, аднак жа, у цэлым, рэцэнзія мне спадабалася. Нават калі зірнуць на яе збоку (ня як аўтару, пра якога яна напісана), то зроблена яна на добрым узроўні. Андрэй наогул малайчына. А проза яго апошняя проста цудоўная.

Версія


Птушка прабіла шыбу дзюбай, як куляй. Роўненькая такая, кругленькая дзірачка атрымалася. Празь яе зімою, калі мароз замалюе шкло, можна будзе назіраць безь перашкоды. Зручная рэч – дзірачка ў шкле. Празь яе можна цыдулку ад сябра ўцягнуць – кансьпіратыўна ад бацькоў. Празь яе пляваць можна на мінакоў. А можна і вадою абліць з помпачкі. Прахожыя азірацца будуць, шукаць на небе хмаркі, а ты тут, за шыбай, стоены і сьме-

Кола Дзён.
Публікацыя тыдня

– «Народная газета» 27 студзеня пад загалоўкам «...Разработать систему общения с В. Быковым» надрукавала выняткі з дакументаў, што прымаліся ў ЦК КПБ у 1987-1991 гадах і паказваюць, якую ролю ў грамадскім жыцці рэспублікі іграла кампартыя. Дакументы з партархіва, якія захоўваліся пад грыфамі «Сакрэтна» і «Зусім сакрэтна», даюцца на мове арыгіналаў і без каментарыяў. Яны, як кажуць, лішнія.

хам сагнуты. У кожным шкле, тым болей у кожнай шыбіне павіна быць такая дзірачка, каб кожны мог празь яе на сьвет паглядзець і сябе за ёю ўбачыць. Апляванага. Аблітага з помпачкі. І найлепш – атрамантам.

Зручная рэч – дзірачка ў шыбе...



(Апофрыкі)

Стары а мудры Ягайла кожны свой крок разьліч-ваў наперад на некалькі крокаў. І памыляўся, альбо трапляў у непрадбачаныя абставіны радзей за іншых. Але трапляў і, трапіўшы, сам сабе не выгаворваў: „Эх, казаў я табе, папя-рэджваў, а ты не паслухаў...“ І кожны раз ён меў/ра-што, бо кожны раз у яго было некалькі варыянтаў, адзін з якіх і быў правільны, які, дарэчы, абіраў ён далёка не заўсёды.

27.01.83

Апофрыкі

Стары а мудры Ягайла кожны свой крок разьлічваў наперад на некалькі крокаў. І памыляўся альбо трапляў у непрадбачаныя абставіны радзей за іншых. Але трапляў і, трапіўшы, сам сабе выгаворваў: “Эх, казаў я табе, папярэджваў, а ты не паслухаў…”

Піліпікі

Піліп атаварыў талон: дзьве пляшкі гарэлкі купіў. Адну тут жа выпіў зь незнаёмым сябрам. А другую панёс у кішэні жонцы. Па дарозе яго нагнаў незнаёмы сябар зь яшчэ адным незнаёмым сябрам, але ўжо не Піліпавым, а сваім. Словам, дамоў Піліп прыйшоў з пустою кішэняю. І зь “ліхтаром” пад вокам. Аднак жонка заўважыла толькі апошняе.

28 студзеня

“Страшно далеки они от народа...”, – сказаў некалі Ленін пра мае “Мроі”. Пераглядзеў напісанае апошнім часам і падумаў: наколькі бедны мой навакольны сьвет, настолькі бедныя і банальныя мае “версіі”. Пустата. Перажоўваньне адных і тых жа думак. Таптаньне на месцы. З наступнага месяца трэба пачынаць працу над даўно задуманым цыклам апаведаў “Непатрэбныя рэчы”, а “Мроі” пакуль не пісаць. Трэба адпачыць ад іх і напісаць што-небудзь сур’ёзнае.

Зайшоў сёньня Сяргей Вераціла. Прынёс свае вершы. Кожны раз, калі сустракаюся зь ім, зьдзіўляюся: які начытаны, эрудыраваны чалавек, як дарэчы прыгадвае нешта з прачытанага, як прыгожа гаворыць. А вазьмуся чытаць ягоныя творы – паўсюль выпадковыя словы, думкі ёсьць цікавыя, але выкладзены яны настолькі груба, часам нават каструбавата, што ня верыцца, што пісаў гэта той самы Вераціла. Гэта яшчэ адно пацьвярджэньне таго, з чым сустракаўся ўжо ня раз: той, хто прыгожа гаворыць, звычайна ня можа добра пісаць, і наадварот... Яскравы прыклад – Васіль Шукшын.

Кола Дзён. Уступ

«Уберите Ленина с денег» – яшчэ гадоў трыццаць назад напісаў Андрэй Вазнясенскі. Нарэшце, ягоны заклік быў пачуты. Сёлета Цэнтральны банк Расіі пачне выпуск мадыфікаваных 100-, 200-, 300-, 1000- і 5000-рублёвак узору 1993 года. Дзейнічаць яны будуць нараўне са старымі «ленінскімі» купюрамі. У незалежнай Беларусі, якая мае сваіх «зайчыкаў». можна было б паіранізаваць над расейскімі грашовымі праблемамі, калі б не прызнанае найважнейшым рашэнне кіраўнікоў дзяржаў СНД на сустрэчы ў Мінску аб стварэнні Міждзяржаўнага банка і, адпаведна, захаванні рублёвай зоны. Думаецца, паведамленне пра выпуск цалкам расейскай нацыянальнай валюты невыпадкова было аб’яўлена літаральна назаўтра пасля мінскай сустрэчы ў вярхах. Вось ужо хто вядзе незалежную ад СНД палітыку, дык гэта Расія. А Беларусь і іншыя «суверэнныя» дзяржавы па-ранейшаму скачуць пад дудку «старэйшай сястры».

Кола Дзён. Навіна тыдня

– афіцыйная дэлегацыя Рэспублікі Беларусь на чале са Станіславам Шушкевічам 28 студзеня накіравалася ў Швейцарыю на Сусветны эканамічны форум. Падчас знаходжання ў Швейцарыі запланаваны сустрэчы С. Шушкевіча з кіраўнікамі гэтай нейтральнай, як і Беларусь, дзяржавы.

Піліпікі

Піліп сустрэўся неяк зь вядомым пісьменьнікам, якога ведаў па тэлевізары і па фотаздымках у кнізе. Ня тое каб сустрэўся, а проста стаялі яны побач у адной чарзе. Дачакаўшыся, калі пісьменьнік зірне на яго, Піліп сказаў: “А я чытаў вашыя кнігі”. Пісьменьнік ажывіўся, пацiснуў Піліпу руку і сказаў: “Вельмі прыемна, вельмі прыемна”. Піліп запісаў потым у сваім дзёньніку: “Цікава, а што запісаў у сваім дзёньніку пра сустрэчу са мною пісьменьнік?”

***

Коцік быў маленькі і ласкавы – пакуль не падрос. І тады Піліп неўзьлюбіў яго. А коцік – жывёла, вядома, тое адчуў. І пачаў усяляк зьдзекавацца зь Піліпа. Прыдрэмле, бывала, Піліп каля тэлевізара на канапе, а коцік – цвыг празь ягоную галаву ды за вялікі палец на назе цап! Мыш яму, бачыш, прымроілася. У Піліпа спрасонку ледзь не інфаркт міякарда, а кацяру хоць бы што – гуляецца, сабака...

А то яшчэ палюбіў ноччу прыходзіць ды на шыю класьціся. Абкруціцца вакол ды грэе сваім цяплом, а Піліп прахопіцца сярэдначы ў жаху, быццам нехта душыць яго, адкіне кацяру і потым з гадзіну заснуць ня можа.

Словам, жыцьця ня стала.

Толькі падумаў, як бы пазбавіцца заразы, – дачка ў сьлёзы: не аддам... А жонка ў крык: мы павінны цярпець тых, каго прыручылі, і адказваць за іх, – кніжак начыталася, кінаў наглядзелася, бач ты...

Я то пацярплю, падумаў Піліп, а вось вы што... Назаўтра ён пайшоў на птушыны рынак і набыў сабе... ага, сабаку.

Версія

Тут быў хлеб. А цяперака – грошы.

І ніхто не зьдзіўляецца гэтаму.

Сьнег пад нагамі карычневы, нібы халва; хлюпае і не разьлятаецца, а проста рассоўваецца ўбакі, як марожанае пад лыжачкай.

Людзі пазіраюць на яго галоднымі вачыма. Грошы, скамечаныя і ў пачках, перацiснутых напалам чорнай гумкай, ляжаць у цэлафанавым пакеціку, у які некалі клалі хлеб, каб не чарсьцьвеў.


Смага. Мучыць, як у пустэльні. Адыходзіць убок хлапчук і бярэ жменю белага, нестаптанага сьнегу,

сціскае і есьць. Холад, бачна, апякае яго рот, зводзіць скулы; ён крывіцца, але есьць, заядае смагу.

Хлеба няма. І грошы, бяскрыўдныя паперкі, сьмяюцца са свайго гаспадара, зьдзекуюцца зь яго сваёй непатрэбнасьцю.

Людзі ідуць па сьнежным месіве на тратуары. Затоптваюць чужыя сьляды і пакідаюць свае, каб іх затапталі.

А грошы? Што грошы... Яны растаюць, як і сьнег. Яны брудныя, як і сьнег. Яны не спаталяюць смагу, як і сьнег. Яны не... Яны заўсёды толькі “не” і ніколі “так”. Як і сьнег... І ніхто не зьдзіўляецца гэтаму.



Апофрыкі

Праз сто гадоў пасьля
сваёй сьмерці Гедымін, добрая
душа, вырашыў вярнуцца
на грэшную зямлю,
каб паглядзець, што зь ёю
сталася. І, трэба ж такому
здарыцца, патрапіў
ня ў Вільню, а ў Маскву…
Доўга хадзіў ён па вуліцах,
упэўнены, што ў Вільні,
і ня верыў сваім вачам…
Кінуўся ў Навагрaдак – і зноў
не пашанцавала: патрапіў
у Ноўгарад… Доўга потым
пляваўся Гедымін на небе,
праклінаючы маскалёў
за зьдзек з Радзімы.
Пасьля тое вандроўкі
перастаў ён вітацца з Іванам
Грозным і Пятром Першым.
І як у ваду глядзеў.

29 студзеня

Зноў узяўся перачытваць Брыля, ягоныя “Усё, што ўражвае”, “Сцежкі, дарогі прастор”, “Свае запісы”... Словам, пяты том Збору твораў (набыў, дарэчы, некалі ў Ветцы ўвесь, як уцэнены, 50 капеек за кнігу). Дзіўны пісьменьнік. Цалкам еўрапейскі, і таму на першы погляд падаецца не беларускім. Упадабаў я гэтае чытаньне яшчэ ў студэнскія гады, аднак даўно не перачытваў. І зараз падумалася: наколькі ўсё ж блізкія мае “Мроі” да Брылёвых запісаў. Ён рабіў і робіць (“Полымя”, №12) тое ж, што раблю і я. Аднак ён, зыходзячы з жыцьця, а я абапіраючыся на жыцьцё. Напісаў: “зыходзячы” і “абапіраючыся” і падумаў – настолькі гэта тонка, што адразу і не зразумееш розьніцу...

А можа, яе і няма, гэтай розніцы?

Не, ёсьць: ён глядзіць на жыцьцё стоячы на зямлі, між людзей, я ж лятаючы над жыцьцём, пазіраючы на іх зьверху, і таму ў мяне больш магчымасьцяў, я магу і фантазаваць, і выдумляць. Ён прывязаны да жыцьця, я ж – адарваны... Аднак, у прынцыпе, трэба мне прызнацца самому сабе, што я, хай і падсьвядома, бо дайшло мне гэта толькі зараз, сёньня, працягваю ягоную, Брылёву справу.

Працую ў ягонай традыцыі, хоць і новымі сродкамі.

Версія

Крокус.
Што такое крокус?

Кола Дзён.

Прызначэнні тыдня

– Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларусі прыняў указы аб прызначэнні Надзвычайнымі Паўнамоцнымі пасламі Рэспублікі Беларусь: у Расіі – Віктара Даніленкі, у Францыі – Ніны Мазай, у Швейцарыі – Анатоля Мардовіча.

Усплыло ў памяці гэтае слова выпадкова. Само сабою. Узяў я асадку, ліст паперы і напісаў: “Крокус” (гл. вышэй).

Крокус, наколькі памятаю, – нейкая кветка. Не эдэльвейс, аднак прыгожая і, пэўна, рэдкая. Чамусьці думаецца, што крокусы павіны цьвісці ў гарах, на горных лугах, і бачацца мне яны жоўтымі, хоць і ня верыцца ў гэта. Растуць як экзатычныя ў нас нарцысы, макі альбо цюльпаны, засьцілаючы сабою зямлю аж да далягляду, дзе неба зьліваецца зь зямлёю. А можа, й не. Можа, гэта рэдкія кветкі, кветкі-адзіночкі... Яшчэ ўсплывае з памяці (хочацца верыць, што ўсплывае, што я і сапраўды нешта ведаю пра гэтыя кветкі), што крокусы вельмі далікатныя і, сарваныя, доўга не жывуць, вянуць проста на вачах. Бачыцца зараз мне голая скала, на якой, на тле неба, стаяць гожыя, гордыя кветкі...

Са словам “крокус” узьнікае яшчэ адна асацыяцыя. Ёсьць знакамітыя фотапавелічальнікі, якія называюцца “Крокус”. Гэта ўжо дакладна. Раней былі яны надта дарагімі – 100 рублёў. Цяпер іх зусім не відаць. У нас у журфакаўскай фоталабараторыі

Піліпікі

На хрэсьбінах Піліп напіўся. Як сьвіньня. Прыйшоў дахаты ўвесь у бруд выкачаны, быццам ім нехта ў футбол гуляў. Раніцаю памыўся, памацаў сіняк пад вокам, замазаў ёдам рану на шчацэ і цяжка ўздыхнуў. О, як не хацелася ямуісьці пахмяляцца. Але што паробіш – трэба: не зразумеюць, пакрыўдзяцца. І скупая мужчынская сьляза скацілася з падбітага вока.

***

У вёсцы Піліп купіў сабе хату “на дачу”. Увечары да яго прыйшоў сусед – пазнаёміцца, значыць. Піліп паставіў на стол пляшку, жонка сабрала цыбулькі, гурочкаў на закусь. Сусед павесялеў, змахнуў з твару нядаўні клопат з учарашняга перапою. І сказаў нарэшце: “Здраствуйце ў хату!”

– Піліп, – сказаў Піліп на знаёмства: як жа піць бязь імяні.

– Што? – перапытаў сусед, падумаў і здагадаўся: – А-а-а, а я Іван, – і ўмела падаў брудную зь леташняга руку.

Выпілі. Закусілі. Памаўчалі. Выпілі. Закусілі. Узялі па трэцяй – як паложана.

– Ну, я пайду, – сказаў сусед.

Піліп зразумеў, што з гэтага моманту стаў ён у вёсцы сваім.

быў адзін “Крокус”, аднак да яго наш выкладчык, нікога не падпускаў. І памятаю, былі “Крокусы” запаветнаю мараю тых аднакурсьнікаў, якія хацелі стаць фотарэпарцёрамі. На іх, аказваецца, можна было рабіць здымкі метровага памеру.

Можна яшчэ паразважаць, што я ведаю, якія асацыяцыі ўзьнікаюць, калі я думаю гэтае слова: “крок”, “крокі”, “рок”, “рокаш” і нават – “кроквы”... Але вазьму зараз энцыклапедыю і зірну, што там напісана. Ага: “крокус, то же, что шафран”. Вось чаго ня ведаў, таго ня ведаў. Гляджу шафран: “Шафран (крокус), род многолетних трав сем. касатиковых. Ок. 80 видов в Европе, Передней и Средней Азии; в СССР ок. 20 видов. Мн. виды выращивают как декоративные: рыльца цветков Ш. посевного употребляют как пряность и для окраски пищ. продуктов. 3 вида в Красной книге СССР”. У Ожагава ў дадатак даведваюся: “2. Сорт сладких яблок”... (як я мог пра гэта забыцца?)... “прил. шафранний, -ая, -ое и шафрановый, -ая, -ое (к 1 знач.) Ш. цвет (жёлто-оранжевый с коричневым оттенком).”

Ну тут можна разгуляцца фантазіі: і “касатиковые”, і “как пряность”, і “для окраски пищ. продуктов”, і “жёлто-оранжевый”, і “сорт яблок”...

Аднак ужо ня хочацца. Да таго ж пра самае галоўнае я не даведаўся: дзе ўсё ж растуць крокусы – у гарах, у стэпе, а можа, у лясах?

Апофрыкі

Хто-хто, а Міндоўг,
бедалага, добра ведаў,
што такое дабро, а што
такое зло. Каму-каму,
а яму моцна не пашанцавала
ў зямным жыцьці.
Сёй-той прагуляў яго,
прасьпяваў, а Міндоўг,
бедалага, адпакутаваў.
Пакінуў нашчадкам пасьля
сябе дзяржаву, аднак
і сёньня яшчэ яго сумліў
гняце: “А ці варта было?”

30 студзеня

“Падумаў: “А ўсё-такі старэю...” і пастарэў яшчэ на некалькі хвілінаў. Ну, дык ці варта думаць пра гэта?”

Гэта з Брыля. І такіх перлінаў у яго шмат. Вельмі блізкіх да таго, што я хацеў бы ствараць. Аднак зашмат у Брыля і пустых запісаў. І я падумаў, што варта было б прайсьціся з алоўкам па ягонай кнізе і адабраць самыя-самыя цудоўныя рэчы. Вядома, алмаз і ў лайне блішчыць. Аднак жменя адборных алмазаў больш уражвае. І ня будуць яны разам здавацца аднолькавымі, а кожны наступны будзе здавацца лепшым, чым папярэдні, і грані ягоныя будуць іграць яшчэ ярчэй і ўражлівей.

Таму і мне ня варта гнацца за колькасьцю “версій”, калі буду друкаваць іх. Тут зноў прыгадваецца “бесьсьмяротны” Ленін, якім, аказваецца, добра-такі набітая мая галава, калі я гэтак часта прыгадваю цытаты зь яго. Цяперашняя: “Лепш менш, ды лепш” (праўда, сотні, тысячы людзей да Леніна казалі гэтыя словы, і невядома, хто іх аўтар, аднак у мяне яны – ленінскія, як ні прыкра). Дык вось: лепш менш, ды лепш, лепш адборныя алмазы сярод алмазаў, чым алмазы сярод лайна.

Версіі

Сонца ня люстра, нават не электрычная лямпачка, аднак сьвеціць. Месяц не люстэрка і нават ня нейкая адшліфаваная паверхня, аднак адбівае сонечнае сьвятло. Яны ня думаюць, дзеля чаго яны гэта робяць. Яны ство-

Кола Дзён. Кур’ёз тыдня

– усяго некалькі тыдняў праіснавала ў Мінску новая сістэма імянных прадуктовых картак. З лютага ў дадатак да картак мінчанам будуць выдадзены звыклыя «прасціны» талонаў. Папярэджвалі ж нас: не рвіце, не выкідайце купоны. Глядзіш, і яны спатрэбяцца. У дадатак да «зайчыкаў».

раныя для таго, каб сьвяціць альбо адбіваць сьвятло. А я, проста маленькі чалавек, думаю: дзеля чаго я жыву? І, гледзячы на сонца, адказваю сам сабе: каб сьвяціць. Каб сьвяціць?

***

Кропля вады ўпала на попел. Попел пачарнеў. А калі высах, на ягонай паверхні засталася ямінка.

Яблык упаў на зямлю. Пругка адскочыў і пакаціўся па ёй. Выбраў лагчынку па сабе і заціх.

Чалавек зачапіўся за камень, упаў на зямлю. Падняўся, абцёр пыл са штаноў і пайшоў далей.

***

Шкарпэткі былі жаночыя. Хоць гэта не панчохі і тым больш ня трусікі і цяжка было пэўна вызначыць іх пол, іх прыналежнасьць. Бо сёньня і мужчыны, і жанчыны носяць белыя, чырвоныя – розныя шкарпэткі, аднак у міліцыі сказалі, што яны жаночыя. Нам заставалася верыць. І спадзявацца, што набудзем калі-небудзь і сапраўдныя мужчынскія шкарпэткі. Адметныя, як трусы.

***

– Між зорак блішчыць, міргае, вабіць да сябе мой позірк адна. Ня самая яркая, ня самая прыкметная на небе. Чаму ж мой позірк скіраваны на яе? Чаму вочы мае выбралі менавіта яе?

Піліпікі

“Мой сябар – твой сябар”, – казаў Піліп сябру, спадзеючыся, што сябравы сябры стануць і ягонымі сябрамі. Але спадзяваньні былі марнымі. Затое сябравы ворагі сталі і ягонымі ворагамі.

– Ты думаеш, выбіралі вочы? Ты думаеш, яшчэ нечы позірк, акрамя твайго, спыняецца на ёй?

– Цяпер дзень, і я не магу табе яе паказаць, мы ня можам праверыць, ці бачыць яе яшчэ нехта, акрамя мяне. Аднак, я так зразумеў, ты хочаш сказаць, што гэта і ёсьць мая зорка, якая нарадзілася – загарэлася разам са мною і будзе зьзяць, мажліва, усё ярчэй і ярчэй, пакуль буду я жыць?

– У кожнага свая зорка. Гэта несумненна. Але большасьці людзей ня дадзена нават паглядзець на неба, каб знайсьці там сваю зорку. Ужо тое, што ты ведаеш сваю зорку, нешта азначае.

– Што?

– Хочаш пачуць кампліменты? Не, іх ня будзе. Ты сам павінен вырашыць гэтую задачку.

– Ведаеш, пасьля абароны кандыдацкай, мне падалося, што знайсьці яе на небе лягчэй. А пасьля аднаго майго адкрыцьця, задоўга да яго рэгістрацыі і прызнаньня, а менавіта ў той дзень, калі высьпела думка – яна стала яшчэ больш яркай.

– Шкада, сапраўды, што цяпер дзень.

– Паслухай, мне здаецца, што самыя буйныя сёньня зоркі, як, скажам, Сірыус, Вега, Альтаір альбо Альдэбаран, раней таксама былі нечымі маленькімі і непрыкметнымі, а потым іх нейкія геніі чалавецтва – Шэксьпір альбо Ньютан, Скарына альбо Багдановіч зрабілі бачнымі для ўсіх і самымі яркімі на небасхіле...

– Цікава... Але думаю ўсё ж, што гэта агульныя зоркі, а значыць нічые. Альбо зоркі тых людзей, якія жылі задоўга да нас і пра якіх мы нічога ня ведаем.

Апофрыкі

Некалі Ягайла, стары
а мудры, закахаўся
ў маладзенькую дзяўчыну –
простую сялянку. І да таго
яму захацелася мець яе
ў сябе ў прыслузе,
што загадаў ён воям сваім
паехаць у тое селішча
і забраць яе. Вoі думалі,
што вязуць нейкую
дзяржаўную злачыньніцу,
і па дарозе пакарысталіся ёю
па чарзе (усё роўна ж забіваць
давядзецца…). Ягайла,
як толькі пачуў,
што дзяўчына ў замку, адразу
ж загадаў прывесьці яе да яго
ў спачывальню…

Па наступную ўпадабаную
дзяўчыну стары а мудры
Ягайла паехаў сам.

Апокрыфікі

Некалі Ягайла, стары а мудры, закахаўся ў маладзенькую дзяўчыну — простую сялянку. І да таго яму захацелася мець яе ў сябе ў прыслузе, што загадаў ён воям сваім паехаць у тое сялішча і забраць яе. Вої думалі, што вязуць нейкую дзяржаўную значніцу, і па дарозе пакарысталіся ёю па чарзе (усё роўна не забіваць давядзецца...) Ягайла, як толькі пачуў, што дзяўчыну ў замку, адразу ж загадаў прывесці яе да яго ў апачывальню...

Па наступную ўпадабаную дзяўчыну стары а мудры Ягайла паехаў сам.

30.01.93

Пілінікі

„Мой сябар — твой сябар", — казаў Пілін сябру, спадзеючыся, што сябравы сябры стануць і ягонымі сябрамі. Але спадзяванкі былі марнымі. Затое сябравы ворагі сталі і ягонымі ворагамі.

30.01.93

– Вось як... А ці ёсьць у цябе свая зорка?

– Ніколі пра гэта ня думаў і ніколі не задзіраў на неба вочы і не ўпіраўся позіркам у нейкую пэўную зорку. Калі і глядзеў, дык вылучаў для сябе заўсёды толькі сузор'і: Касіяпеі, дзьвюх Мядзьведзіцаў, Ліры...

– Ніколі не глядзеў... Значыць, ня дадзена... Значыць, нам ніколі не паразумецца... А яшчэ прыкідваешся, што нешта ведаеш...

– Я ведаю, што я нічога ня ведаю. А калі ты ведаеш больш за мяне, дык чаму пытаеш?

– Прабач, замучыла зорка. Кліча, маніць да сябе. А я яшчэ так хачу жыць! Я так хачу жыць!..

31 студзеня

Усё-ткі пратрымаўся я цэлы месяц, і гэта ці найвялікшая мая перамога за апошнія часы...

Сёньня, цяпер, адчуваю сябе надта кепска. Галава баліць, ціск павышаны (толькі што памераў), сэрца цісьне так, што адымаецца левая рука – усё разам. Аднак вось сяджу і пішу. І буду пісаць яшчэ “версіі”, “апофрыкі” і “пііпікі”. Бо няма куды адкладваць, няма як чакаць лепшых часоў. Жыцьцё праходзіць... і колькі яго засталося ўжо? А я ўвесь час адчуваў дыскамфорт і ўсё адкладваў пісаньне да лепшых дзён. Асабліва ў Гомлі. Ды і тут, у Менску – покуль ніякой кватэры не было...

Цяжка і зараз. У аднапакаёўцы. Побач гудзе тэлевізар – жонка глядзіць. У мяне гудзе, адвальваецца галава. Аднак лепшых часоў ня будзе... Я не з “сынкоў”, якім тое, чаго я не дабіўся й да сёньня, даецца ледзь не ад нараджэньня. Я пра спакой, асобную кватэру, уласны кабінет... пра магчымасьць працаваць. Я іх практычна ня меў і ня маю, і трэба зьмірыцца з тым, што, мажліва, і мець ня буду ніколі.

Версіі

Білася аб сьцены, грукала дзьвярыма, сыпала ў вокны гарохам завіруха. Спаць не давала ні маладым, што толькі сёньня пабраліся і першую ноч былі разам, ні старым, што прыгадалі раптам сваю маладосьць і пільна ўслухоўваліся ў сьвіст і грукат завірухі за сьценамі.

Толькі пад ранак паснулі ўсе. Тады сьцішылася і завіруха.

Кола Дзён. Жарт тыдня

– у Рагачове на ўстаноўчай канферэнцыі створана (а можа, адноўлена) раённая арганізацыя Партыі камуністаў Беларусі. Цяпер у Гомельскай вобласці ва ўсіх раёнах дзейнічаюць райкамы партыі, якая лічыць сябе пераемніцай КПБ. Прачытаўшы гэтую інфармацыю, дыктар БТ Валянцін Аксянцюк сказаў: «А зараз сур’ёзнае паведамленне»...

***

Праклёны. Між зямлёю і небам. Лаянка.
Брудна, склізка, пагана, як у вясковай лазьні.
Маты. Між зямлёю і небам.
Ідзе пасяджэньне парламента.
Ня верыце? Уключыце тэлевізар.
Праклёны. Маты.
Між небам і зямлёю.
Так робіцца вялікая палітыка?
Не, гэта яны думаюць, што так яна робіцца.

***

За вакном цемра і дождж са сьнегам, ці сьнег з дажджом.

А па тэлевізары – футбол. Не сапраўдны, летні, аднак футбол. Хай сабе і ў зале, у якой, аб'яўляе дыктар, нельга паліць.

Мне паліць можна. Я дома. Але я не палю. Не хачу. Хоць мая любімая каманда і прайграе. Прайграе з буйным лікам.

Усё роўна ў мяне сёньня сьвята. Я гляджу футбол. І мне добра.


Няхай за вакном вецер, і сьнег, і дождж, і цемра, – я ведаю гэта, і мне тым больш добра, і не псуе настрой нават пройгрыш любімай каманды.

***

Бедненькі сьвет мой згарнуўся ў рог, і мне відаць стала яшчэ меней. Вочы на сьпіне, а іду я некуды ў бок і натыкаюся на свае рукі, што мацаюць сьцяну майго жывата. Пуп падміргнуў мне: маўляў, ідзі за мною, і, я безгаловы, паверыў яму, пайшоў сьледам і заблудзіўся зусім у сваіх валасах недзе за ву-

шамі. Доўга крычаў я і аукаў, але ніхто не адгукаўся, толькі аднойчы даляцеў да мяне нейкі гук, падобны да выстралу. Я пайшоў на яго і выйшаў да дзьвюх гладкіх горак, на якія так і ня змог узьлезьці, каб агледзецца.

Нават у самім сабе я такі дробненькі і разгублены.



Піліпікі

Прыйшоў да Піліпа нейкі чалавек і, спытаўшы ягонае прозьвішча, паведаміў яму, што ён патомны шляхціч. Піліп зьдзівіўся, аднак паверыў яму. Асабліва, калі той сказаў, што ў Піліпавых продкаў было вялізнае радавое памесьце (так ён сказаў) пад Мазыром. Піліп не ведаў гэтага, аднак заўсёды падазраваў, што ён не просты чалавек, а патрэбны для чагосьці. Вось не было б яго і зьнік бы з твару зямлі магутнейшы шляхецкі род...

31.01.93.

Піліпікі

У пясочніцы гулялі дзеці. Піліп ішоў паўз іх, і раптам пад ногі яму выкаціўся мячык. Піліп хацеў падбіць яго: нага так і хітнулася ўсьлед, але абдумаўся, спыніўся, падняў мячык і агледзеўся: каму аддаць... Выбраў самае саплівае – у сэньсе самае малое, –
і памкнуўся было, але тут заўважыў, што дзеці таксама кінулі свае пільныя справы і пазіраюць на яго. Хто спалохана, хто зь цікавасьцю,
а хто і з пагардай тонкаю між вуснаў.

“А ўжо ж чалавекі”, – падумаў Піліп
пра дзяцей і асьцярожна паклаў мячык на край пясочніцы, каб запомніцца ім усім добрым.

***

Прыйшоў да Піліпа нейкі чалавек і, спытаўшы ягонае прозьвішча, паведаміў яму, што ён патомны шляхціч. Піліп зьдзівіўся, аднак паверыў яму. Асабліва калі той сказаў, што ў Піліпавых продкаў было вялізнае радавое памесьце (так ён сказаў) пад Мазыром. Піліп ня ведаў гэтага, аднак заўсёды падазраваў, што ён ня просты чалавек,
а патрэбны для чагосьці. Вось не было б яго,
і зьнік бы з твару зямлі магутнейшы
шляхецкі род...

„31" [illegible] 1993 г.

Усё-ткі прадзюмаўся я гэты месяц і гэта ці найвялікшая мая перамога за апошнія часы... Сёньня, зараз, адчуваю сябе надта кепска. Галава баліць, ціск павышаны (толькі што вымераў), сэрца ціснe так, што аднімаецца левая рука — усё разам. Аднак вось сяджу і пішу. І буду пісаць яшчэ „версіі", „апофрыкі" і „[illegible]". Бо няма ўжо куды адкладваць, няма як чакаць лепшых часоў. Іншыя праходзяць... і колькі іх засталося ўжо?.. А я ўвесь час адкладваў [illegible] і ўсё адкладваў пісаньне да лепшых дзён. Асабліва ў Гомелі. Ды і тут, у Менску — покуль кватэры не было... Цяпер і зараз. У [illegible]. Побач гудзе тэлевізар — жонка глядзіць. У мяне гудзе, адвальваецца галава. Аднак лепшых часоў ня будзе... Я не з „спакой", які тое, чаго я не дабіўся й сёньня, дасюль ледзь не ад нараджэньня. Я пра спакой, асобную кватэру, ~~свой~~ уласны кабінет... пра магчымасьць працаваць. Я ж практычна не меў і не маю, і, трэба змірыцца з тым, што, магчыма, і мець не буду ніколі.

Апофрыкі

Пад канец дня Вітаўт зь дзецьмі дабраўся нарэшце да свайго замка. Пастукаў у дзьверы. Варта не адчыняла. Пастукаў яшчэ – цішыня. Быццам і няма за дзьвярыма нікога. Налёг на дзьверы – адчыніліся. Праехаў праз пляц – пуста, ніхто не сустракае… Перапіліся ўсе і ляжалі ўпокат. Пісалі потым у расейскіх летапісах: "Вітаўт зь дзецьмі ўварвашася ў свой замак і пазабіваша ўсіх секірамі"... Пісалі потым, калі ўжо аспрэчыць не было каму.

Версія

Бязмежны сьвет мой звузіўся ў [illegible] і мне [illegible] [illegible]. Вось на сьпіне(?), а [illegible] я [illegible] ў бок і натыкаюся на свае рукі, што нагадваюць [illegible]. [illegible] мне, [illegible], ідзі за мною, і я, безгалоўны, [illegible] яму, і [illegible] і заблудзіўся [illegible] у сваіх валасах недзе за вушамі. Доўга крычаў я і аукаў, але ніхто не адгукаўся, толькі аднойчы даляцеў да мяне нейкі гук, падобны да выстралу. Я пайшоў на яго і выйшаў да дзьвюх [illegible] гарак, на якія так і не змог ўзьлезьці, каб агледзецца.

Навек у [illegible] сабе я такі здрабнелы і разгублены.

31.03.93.

Змест

12+

Літаратурна-мастацкае выданне

Пятровіч Барыс

Ідзі адзін, альбо Студзень жыцця

Дзённік, Кола Дзён, Версіі, Пілiпікі, Апофрыкі

Адказны за выпуск *Генадзь Вінярскі*
Рэдактар *Алесь Пашкевіч*
Вёрстка *Людмілы Фомчанка*
Карэктура *Алены Спрытніч*
Вокладка *Сяргея Кандраценкі*

Падпісана да друку 25.02.2019. Фармат 60×84 $^1/_{16}$.
Папера афсетная. Друк лічбавы. Ум. друк. арк. 5,6. Ул.-выд. арк. 3,02. Наклад 300 ас. Зак. 59.

ПУП «Кнігазбор».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка друкаваных выданняў № 1/377 ад 27.06.2014.
Вул. Я. Лучыны, 38-93, 220112, Мінск. Тэл./факс (017) 207-62-33, тэл. (029) 772-19-14, 682-83-86.
E-mail: bkniha@tut.by

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка ў ЗАТ «Аргбуд».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка друкаваных выданняў № 2/182 ад 15.02.2016.
Вул. Берасцянская, 16, 220034, Мінск.